ПРАВАСЛАЎНЫ МАЛІТВАСЛОЎ

Да 1020-годдзя
Праваслаўнай Царквы ў Беларусі

ПРАВАСЛАЎНЫ МАЛІТВАСЛОЎ

Мінск
2012

УДК 271.22-534.3
ББК 86.372
П68

Па благаславенню
Высокапраасвяшчэннейшага
ФІЛАРЭТА,
Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага,
Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі

Дапушчана да выдання Выдавецкім Саветам
Беларускай Праваслаўнай Царквы
Рашэнне № 1143 ад 04.09.2012

Укладальнік протаіерэй Сергій Гардун.

Прадмова і пераклад з царкоўнаславянскай і грэчаскай моў
протаіерэя Сергія Гардуна.

ISBN 978-985-6594-45-1

© Беларуская Праваслаўная Царква, 2012
© Пераклад на бел. мову прот. Сергій Гардун, 2012

ΙΣ
ΧΣ
Ω
Η

ЖИРОВИЦКАЯ ИР ЦЫ

Пра малітву

“Трэба заўсёды маліцца і не падаць духам”, — вучыць нас Святое Евангелле (Лк. 18, 1). Малітва — гэта наша імкненне накіраваць свой розум і сэрца да Бога, гэта наша размова з Богам.

Бог не мае патрэбы ў нашых малітвах, але Ён любіць нас і таму слухае і прымае нашы малітвы. Мы молімся не для таго, каб паведаміць Богу нешта. Бог ведае ўсё наша жыццё, нашы ўчынкі, думкі і намеры, а таксама ўсе нашы жаданні і патрэбы. Мы молімся, каб быць з Богам, каб на Ім засяродзіць сваю волю, свае думкі і пачуцці і каб, з’яднаўшыся з Ім у малітве, выконваць Яго святую волю. Молячыся свядома і пераканана, мы выказваем малітвай нашу веру ў тое, што мы самі і ўсё, што з намі адбываецца, залежыць ад Бога.

Ёсць тры асноўныя віды малітвы: славаслоўе, падзяка і прашэнне.

Славаслоўе — самы дасканалы і бескарыслівы від малітвы. На небе святыя ангелы няспынна хвалебнаю песняю праслаўляюць Госпада. Успрымаючы Бога як Найвышэйшую і Найдасканалейшую Істоту, і мы ўзносім хвалу Яму з радасцю і замілаваннем.

Падзяку мы ўзносім Богу за Яго любоў і апеку, за спрыянне і дапамогу нам.

Прашэнне — самы распаўсюджаны від малітвы. Усведамляючы сваю слабасць і грахоўнасць, мы ў пер-

шую чаргу просім Госпада прабачыць нам нашы грахі і дапамагчы пераадолець нашы недахопы. Часам нашы прашэнні могуць быць выкліканы небяспекай, якая пагражае нам, хваробай або іншымі абставінамі. Звяртаючыся да Бога, хрысціянін павінен маліцца не толькі за сябе, але і за сваіх родных, сяброў, знаёмых, за свой народ і за увесь свет.

Нельга прасіць у Бога чагосьці непатрэбнага або шкоднага для сябе і іншых. "Просіце — і не атрымліваеце, бо просіце не на дабро", — піша святы апостал Іакаў (Іак. 4, 3). Але можна, і нават трэба прасіць у Госпада таго, што святое, бязгрэшнае і добрае.

"Госпадзі, навучы нас маліцца", — з такой просьбай аднойчы звярнуўся да Госпада Ісуса Хрыста адзін з Яго вучняў (Лк. 11, 13). У адказ на гэтую просьбу Гасподзь даў усім Сваім паслядоўнікам узор малітвы — "Ойча наш". Акрамя гэтай самай галоўнай малітвы, якую мы называем малітвай Гасподняй, Святая Праваслаўная Царква, наша духоўная Маці, дае нам і іншыя ўзоры малітвы, складзеныя боганатхнёнымі святымі айцамі і хрысціянскімі падзвіжнікамі. Калі мы хочам навучыцца маліцца правільна, то нам трэба штодзённа ўжываць устаноўленае Святою Царквою малітвенае правіла: малітвы ранішнія і малітвы вячэрнія.

"Малітвенае правіла, — піша вялікі настаўнік духоўнага жыцця святіцель Ігнацій, епіскап Каўказскі (†1867), — накіроўвае правільна і свята душу, навучае яе пакланяцца Богу ў духу і ісціне (Ін. 4, 23), між тым як душа сама па сабе не магла б ісці правільна шляхам малітвы. [...]

Малітвеныя правілы ўтрымліваюць таго, хто моліцца, у спасіцельным стане пакорлівасці і пакаяння, навучаючы

яго бесперастаннаму самаасуджэнню, жывячы яго замілаваннем, умацоўваючы надзеяй на Усядобрага і Усеміласэрнага Бога, узвесяляючы мірам Хрыстовым, любоўю да Бога і бліжніх. [...] Пры выкананні правіла і паклонаў ніяк нельга спяшацца, трэба выконваць і правілы, і паклоны з магчымай няспешнасцю і ўвагаю. Лепей менш прачытаць малітваў і менш пакласці паклонаў, але з увагаю, чым многа і без увагі".

"У малітвасловах нашых змешчаны малітвы святых айцоў — Яфрэма Сірыяніна, Макарыя Егіпецкага, Васілія Вялікага, Іаана Залатавуста і іншых вялікіх малітвенікаў, — падкрэслівае другі вядомы настаўнік духоўнага жыцця, свяціцель Феафан, епіскап Вышанскі (†1894). — Будучы напаўняемымі духам малітвеным, яны выказалі натхнёнае гэтым духам у слове і перадалі гэта нам. У малітвах іх дзейнічае вялікая сіла малітвеная, і хто ўсёю ўвагаю і стараннасцю пранікае ў іх, той, у выніку закону ўзаемадзеяння, абавязкова ўспрыме сілу малітвеную, па меры збліжэння настрою свайго са зместам малітвы".

Для многіх праваслаўных хрысціян адной з самых істотных перашкод у засяроджанай і ўважлівай малітве з'яўляецца няпоўная зразумеласць царкоўнаславянскага тэксту малітваў. Гэты Малітваслоў змяшчае поўныя тэксты ранішняга і вячэрняга правіла, каноны — Пакаянны да Госпада, Малебны да Прасвятой Багародзіцы, Ангелу ахоўніку і Пасхальны, а таксама Паследаванне да Святога Прычашчэння і іншыя малітвы. На сённяшні дзень гэта самы поўны праваслаўны Малітваслоў на беларускай мове.

МАЛІТВЫ РАНІШНІЯ

Устаўшы ад сну, перад усякай іншай справай стань благагавейна перад Усёвідушчым Богам і, робячы на сабе знак Крыжа, скажы:

У імя́ Айца́, і Сы́на, і Свято́га Ду́ха. Амі́нь.

Потым трохі пачакай, пакуль усе пачуцці твае супакояцца і думкі твае пакінуць усё зямное, і тады гавары наступныя малітвы без паспешнасці і з увагай сардэчнай:

Малітва мытара

(Евангелле паводле Лукі, раздзел 18, верш 13)

Бо́жа, будзь мі́ласцівы да мяне́, грэ́шнага. *(Паклон).*

Малітва пачынальная

Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, Сы́не Бо́жы, дзе́ля малі́твaў Прачы́стае Твае́ Ма́ці і ўсіх свяцы́х, памі́луй нас. Амі́нь.

Сла́ва Табе́, Бо́жа наш, сла́ва Табе́.

Малітва Святому Духу

Цару́ Нябе́сны, Уцяшы́целю, Ду́ху і́сціны, Ты ўсю́ды прысу́тны і ўсё напаўня́еш, Ска́рбніца да-

бра́ і жыцця́ Пада́целю, прыйдзі́ і ўсяліся ў нас, і ачы́сці нас ад уся́кае нечыстаты́ і спасі́, До́бры, ду́шы на́шы.

Трысвятое

Святы́ Бо́жа, Святы́ Мо́цны, Святы́ Несмяро́тны, памі́луй нас. *(Чытаем тройчы, робячы на сабе знак Крыжа і паясны паклон).*

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва да Прасвятой Троіцы

Прасвята́я Тро́іца, памі́луй нас; Го́спадзі, ачы́сці грахі́ на́шы; Уладару́, праба́ч беззако́нні на́шы; Святы́, наве́дай і ацалі́ не́мачы на́шы дзе́ля імя́ Твайго́.

Го́спадзі, памі́луй. *(Тройчы).*

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва Гасподняя

О́йча наш, Які́ ёсць на нябёсах! Няха́й свяці́цца імя́ Тваё, няхай пры́йдзе Ца́рства Тваё, няха́й бу́дзе во́ля Твая́ як на не́бе, так і на зямлі́. Хлеб наш надзённы дай нам сёння; і дару́й нам даўгі́ на́шы, як і мы дару́ем даўжніка́м на́шым; і не ўвядзі́ нас у спако́ду, але збаў нас ад зло́га.

Трапары Троічныя

Устáўшы ад сну, прыпадáем да Цябé, Дóбры, і áнгельскую пéсню спявáем Табé, Магýтны: Святы́, Святы́, Святы́ Ты, Бóжа, праз Багарóдзіцу памíлуй нас.

Слáва Айцý, і Сы́ну, і Святóму Дýху.

З пасцéлі і сну Ты падняўшы мянé, Гóспадзі, рóзум мóй прасвятлí і сэ́рца, і вýсны маé адкры́й, каб апявáць Цябé, Святáя Трóіца: Святы́, Святы́, Святы́ Ты, Бóжа, праз Багарóдзіцу памíлуй нас.

І цяпéр, і заўсёды, і на вéкі вякóў. Амíнь.

Неспадзявáна Суддзя́ пры́йдзе, і ўчы́нкі кóжнага вы́явяцца, алé са страхам усклíкнем апóўначы: Святы́, Святы́, Святы́ Ты, Бóжа, праз Багарóдзіцу памíлуй нас.

Гóспадзі, памíлуй. *(12 разоў).*

Малітва да Прасвятой Троіцы

Устáўшы ад сну, дзя́кую Табé, Святáя Трóіца, што па вялíкай Тваёй дабрыні і доўгацярпéнню не загнéваўся[1] Ты на мянé, лянívага і грэ́шнага, і не загубíў мянé з беззакóннямі маímі, а паказáў Сваё звычáйнае чалавекалю́бства і падняўшы мянé, калí я ляжáў без пáмяці, каб я ўстаў рáна і славаслóвіў улáду Тваю́. І цяпéр прасвятлí маé вóчы духóўныя, адкры́й маé вýсны, каб мне навучáцца слóву Твайму́, і разу-

[1] Святая Троіца — Трыадзіны Бог (Айцец, Сын і Святы Дух), таму гэты і наступныя выказнікі стаяць у мужчынскім родзе.

ме́ць за́паведзі Тваé, і выко́нваць во́лю Тваю́, і праслаўля́ць Цябе́ з удзя́чнасцю сардэ́чнай, і апява́ць усесвято́е імя́ Тваё — Айца́, і Сы́на, і Свято́га Ду́ха — цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Прыйдзі́це, паклоні́мся Цару́ на́шаму — Бо́гу. *(Паклон).*

Прыйдзі́це, паклоні́мся і прыпадзе́м да Хрыста́, Цара́ на́шага, Бо́га. *(Паклон).*

Прыйдзі́це, паклоні́мся і прыпадзе́м да Само́га Хрыста́, Цара́ і Бо́га на́шага. *(Паклон).*

Псалом 50

Памі́луй мяне́, Бо́жа, па вялі́кай мі́ласці Тваёй і па мно́ству шчо́драсцей Тваі́х ачы́сці беззако́нні маé. Зусі́м абмы́й мяне́ ад беззако́ння майго́ і ад грахў майго́ ачы́сці мяне́. Бо беззако́нне маё я зна́ю, і грэх мой пе́рада мно́ю заўжды́. Пе́рад Табо́й адзі́ным я саграшы́ў і зло́е пе́рад Табо́ю ўчыні́ў, так што Ты справядлі́вы ў сло́вах Тваі́х і беззага́нны ў судзе́ Тваі́м. Бо вось у беззако́ннях зача́ты я, і ў граха́х нарадзі́ла мяне́ ма́ці мая́. Бо вось і́сціну ўзлюбі́ў Ты, невядо́мае і та́йнае з прамў́драсці Тваёй адкры́ў Ты мне. Акрапі́ш мяне́ ісо́пам — і бу́ду чы́сты, абмы́еш мяне́ — і бу́ду за снег бяле́йшы. Дасі́ мне пачу́ць ра́дасць і вясяло́сць — і ўзра́дуюцца ко́сці пако́раныя. Адвярні́ аблі́чча Тваё ад грахо́ў маі́х і ўсе беззако́нні маé ачы́сці. Сэ́рца чы́стае ствары́ ўва мне, Бо́жа, і дух пра́ўды аднаві́ ўнутры́ мяне́. Не адкі́нь мяне́

ад аблíчча Твайго́ і Ду́ха Твайго́ Свято́га не адымí ад мяне́. Вярні́ мне ра́дасць спасе́ння Твайго́ і Ду́хам улада́рным умацу́й мяне́. Я навучу́ беззако́нных шляха́м Тваíм, і грэ́шныя да Цябе́ зве́рнуцца. Ура́ту́й мяне́ ад крывí[1], Бо́жа, Бо́жа спасе́ння майго́, і ўзра́дуецца язы́к мой пра́ўдзе Тваёй. Го́спадзі, ву́сны маé адкры́еш, і ву́сны маé абвясця́ць хвалу́ Тваю́. Бо калí б Ты захацéў ахвя́ры, то я даў бы, але ўсеспале́нне не мíлае Табе́. Ахвя́ра Бо́гу — дух скру́шаны; сэ́рцам скру́шаным і пако́рлівым Бог не пагарджа́е. Ашчаслíў, Го́спадзі, з ла́скі Тваé Сіён, і няха́й збу́дуюцца сце́ны Іерусалíма. Тады́ мíлай Табе́ бу́дзе ахвя́ра пра́ўды, прынашэ́нне і ўсеспале́нне; тады́ пакладу́ць на ахвя́рнік Твой цяльцо́ў.

Сімвал веры

1 Ве́рую ў Адзíнага Бо́га Айца́, Уседзяржы́целя, Тварца́ не́ба і зямлí, усяго́ ба́чнага і няба́чнага. 2 І ў адзíнага Го́спада Ісу́са Хрыста́, Сы́на Бо́жага, Адзінаро́днага, ад Айца́ наро́джанага пе́рад усíмі вяка́мі; Святло́ ад Святла́, Бо́га íсціннага ад Бо́га íсціннага, наро́джанага, не ство́ранага, адзінасу́тнага з Айцо́м, праз Яко́га ўсё ста́лася. 3 Які́ дзе́ля нас, людзе́й, і дзе́ля на́шага спасе́ння сышо́ў з нябёс і ўцяле́сніўся ад Ду́ха Свято́га і Дзе́вы Мары́і, і стаў чалаве́кам. 4 Быў распя́ты за нас пры По́нцыі

---

[1] Давід просіць Бога выратаваць яго ад пралітай крыві Урыі, у якой ён як быццам тоне.

Піла́це, і паку́таваў, і быў пахава́ны. 5 І ўваскрэ́с на трэ́ці дзень зго́дна з Пісáннем. 6 І ўзышо́ў на нябёсы, і сядзíць правару́ч Айцá. 7 І зноў пры́йдзе ў сла́ве судзíць жывы́х і мёртвых, і Яго Цáрству не бу́дзе канцá. 8 І ў Ду́ха Свято́га, Го́спада, Жыватво́рчага, што ад Айцá зыхо́дзіць, што з Айцо́м і Сы́нам ра́зам пакланя́емы і слáвімы, што гавары́ў праз праро́каў. 9 У адзíную Свяцу́ю Сабо́рную і Апо́стальскую Царкву́. 10 Вызнаю́ адно́ хрышчэ́нне для адпушчэ́ння грахо́ў. 11 Чака́ю ўваскрасе́ння мёртвых 12 і жыцця́ бу́дучага ве́ку. Амíнь.

Малітва 1-я, святога Макарыя Вялікага

Бо́жа, ачы́сці мяне́, грэ́шнага, бо я нікóлі не зрабíў до́брага пе́рад Табо́ю; але́ збаў мяне́ ад зло́га, і няха́й бу́дзе ўва мне во́ля Твая́, каб я неасу́джана [1] адкры́ў ву́сны ма́е недасто́йныя і ўсхвалíў імя́ Тваё свято́е — Айцá, і Сы́на, і Свято́га Ду́ха — цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амíнь.

Малітва 2-я, таго ж святога

Уста́ўшы ад сну, я апо́ўначы пе́сню прыно́шу Табе́, Спасíцелю, і, прыпада́ючы, ускліка́ю да Цябе́: не дай мне заснуць грахоунай смерцю, а пашкадуй мяне́, дабравóльна Распя́ты, і як ляжу́ я ў ляно́це, ху́тка паднімí мяне́ і спасí мяне́, як стаю́ я і малю́ся, і пасля́ сну начно́га дай заззя́ць нада мно́ю дню бязгрэ́шнаму, Хрысце́ Бо́жа, і спасí мяне́.

---

[1] Не наклікаючы на сябе асуджэння, беспакарана.

Малітва 3-я, таго ж святога

Да Цябе́, Уладару́ Чалавекалю́бны, уста́ўшы ад сну, я звярта́юся, і да спраў Тваіх прыступа́ю па мі-ласэ́рнасці Тваёй, і малю́ся Табе́: памажы́ мне ва ўся́кі час, ва ўся́кай рэ́чы, і захава́й мяне́ ад уся́кай злой рэ́чы ў све́це, і ад дыя́вальскага ўздзе́яння, і спасі́ мяне́, і ўвядзі́ ў Ца́рства Тваё ве́чнае. Бо Ты мой Стварыцель і ўся́кага дабра́ Прамысліцель і Па-да́цель, на Цябе́ ўсё спадзява́нне маё, і Табе́ сла́ву ўзно́шу цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва 4-я, таго ж святога

Го́спадзі, Ты вялі́кай Тваёй дабрынёю і вялі́кімі шчо́драсцямі Тваі́мі даў мне, рабу́ Твайму́, мінулы час но́чы гэ́тай без напа́сці прайсці́ ад уся́кага зла супраці́ўнага; Ты Сам, Уладару́, Тво́рца ўсяго́, спа-до́бі мяне́ ў і́сцінным Тваім святле́ і з прасве́тленым сэ́рцам выко́нваць во́лю Тваю́ цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва 5-я, святога Васілія Вялікага

Го́спадзі Уседзяржы́целю, Бо́жа сіл[1] і ўся́кае пло́-ці, Ты ў вышы́нях жыве́ш і на нізі́ны[2] спаглядае́ш, сэ́рцы і ду́мкі назіра́еш і я́сна ве́даеш та́йны чалаве́-чыя, Беспача́тнае і Вечнаі́снае Святло́, што не ма́е

---

[1] Маюцца на ўвазе сілы бясплотныя — ангелы.

[2] У сучасным царкоўнаславянскім тэксце — “на смиренныя”, г.зн. на прыгнечаных, уніжаных (людзей), але ў грэчаскім тэксце — “τὰ ταπεινά” — “нізіны”, “дол”.

змяне́ння і не даé це́ню! Ты Сам, Неўміру́чы Цару́, прымі́ маленні на́шы, якія мы ў цяпе́рашні час, спадзеючы́ся на мно́ства шчо́драсцей Тваіх, нячы́стымі ву́снамі прыно́сім Табе́, і дару́й нам правіннасці на́шы, учы́неныя на́мі дзе́яннем, сло́вам і ду́мкаю, свядо́ма ці несвядо́ма; і ачы́сці нас ад уся́кае нечыстаты́ пло́ці і ду́ху. І дай нам з нядрэ́мным сэ́рцам і цвяро́заю ду́мкаю ўсю ноч цяпе́рашняга жыцця́ прайсці́ ў чака́нні прышэ́сця све́тлага і сла́ўнага дня Адзінаро́днага Твайго́ Сы́на, Го́спада і Бо́га і Спасі́целя на́шага Ісу́са Хрыста́, калі́ са сла́ваю Суддзя́ ўсіх пры́йдзе ко́жнаму адда́ць паво́дле ўчы́нкаў яго́; каб не ў ляжа́нні і ляно́це, а нядрэ́мнымі і на нага́х, у выкана́нні за́паведзяў Яго́[1] мы былі́ зно́йдзены, гато́выя ўвайсці́ з Ім у ра́дасць і ў Бажэ́ственны хо́рам сла́вы Яго́, дзе святку́ючых го́лас несціха́ны і невымо́ўная асало́да сузіра́льнікаў невыка́знага хараства́ аблі́чча Твайго́. Бо Ты — і́сціннае Святло́, Яко́е прасвятля́е і асвяча́е ўсё, і Цябе́ апява́е ўсё стварэ́нне на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва 6-я, таго ж святога

Цябе́ благаслаўля́ем, вы́шні Бо́жа і Го́спадзі мі́ласці, Які́ заўсёды ро́біш з на́мі вялі́кае і недастýпнае разуме́нню, сла́ўнае і дзіво́снае, на што і лі́ку нямá, Які́ даў нам сон для супакае́ння не́мачы на́-

[1] Словы “запаведзяў Яго” ў царкоўнаславянскім тэксце адсутнічаюць, але яны ёсць у арыгінале грэчаскага тэксту малітвы: “ἐν τῇ ἐργασίᾳ τῶν ἐντολῶν”.

шай і аслабле́ння ўто́мленасці знясі́ленай пло́ці. Дзя́куем Табе́, што не загубі́ў нас з беззако́ннямі на́шымі, а паказа́ў Сваё звыча́йнае чалавекалю́бства і падня́ў нас, калі́ мы ляжа́лі без па́мяці, каб мы славасло́вілі ўла́ду Тваю́. Таму́ мо́лім бязме́рную Тваю́ до́брасць: прасвятлі́ на́шы ду́мкі, во́чы, і ро́зум наш ад ця́жкага сну ляно́ты абудзі́, адкры́й на́шы ву́сны і напо́ўні іх хвало́ю Табе́, каб мы маглі́ непару́шна апява́ць і праслаўля́ць Цябе́, ва ўсіх і ўсі́мі сла́вімага Бо́га — Беспача́тнага Айца́ з Адзінаро́дным Тваі́м Сы́нам, і Усесвяты́м, і До́брым, і Жыватво́рным Тваі́м Ду́хам — цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва 7-я, да Прасвятой Багародзіцы

Апява́ю благада́ць Тваю́, Улады́чыца, малю́ Цябе́: ро́зум мой благада́ццю адары́. Хадзі́ць пра́вільна мяне́ навучы́ — шля́хам Хрысто́вых за́паведзяў. Нядрэ́мнасць у спе́ве ўмацу́й, марко́тны сон адганя́ючы. Звя́занага ланцуга́мі грэхападзе́нняў малі́твамі Тваі́мі вы́звалі, Боганяве́ста. Уначы́ мяне́ і ўдзень ахо́ўвай, ад ваяўні́чых во́рагаў ратуючы мяне́. Ты, Яка́я Жыццядаце́ля — Бо́га нарадзі́ла, мяне́, памерлага ад страсцей, ажыві́. Ты, Яка́я Святло́ невячэ́рняе[1] нарадзі́ла, душу́ маю́ асле́плую прасвятлі́. О, дзівосны хо́рам Уладара́, до́мам Ду́ха Бажэ́ственнага мяне́ ўчыні́. Ты, Яка́я Ле́кара

[1] Якое не мае вечара, не сканчаецца, вечнае.

нарадзі́ла, вы́лечы душы́ маёй шматгадо́выя стра́сці. Мяне́, жыццёваю бу́раю захо́пленага, на сцяжы́ну пакая́ння скіру́й. Уратуй мяне́ ад агню́ ве́чнага, ад чарвяка́ лю́тага і та́ртара[1]. Не ўчыні́ ра́дасці для дэ́манаў з мяне́, у мно́гіх граха́х вінава́тага. Но́вым зрабі́ мяне́, змарне́лага ад неадчува́льных, Найчысце́йшая, саграшэ́нняў. Далёкім ад му́кі ўся́кай пакажы́ мяне́ і Уладара́ ўсіх умалі́. Нябе́сных мне дасягну́ць ра́дасцей з усі́мі святы́мі спадо́бі. Прасвята́я Дзе́ва, пачу́й го́лас няго́днага раба́ Твайго́. Дай лі́цца слеза́м маі́м, Прачы́стая, душы́ маёй нечыстату́ ачышча́ючы. Сто́гны ад сэ́рца прыно́шу Табе́ няспы́нна: падтрыма́й, Улады́чыца. Малі́тве-нае служэ́нне маё прымі́ і Бо́гу міласэ́рнаму прынясі́. Вышэ́йшая за Ангелаў, узнімі́ мяне́, не да́ўшы са све́там змяша́цца мне. Светлано́сная За́сень нябе́сная, духо́ўную благада́ць на мяне́ скіру́й. Ру́кі ўзніма́ю і адкрыва́ю забру́джаныя нечыстато́й ву́сны для ўсхвале́ння, Найчысце́йшая. Ад душатле́нных мяне́ напа́даў пазба́ў, стара́нна ўмаля́ючы Хрыста́, Яко́му паша́на і паклане́нне але́жаць цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва 8-я, да Госпада нашага Ісуса Хрыста

Мнагамі́ласцівы і Усямі́ласцівы Бо́жа мой, Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, дзе́ля вялі́кай любо́ві Ты сышо́ў і ўцяле́сніўся, каб спасці́ ўсіх. Дык вось, Спасі́-

[1] Грэч. “τάρταρος” — месца вечнага нясцерпнага холаду і змроку.

целю, спасí мяне́ па благадáці, малю́ Цябе́; бо калі за ўчы́нкі спасе́ш мяне́, то гэ́та не благадáць і дар, а хутчэ́й абавя́зак. О, багáты шчóдрасцямі і невымóўны ў мíласці! Ты сказáў, Хрысце́ мой: хто ве́руе ў Мяне́, той жывы́ бу́дзе і не ўбáчыць сме́рці вавéкі. Калí ж ве́ра ў Цябе́ спасáе тых, хто ў адчáі, то вось я ве́рую, спасí мяне́, бо Ты мой Бог і Ствары́цель. І ве́ра заме́ст учы́нкаў няхáй залíчана бу́дзе мне, Бóжа мой, бо Ты зусíм не знóйдзеш учы́нкаў, якія апраўдáюць мяне́. Але́ той ве́ры маёй няхáй дастаткóва бу́дзе заме́ст усíх іх, яна́ няхáй адказвае, яна́ няхáй апраўдáе мяне́, яна́ няхáй зрóбіць мяне́ ўдзе́льнікам ве́чнай слáвы Тваёй. Каб не вы́краў мяне́ сатана́ і не пахвалíўся, Слóва[1], што ён забрáў мяне́ з Тваёй рукí і з-пад Тваёй ахóвы. Але ці хачу́, ці не хачу́, спасí мяне́, Хрысце́, Спасíцелю мой, паспяшы́ скóра, бо ху́тка загíну: Ты ж Бог мой ад улóння мáці маёй. Спадóбі мяне́, Гóспадзі, цяпе́р узлюбíць Цябе́, як не́калі я любíў той сáмы грэх; і ўжо служы́ць Табе́ без ляно́ты шчы́ра, як я служы́ў ране́й сатане́ лжы́ваму. Лепш бу́ду служы́ць Табе́, Гóспаду і Бóгу майму́ Ісу́су Хрысту́, ва ўсе дні жыццця́ майгó, цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вякóў. Амíнь.

---

[1] Грэчаскае “Λόγος” (“Логас”) — Гасподзь Ісус Хрыстос, другая Асоба Святой Троіцы (гл.: Ін. 1, 1–17).

Малітва 9-я, да Ангела ахоўніка

Святы́ А́нгеле, пастаўлены ахо́ўваць маю́ бе́дную душу́ і няшча́снае жыццё, не пакі́нь мяне́, грэ́шнага, і не адступі́ ад мяне́ за няўстры́манасць маю́. Не дай магчы́масці зло́му дэ́ману авало́даць мно́ю праз перава́гу гэ́тага смяро́тнага це́ла; вазьмі́ мо́цна гаро́тную і кво́лую руку́ маю́ і вы́вядзі мяне́ на шлях спасе́ння. О, святы́ А́нгеле Бо́жы, ахо́ўнік і заступнік бе́днай маёй душы́ і це́ла, усё мне праба́ч, чым я знява́жыў цябе́ ва ўсе дні жыцця́ майго́ і, калі́ я чым саграшы́ў у гэ́тую мінулую ноч, абарані́ мяне́ ў цяпе́рашні дзень; і захава́й мяне́ ад уся́кае спакусы варо́жае, каб я ніякім грахо́м не ўгнявіў Бо́га; і малі́ся за мяне́ Го́спаду, каб Ён умацава́ў мяне́ ў стра́ху Сваі́м і зрабіў мяне́ рабо́м, досто́йным Сваёй до́брасці. Амі́нь.

Малітва 10-я, да Прасвятой Багародзіцы

Прасвята́я Улады́чыца мая́, Багаро́дзіца, святы́мі Тваі́мі і ўсемагу́тнымі малі́твамі адгані́ ад мяне́, пако́рлівага і няшча́снага раба́ Твайго́, марко́ту, ня-па́мятлівасць, неразу́мнасць, нядба́йнасць і ўсе нячы́стыя, злы́я і кашчу́нныя ду́мкі з бе́днага майго́ сэ́рца і з азмро́чанага ро́зуму майго́; і пагасі́ по́лымя страсце́й маіх, бо я ўбо́гі і няшча́сны. І пазба́ў мяне́ ад шматлі́кіх згу́бных успамі́наў і наме́раў, і ад усіх учы́нкаў злых вы́звалі мяне́. Бо Цябе́ благаслаўля́юць усе́ ро́ды, і сла́віцца найпачэ́снейшае імя́ Тваё на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітвены зварот да святога, імя якога носіш

Малí Бóга за мянé, святы́ ўгóднік Бóжы *(імя)*, бо я шчы́ра да цябé звяртáюся, скóрага памóчніка і малíтвенніка за душý маю.

Песня да Прасвятой Багародзіцы

Багарóдзіца Дзéва, рáдуйся, Благадáтная Мары́я, Гаспóдзь з Табóю; благаслáвёная Ты сярóд жанчы́н і благаслáвёны плод улóння Твайгó, бо Ты нарадзíла Спасíцеля душ нáшых.

Трапар Крыжу і малітва за Бацькаўшчыну

Спасí, Гóспадзі, людзéй Тваíх і благаслáві спáдчыну Тваю́, перамóгу праваслáўным хрысція́нам над працíўнікамі даючы́ і Тваíм Кры́жам ахóўваючы нарóд Твой.

Малітва за жывых

Спасí, Гóспадзі, і памíлуй айцá майгó духóўнага *(імя)*, бацькóў маíх *(імёны)*, сваякóў *(імёны)*, начáльнікаў, настáўнікаў, дабрадзéяў *(імёны іх)* і ўсíх праваслáўных хрысція́н.

Малітва за спачылых

Упакóй, Гóспадзі, дýшы спачы́лых рабóў Тваíх: бацькóў маíх, сваякóў, дабрадзéяў *(імёны іх)*, і ўсíх праваслáўных хрысція́н і прабáч ім усé саграшэ́ннi, вóльныя і міжвóльныя, і падáй ім Цáрства Нябéснае.

Калі можаш, чытай замест кароткіх малітваў за жывых і спачылых наступны памяннік:

За жывых

Памяні́, Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, Бо́жа наш, мі́ласці і шчо́драсці Тваё́ адве́чныя, з-за які́х Ты і стаў чалаве́кам, і распя́ццe і смерць дзе́ля спасе́ння тых, хто пра́вільна ве́руе ў Цябе́, перацярпе́ць пажада́ў; і, уваскрэ́снуўшы з мёртвых, Ты ўзнёсся на нябёсы і сядзі́ш правару́ч ад Бо́га Айца́, і прыхі́льна прыма́еш пако́рлівыя малі́твы тых, хто ўсім сэ́рцам кліча Цябе́; прыхілі́ ву́ха Тваё і пачу́й пако́рлівую малі́тву маю́, недасто́йнага раба́ Твайго́, які́ прыно́сіць яе́ Табе́, як пах во́дару духо́ўнага, за ўсіх людзе́й Тваі́х. І найпе́рш памяні́ Царкву́ Тваю́ Святу́ю, Сабо́рную і Апо́стальскую, якую здабы́ў Ты пачэ́снаю Сваёю Крывёю; і сцве́рдзі яе́, і ўмацу́й, і пашы́р, памно́ж, замі́ры і захава́й наве́к неперамо́жнаю варо́тамі пяке́льнымі[1]; нязго́ду паміж Цэ́рквамі ўціхамі́р, гане́ннi ад язы́чнікаў загасі́, і ўзнікне́нню е́расяў ху́тка перашко́дзь і вы́карані іх, і ў нішто́ сі́лаю Свято́га Твайго́ Ду́ха ператвары́. *(Паклон).*

Спасі́, Го́спадзі, і памі́луй Бо́гам сцераго́ную краі́ну на́шу, ула́ды і во́інства яе́, каб нам ве́сці ці́хае і спако́йнае жыццё з усёй набо́жнасцю і го́днасцю. *(Паклон).*

---

[1] Вароты пякельныя — сілы зла, пекла.

Спасí, Гóспадзі, і памíлуй Вялíкага Спадарá і Айцá нáшага Свяцéйшага Патрыя́рха Кіры́ла і Экзáрха ягó Спадарá нáшага Высокапраасвяшчэ́ннейшага мітрапалíта Філарэ́та, Праасвяшчэ́нных мітрапалíтаў, архіепíскапаў і епíскапаў праваслáўных, а таксáма іерэ́яў, дыя́канаў і ўвесь прычт царкóўны, які Ты паставíў пáсвіць духóўнае Тваё стáда, і малíтвамі іх памíлуй і спасí мянé, грэ́шнага. *(Паклон).*

Спасí, Гóспадзі, і памíлуй айцá майгó духóўнага *(імя яго)*, і святы́мі ягó малíтвамі прабáч маé сагрэшэ́ннi. *(Паклон).*

Спасí, Гóспадзі, і памíлуй бацькóў маíх *(імёны іх)*, братóў і сясцёр, і сваякóў маíх па плóці, і ўсіх блíжніх рóду майгó, і сяброў, і дай ім Тваé зямны́я і нябéсныя дабрóты. *(Паклон).*

Спасí, Гóспадзі, і памíлуй стары́х і малады́х, убогíх і сірóт, і ўдоў, хвóрых і засмýчаных, тых, што ў бядзé і ў няшчáсці, пад уцíскам і ў нявóлі, а таксáма ў цямніцах і ссы́лках, асаблíва ж рабóў Тваíх, якíя за Цябé і вéру праваслáўную перасле́дуюцца бязбóжнымі язы́чнікамі і ерэтыкáмі, — памянí іх, навéдай, умацýй, уцéш і скóра сíлаю Тваёю палёгку, вызвалéнне і выратавáнне ім падáй. *(Паклон).*

Спасí, Гóспадзі, і памíлуй пасланы́х на слýжбу, падарóжных айцóў і братóў нашых, і ўсіх праваслáўных хрысція́н. *(Паклон).*

Спасí, Гóспадзі, і памíлуй тых, кагó я па неразýмнасці сваёй спакусíў і са шляхý спасíцельнага звёў, да ўчы́нкаў злых і ганéбных прывёў; Бажэ́ственным

Тваім Прóмыслам на шлях спасéння зноў іх вярні́. *(Паклон).*

Спасí, Гóспадзі, і памíлуй тых, што ненавíдзяць і крыўдзяць мянé, і нападáюць на мянé, і не дай ім загíнуць з-за мянé, грэ́шнага. *(Паклон).*

Тых, што ад праваслáўнай вéры адступíлі і пагíбельнымі éрасямі аслéплены, прасвятлí святлóм пазнáння Цябé і да Святóй Тваёй Апóстальскай Сабóрнай Царквы́ далучы́. *(Паклон).*

За спачылых

Памянí, Гóспадзі, тых, што з жыцця́ гэ́тага адышлí, свяцéйшых патрыя́рхаў, праасвяшчэ́нных мітрапалíтаў, архіепíскапаў і епíскапаў праваслáўных, а таксáма тых, што паслужы́лі Табé ў іерэ́йскім сáне і ў царкóўным пры́чце, і ў манáшаскім чы́не, і ў вéчных Тваíх сялíбах са святы́мі іх упакóй. *(Паклон).*

Памянí, Гóспадзі, дýшы спачы́лых рабóў Тваíх: бацькóў маíх *(імёны іх)* і ўсíх сваякóў па плóці; і прабáч ім усé саграшэ́нні, вóльныя і міжвóльныя, падáй ім Цáрства і далучэ́нне да вéчных Тваíх дабрóт, і Твайгó бяскóнцага блажэ́ннага жыцця́ асалóду. *(Паклон).*

Памянí, Гóспадзі, і ўсіх спачы́лых з надзéяй на ўваскрасéнне і жыццё вéчнае айцóў і братóў нáшых, і ся́сцёр, і тых, што тут ляжáць і ўсю́ды, праваслáўных хрысція́н, і са святы́мі Тваíмі, дзе зся́е святлó аблíчча Твайгó, усялí іх, і нас памíлуй як Дóбры і Чалавекалю́бны. Амíнь. *(Паклон).*

Пада́й, Го́спадзі, адпушчэ́нне граха́ў усі́м, які́я ране́й адышлі́ з ве́рай і надзе́яй на ўваскрасе́нне, айца́м, брата́м і сёстрам на́шым, і ствары́ ім ве́чную па́мяць. *(Тройчы).*

Малітва апошніх Опцінскіх старцаў[1]

Го́спадзі, дай мне з душэ́ўным спако́ем сустрэ́ць усё, што прынясе́ мне сённяшні дзень. Дай мне ца́лкам адда́цца во́лі Тваёй свято́й. У ко́жную пару́ гэ́тага дня ва ўсім накіру́й і падтрыма́й мяне́. Які́я б я ні атрыма́ў зве́сткі на праця́гу дня, навучы́ мяне́ прыня́ць іх са спако́йнай душо́ю і цвёрдай упэ́ўненасцю, што на ўсё свята́я во́ля Твая́.

Ва ўсіх сло́вах і спра́вах маіх кіру́й маімі ду́мкамі і пачу́ццямі. Ва ўсіх непрадба́чаных вы́падках не дай мне забы́ць, што ўсё пасла́на Табо́ю.

Навучы́ мяне́ шчы́ра і разу́мна абыхо́дзіцца з ко́жным чле́нам сям'і́ маёй, ніко́га не бянтэ́жачы і не засмуча́ючы.

Го́спадзі, дай мне сі́лу перане́сці сто́му сённяшняга дня і ўсе падзе́і на праця́гу дня. Кіру́й маёю во́ляю і навучы́ мяне́ малі́цца, ве́рыць, спадзява́цца, цярпе́ць, прабача́ць і любі́ць. Амі́нь.

---

[1] Гэтая і наступная малітвы не ўваходзяць у склад ранішніх малітваў, але некаторыя набожныя хрысціяне дадаюць іх да свайго малітвенага правіла і чытаюць разам з ранішнімі малітвамі.

Малітва іерасхіманаха Парфенія Кіеўскага

Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, Сы́не Бо́жы, не дапусці́, каб мітусліва́сць, самалю́бства, пачуццёвасць, нядба́йнасць, гнеў панава́лі нада мно́ю і выкрада́лі мяне́ ў любо́ві Тваёй. О, Го́спадзі, Стварыцелю мой, усё спадзява́нне маё! Не пакінь мяне́ без удзе́лу ў блажэ́ннай ве́чнасці; зрабі так, каб і я пасле́даваў свято́му прыкладу Твайму, быў пако́рны ўла́дам, нада мно́ю паста́ўленым; дай мне ту́ю чысціню́ ду́ху, ту́ю прастату́ сэ́рца, якія ро́бяць нас дасто́йнымі любо́ві Тваёй.

Да Цябе́, о Бо́жа мой, узно́шу душу́ і сэ́рца маё: не дай загі́нуць стварэ́нню Твайму́, а пазба́ў мяне́ ад адзі́нага і найвялі́кшага зла — граху́. Зрабі, Го́спадзі, так, каб я перано́сіў з тако́й са́май цярплі́васцю хвалява́нні і скру́хі душэ́ўныя, з яко́ю ра́дасцю прыма́ю ўце́хі сардэ́чныя. Калі Ты хо́чаш, Го́спадзі, — мо́жаш ачы́сціць і асвяці́ць мяне́. Вось, аддаю́ сябе́ Тваёй до́брасці з про́сьбаю вы́нішчыць ува́ мне ўсё супраці́ўнае Табе́ і далучы́ць да лі́ку выбра́ннікаў Тваі́х.

Го́спадзі, адымі́ ад мяне́ бяздзе́йнасць ду́ху, якая марну́е час; мітусліва́сць ду́мак, яка́я перашкаджа́е Тваёй прысу́тнасці і рассе́йвае маю́ ува́гу ў час малі́твы; і калі́ на малі́тве я ўхіля́юся ад Цябе́ сваі́мі ду́мкамі, то памажы́ мне, каб гэ́тая рассе́янасць не была́ наўмы́снай, і, ухіля́ючы ро́зум, каб не адвярну́ў я сэ́рца сваё ад Цябе́.

Вызнаю́ пе́рад Табо́ю, Го́спадам Бо́гам маі́м, усе́ грахі́ майго́ беззако́ння, цяпе́р і ране́й учы́неныя пе́рад Табо́ю: адпусці́ мне іх дзе́ля імя́ Твайго́ свя-то́га, і спасі́ душу́ маю́, яку́ю Ты адкупі́ў каштóўнаю Крывёю Тваёю. Аддаю́ сябе́ міласэ́рнасці Тваёй, ад-даю́ся во́лі Тваёй, рабі́ са мно́ю паво́дле до́брасці Тваёй, а не паво́дле зласлі́васці і беззако́ння майго́. Навучы́ мяне́, Го́спадзі, размяркóўваць свае́ спра́вы так, каб яны садзе́йнічалі праслаўле́нню Твайго́ свя-то́га імя́.

Змі́луйся, Го́спадзі, над усі́мі хрысціяна́мі; па-чу́й жада́нне ўсіх, хто кліча Цябе́, пазба́ў ад усяка-га зла, спасі́ рабо́ў Тваіх *(імёны)*, пашлі́ ім ра́дасць, уце́ху ў журбе́ і мі́ласць Тваю́ святу́ю. Го́спадзі! Ма-лю́ Цябе́ асабліва за тых, хто мяне́ чым-небудзь пакры́ўдзіў і засмуці́ў або́ яко́е-не́будзь зло ўчыні́ў мне: не кара́й іх за мяне́, грэ́шнага, а вы́лі на іх до́б-расць Тваю́.

Го́спадзі, малю́ Цябе́ за ўсіх, каго́ я, грэ́шны, за-смуці́ў, пакры́ўдзіў або́ спакусі́ў сло́вам, учы́нкам, ду́мкаю, наўмы́сна ці незнаро́к. Го́спадзі Бо́жа! Да-ру́й нам на́шы ўзае́мныя кры́ўды; вы́гані, Го́спадзі, з сэ́рцаў на́шых усяля́кае абурэ́нне, падазрэ́нне, гнеў, злапа́мятнасць, сва́ркі і ўсё то́е, што мо́жа пе-рашкаджа́ць любо́ві і змянша́ць браталю́бства.

Памі́луй, Го́спадзі, тых, які́я даручы́лі мне, грэ́ш-наму, недасто́йнаму, малі́цца за іх! Памі́луй, Го́спа-

дзі, ко́жнага, хто про́сіць Тваёй дапамо́гі. Го́спадзі! Зрабі́ гэ́ты дзень днём міласэ́рнасці Тваёй, пада́й ко́жнаму паво́дле про́сьбы яго́; будзь па́стырам тых, што заблудзі́лі, правадыро́м і святло́м для недасве́дчаных, наста́ўнікам для неразу́мных, ба́цькам для асіраце́лых, памо́чнікам для прыгне́чаных, ле́карам для хво́рых, суцяша́льнікам для тых, што пры сме́рці, і прывядзі́ нас усіх да жада́нага канца́ — да Цябе́, прыста́нішча на́шага і блажэ́ннага ўпакае́ння. Амі́нь.

Заканчэнне малітваў

Дасто́йна ёсць сапраўды́ ўблажа́ць Цябе́, Багаро́дзіцу, заўжды́ блажэ́нную і найчысце́йшую і Ма́ці Бо́га на́шага. Пачэ́снейшую за Херувімаў і непараўна́льна слаўне́йшую за Серафімаў, што непару́шаную нарадзі́ла Бо́га Сло́ва, І́сную Багаро́дзіцу, Цябе́ велічаем.

Ад Пасхі да Узнясення замест "Дастойна ёсць" пяецца:

Ангел усклі́ка́ў да Благада́тнай: "Чы́стая Дзе́ва, ра́дуйся!" І я паўтару́: ра́дуйся! Твой Сын уваскрэ́с на трэ́ці дзень з магі́лы і мёртвых уваскрасі́ў. Лю́дзі, весялі́цеся!

Свя̀ці́ся, свяці́ся, но́вы Іерусалі́ме, бо сла́ва Гаспо́дняя азары́ла цябе́! Святку́й цяпе́р і весялі́ся, Сіёне! А Ты, Чы́стая Багаро́дзіца, ра́дуйся ўваскрасе́нню Наро́джанага Табо́ю.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Го́спадзі, памі́луй. *(Тройчы).*

Го́спадзі, Ісу́се Хрысце́, Сы́не Бо́жы, дзе́ля малі́твaў Прачы́стае Твае́ Ма́ці, прападо́бных і багано́сных айцо́ў на́шых і ўсіх святы́х, памі́луй нас. Амі́нь.

МАЛІТВЫ ВЯЧЭРНІЯ

У імя́ Айца́, і Сы́на, і Свято́га Ду́ха. Амі́нь.

Го́спадзі, Ісу́се Хрысце́, Сы́не Бо́жы, дзе́ля малі́тваў Прачы́стае Тваі́ Ма́ці, прападо́бных і багано́сных айцо́ў на́шых і ўсіх святы́х, памі́луй нас. Амі́нь.

Сла́ва Табе́, Бо́жа наш, сла́ва Табе́.

Цару́ Нябе́сны, Уцяшы́целю, Ду́ху і́сціны, Ты ўсю́ды прысу́тны і ўсё напаўня́еш, Ска́рбніца дабра́ і жыцця́ Пада́целю, прыйдзі́ і ўсялі́ся ў нас, і ачы́сці нас ад уся́кае нечыстаты́ і спасі́, До́бры, ду́шы на́шы.

Святы́ Бо́жа, Святы́ Мо́цны, Святы́ Несмяро́тны, памі́луй нас. *(Чытаем тройчы, робячы на сабе знак Крыжа і паясны паклон).*

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Прасвята́я Тро́іца, памі́луй нас; Го́спадзі, ачы́сці грахі́ на́шы; Уладару́, праба́ч беззако́нні на́шы; Святы́, наве́дай і ацалі́ не́мачы на́шы дзе́ля імя́ Твайго́.

Го́спадзі, памі́луй. *(Тройчы).*

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

О́йча наш, Які́ ёсць на нябёсах! Няха́й свяці́цца імя́ Тваё, няхай пры́йдзе Ца́рства Тваё, няха́й бу́дзе во́ля Твая́ як на не́бе, так і на зямлі́. Хлеб наш надзённы дай нам сёння; і дару́й нам даўгі́ на́шы, як і мы дару́ем даўжніка́м на́шым; і не ўвядзі́ нас у спако́ку, але збаў нас ад зло́га.

Трапары

Памі́луй нас, Го́спадзі, памі́луй нас; бо, ніякага апраўда́ння не знахо́дзячы, гэ́тую малі́тву Табе́ як Уладару́ мы, грэ́шныя, прыно́сім: памі́луй нас.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Го́спадзі, памі́луй нас, бо мы на Цябе́ спадзя-е́мся[1]; не загне́вайся на нас ве́льмі і не ўспамі́на́й беззако́нняў на́шых, а паглядзі́ і цяпе́р, як міласэ́рны, і збаў нас ад во́рагаў на́шых; бо Ты Бог наш і мы лю́дзі Тваé, усé — стварэ́нне рук Тваіх і імя́ Тваё прызыва́ем.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Міласэ́рнасці дзве́ры адчыні́ нам, благаславе́нная Багаро́дзіца, каб мы, ма́ючы надзе́ю на Цябе́, не загі́нулі, а каб пазба́віліся праз Цябе́ ад бед, бо Ты — спасе́нне ро́ду хрысціянскага.

Го́спадзі, памі́луй. *(12 разоў).*

---

[1] Царкоўнаславянскае “упова́хом” — “мы спадзяваліся”, але дзеяслоў “πείθω”, які стаіць тут у арыгінале ў форме перфекта “πέποιθα” мае значэнне цяперашняга часу (Вейсман А. Д. Греческо-русский словарь. Изд. 5. — СПб., 1899. — С. 966).

Малітва 1-я, святога Макарыя Вялікага, да Бога Айца

Бо́жа ве́чны і Цару́ ўсяго́ стварэ́ння, Ты спадо́біў мяне́ дажы́ць да гэ́тай гадзі́ны; праба́ч мне грахі́, што я зрабі́ў у гэ́ты дзень учы́нкам, сло́вам і ду́мкаю, і ачы́сці, Го́спадзі, прыгне́чаную маю́ душу́ ад уся́кае нечыстаты́ пло́ці і ду́ху. І дай мне, Го́спадзі, у гэ́тую ноч спако́йны сон, каб, уста́ўшы з майго́ ўбо́гага ло́жа, я рабіў уго́днае прасвято́му і́мені Твайму́ ва ўсе дні жыцця́ майго́ і перамага́ў во́рагаў, які́я напада́юць на мяне́, пло́цкіх і бясплО́тных. І пазба́ў мяне́, Го́спадзі, ад ма́рных ду́мак, які́я апага́ньваюць мяне́, і ад нячы́стых жада́нняў. Бо Тваё ёсць Ца́рства, і сі́ла, і сла́ва — Айца́, і Сы́на, і Свято́га Ду́ха, цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва 2-я, святога Антыёха, да Госпада нашага Ісуса Хрыста

Уседзяржы́целю, Сло́ва Айца́, Ты, бу́дучы Сам дасканА́лым, Ісу́се Хрысце́, дзе́ля вялі́кай міласэ́рнасці Тваёй ніко́лі не пакіда́й мяне́, раба́ Твайго́, а заўжды́ ўва мне заставА́йся. Ісу́се, до́бры Па́стыру Тваі́х аве́чак, не адда́й мяне́ мяце́жнаму зме́ю і на во́лю сатаны́ не пакі́нь мяне́, бо насе́нне пагі́белі ёсць ува́ мне. Ты ж, Го́спадзі Бо́жа пакланя́емы, Цару́ Святы́ Ісу́се Хрысце́, ахава́й мяне́ ў час сну незгаса́льным святло́м — Ду́хам Тваі́м Святы́м, Які́м Ты асвяці́ў Сваіх ву́чняў. Дай, Го́спадзі, і мне, недасто́йнаму рабу́ Твайму́, спасе́нне Тваё на ло́жы маі́м: прасвятлі́ ро́зум мой святло́м разуме́ння свято́га Ева́нгелля

Твайго́, душу́ — любо́ўю да Крыжа́ Твайго́, сэ́рца — чысцінёю сло́ва Твайго́, це́ла маё — Тваі́мі паку́тамі бясстра́снымі, ду́мку маю Тваёю пако́рлівасцю аха-ва́й і падымі́ мяне́ ў нале́жны час, каб я славасло́віў Цябе́. Бо Ты найбо́льш праслаўлены з Беспача́тным Тваім Айцо́м і з Прасвяты́м Ду́хам наве́кі. Аміньь.

Малітва 3-я, да Прасвятога Духа

Го́спадзі, Цару́ Нябе́сны, Уцяшы́целю, Ду́ху і́сціны, змі́луйся і памі́луй мяне́, грэ́шнага раба́ Твайго́, і адпусці́ мне, недасто́йнаму, і праба́ч усё, чым я саграшы́ў пе́рад Табо́ю сёння як чалаве́к, а на́ват і не як чалаве́к, а горш за скаці́ну, во́льныя маé граxі́ і міжво́льныя, свядо́мыя і несвядо́мыя, ты́я, што з-за маладо́сці і ад зло́га кава́рства, і ты́я, што ад запа́льчывасці і з-за нядба́ласці. Мо́жа, і́мем Тваім я кля́ўся або́ знява́жыў яго́ ў ду́мках сваіх; або́ каго́ папракну́ў; або́ ўзвёў на каго́ паклёп у гне́ве сваім, або́ каго́ засмуці́ў, або́ з-за чаго́сьці загне́ваўся; або́ няпра́ўду сказа́ў, або́ заўча́сна спаў, або́ жабра́к прыйшо́ў да мяне́, і я пагрэ́баваў ім; або́ бра́та майго́ засмуці́ў, або́ пачына́ў сва́ркі, або́ каго́ асудзі́ў; або́ ўзвыша́ў сябе́, або́ ганары́ўся, або́ загне́ваўся; або́ калі́ я стая́ў на малі́тве, ро́зум мой злом све́ту гэ́тага захапля́ўся, або́ хі́трыя ду́мкі я меў; або́ аб`яда́ўся, або́ апіва́ўся, або́ бязду́мна смяя́ўся; або́ зло́е заду́маў, або́, даскана́ласць чужу́ю ўба́чыўшы, пазайздро́сціў у сэ́рцы, або́ непрысто́йнае гаварыў, або́

з грахў бра́та майго́ пасмяя́ўся, тады́ як маé сагра-шэ́нні незлічо́ныя; або́ пра малі́тву не дбаў, або́ і́ншае што нядо́брае зрабі́ў, не по́мню, бо ўсё гэ́та і больш яшчэ́ зрабі́ў я. Памі́луй мяне́, Твóрца мой і Уладарў, панў́рага і недасто́йнага раба́ Твайго́, і дарў́й мне, і адпусці́, і праба́ч мне як До́бры і Чалавекалю́бны, каб спако́йна лёг, заснў́ў і адпачы́ў я, блў́дны, грэ́шны і акая́нны, і каб паклані́ўся і апе́ў, і праслáвіў найпачэ́снейшае імя́ Тваё з Айцо́м і Адзінаро́дным Яго́ Сы́нам, цяпе́р, і заўсёды, і наве́кі. Амі́нь.

Малітва 4-я, святога Макарыя Вялікага

Што́ Табе́ прынясў або́ чым Табе́ аддзя́чу, мнагашчо́дры Бессмяро́тны Царў́, шчо́дры і чалавекалю́бны Го́спадзі, за то́е, што мяне́, які́ лянў́ецца служы́ць Табе́ і нічо́га до́брага не зрабі́ў, Ты давёў да канца́ гэ́тага мінў́лага дня, скіро́ўваючы да ако́рнасці і спасе́ння душў́ маю́? Будзь мі́ласцівы да мяне́, грэ́шнага, які́ не ма́е ніякага до́брага ўчы́нку, аднаві́ прапа́шчую маю́ душў́, апага́неную незлічо́нымі саграшэ́ннямі, і адхілі́ ад мяне́ ўсе ду́мкі ліхія гэ́тага ба́чнага жыцця́. Праба́ч, адзі́ны Бязгрэ́шны, маé саграшэ́нні, які́мі пе́рад Табо́ю я саграшы́ў у гэ́ты дзень свядо́ма і несвядо́ма, сло́вам, і ўчы́нкам, і ду́мкаю, і ўсі́мі маі́мі пачу́ццямі. Ты Сам, ахі-на́ючы, захава́й мяне́ ад усяка́га варо́жага напа́ду Бажэ́ственнаю Тваёю ўла́даю, і невымо́ўным чалавекалю́бствам, і сі́лаю. Ачы́сці, Бо́жа, ачы́сці бе́зліч

грахо́ў маіх. Будзь ласка́вы, Го́спадзі, вы́звалiць мяне́ з па́сткі нячы́стага, і спасі́ паку́тную маю́ душу́, і ахіні́ мяне́ святло́м абліччa Твайго́, як пры́йдзеш у сла́ве, і цяпе́р дай мне сном без асуджэ́ння засну́ць, і ахава́й ду́мкі раба́ Твайго́ ад летуце́ння і збянтэ́жанасці, і ўсё сатані́нскае дзе́янне адгані́ ад мяне́, і прасвятлі́ духо́ўныя во́чы майго́ сэ́рца, каб не засну́ў я смяро́тным сном. І пашлі́ мне А́нгела мі́ру, ахо́ўніка і наста́ўніка душы́ і це́ла маіх, каб ён ратава́ў мяне́ ад во́рагаў маіх; каб, уста́ўшы з пасце́лі маёй, я прынёс Табе́ ўдзя́чныя малі́твы. О, Го́спадзі, пачу́й мяне́, грэ́шнага і ўбо́гага во́ляю і сумле́ннем раба́ Твайго́; дай мне, як уста́ну, навуча́цца сло́ву Твайму́, і нядба́ласць дэ́манскую далёка адгані́ ад мяне́ праз Тваіх А́нгелаў; каб я благаслаўля́ў імя́ Тваё свято́е, і праслаўля́ў, і сла́віў Прачы́стую Багаро́дзіцу Мары́ю, Яку́ю Ты даў нам, грэ́шным, для засту́пніцтва; прымі́ ж Ту́ю, што мо́ліцца за нас, бо ве́даю, што Яна́ перайма́е Тваё чалавекалю́бства і малі́цца не перастае́. Яе засту́пніцтвам, і Пачэ́снага Крыжа́ знаме́ннем, і дзе́ля ўсіх святы́х Тваіх убо́гую душу́ маю́ зберажы́, Ісу́се Хрысце́, Бо́жа наш, бо Ты Святы́ і найбо́льш праслаўлены наве́кі. Амі́нь.

Малітва 5-я

Го́спадзі Бо́жа наш, у чым я саграшы́ў у гэ́ты дзень сло́вам, учы́нкам і ду́мкаю, Ты як До́бры і Чалавекалю́бны праба́ч мне. Спако́йны сон і ціхамі́рны

падáй мне. Ангела Твайгó ахóўніка пашлí, каб ён ахінáў і аберагáў мянé ад усякага зла, бо Ты — ахóўнік душ і цел нáшых, і Табé слáву ўзнóсім — Айцý, і Сы́ну, і Святóму Дýху, цяпéр, і заўсёды, і на вéкі вякóў. Амíнь.

Малітва 6-я

Гóспадзі, Бóжа наш, у Якóга мы вéруем і Чыё імя́ больш за ўся́кае імя́ прызываем, падáй нам пры адыхóдзе да сну палёгку для душы́ і цéла і засцераж ы́ нас ад усякага летуцéння і ад брýднай сладастрáснасці; спынí памкнéнне страсцéй, пагасí пóлымя пажáднасці цялéснай. Дай нам захóўваць цнатлівасць ва ўчы́нках і ў слóвах; каб, правóдзячы дабрадзéйнае жыццё, мы не пазбáвіліся абяцáных Тваíх дабрóт, бо Ты благаслáвёны навéкі. Амíнь.

Малітва святога Іаана Залатавуста

(24 малітвы, па колькасці гадзін дня і ночы)

1. Гóспадзі, не пазбáў мянé нябéсных Тваíх дабрóт.

2. Гóспадзі, збаў мянé ад вéчных мук.

3. Гóспадзі, рóзумам ці дýмкаю, слóвам ці ўчы́нкам саграшы́ў я, прабáч мне.

4. Гóспадзі, збаў мянé ад усякага нявéдання, і забыцця́, і маладýшнасці, і скамянéлае нячýласці.

5. Го́спадзі, збаў мяне́ ад уся́кае спаку́сы.

6. Го́спадзі, прасвятлі́ маё сэ́рца, азмро́чанае ліхо́ю пажа́днасцю.

7. Го́спадзі, я як чалаве́к саграшы́ў, Ты ж як Бог шчо́дры памі́луй мяне́, ба́чачы не́мач душы́ маёй.

8. Го́спадзі, пашлі́ благада́ць Тваю́ ў дапамо́гу мне, каб я праслáвіў імя́ Тваё свято́е.

9. Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, запішы́ мяне́, раба́ Твайго́, у кні́зе жыцця́ і пада́й мне до́бры скон.

10. Го́спадзі Бо́жа мой, хоць я і нічо́га до́брага не зрабі́ў пе́рад Табо́ю, але дай мне па благада́ці Твае́й пакла́сці до́бры пача́так.

11. Го́спадзі, акрапі́ сэ́рца маё расо́ю благада́ці Тваёй.

12. Го́спадзі не́ба і зямлі́, памяні́ мяне́, грэ́шнага раба́ Твайго́, мярзо́тнага і нячы́стага, у Ца́рстве Тваім. Амі́нь.

1. Го́спадзі, у пакая́нні прымі́ мяне́.

2. Го́спадзі, не паки́нь мяне́.

3. Го́спадзі, не ўвядзі́ мяне́ ў напа́сць.

4. Го́спадзі, дай мне ду́мку до́брую.

5. Го́спадзі, дай мне слёзы, і па́мяць пра смерць, і замілава́нне.

6. Го́спадзі, дай мне жада́нне спавяда́цца ў гра-ха́х маіх.

7. Го́спадзі, дай мне пако́рлівасць, цнатлі́васць і паслухмя́насць.

8. Го́спадзі, дай мне цярпе́нне, велікаду́шнасць і лагóднасць.

9. Го́спадзі, усялі́ ў мяне́ ко́рань добра́ — страх Твой — у сэ́рца маё.

10. Го́спадзі, спадо́бі мяне́ любі́ць Цябе́ ўсёю душо́ю маёю і ро́зумам, і выко́нваць ва ўсім во́лю Тваю́.

11. Го́спадзі, ахава́й мяне́ ад ліхі́х[1] людзе́й, і ад дэ́манаў, і ад страсце́й, і ад уся́кае і́ншае ненале́жнае рэ́чы.

12. Го́спадзі, Ты ве́даеш, што ро́біш Ты, як жада́еш, няха́й бу́дзе во́ля Твая́ і ўва мне, грэ́шным, бо Ты благаславёны наве́кі. Амі́нь.

Малітва 8-я, да Госпада нашага Ісуса Хрыста

Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, Сы́не Бо́жы, дзе́ля найпачэ́снейшай Ма́ці Тваёй, і бясплó́тных Тваі́х А́нгелаў, а таксáма Праро́ка, Прадце́чы і Хрысці́целя Твайго́, боганатхнёных апо́сталаў, све́тлых і сла́ўных перамо́гамі му́чанікаў, прападо́бных і багано́сных айцо́ў і па малі́твах усі́х святы́х збаў мяне́ ад цяпе́рашняга напа́ду дэ́манскага. О, Го́спадзі мой і Тво́рца, Ты не хо́чаш сме́рці грэ́шніка, а хо́чаш, каб ён перамяні́ўся і жыў; зрабі́ пераме́ну і ўва

---

[1] Так у грэчаскім тэксце: “πονηρῶν” — “злых”, “ліхіх”.

мне, акаянным і недастойным; вымі мяне з пашчы згубнага змея, гатовага паглынуць мяне і звесці жывым у пекла. О, Госпадзі мой, уцеха мая, Ты дзеля мяне, няшчаснага, у тленную плоць адзеўся, вызвалі мяне з бяды і падай уцеху няшчаснай душы маёй. Натхні сэрца маё выконваць наказы Твае, і пакінуць нядобрыя справы, і атрымаць блажэнства Тваё; на Цябе, Госпадзі, я спадзяюся, таму спасі мяне.

Малітва 9-я, святога Пятра Студзійскага, да Прасвятой Багародзіцы

Да Цябе, Прачыстай Божай Маці, прыпадаючы, я, акаянны, малюся: Ты ведаеш, Царыца, што я безупынна грашу і гняўлю Сына Твайго і Бога майго, і хаця шматразова каюся, але лжывым перад Богам аказваюся, і каюся са страхам: ці не паразіць мяне ўжо Гасподзь, а потым зноў тое самае раблю; ведаючы гэта, Уладычыца мая Спадарыня Багародзіца, малю, каб Ты памілавала, каб умацавала і добрае рабіць каб дапамагла мне. Бо Ты ведаеш, Уладычыца мая Багародзіца, што я цалкам ненавіджу маё ліхія ўчынкі і ўсім разуменнем люблю закон Бога майго; але не ведаю, Спадарыня Прачыстая, чаму я люблю тое, што ненавіджу, а ад добрага адступаю. Не дапускай, Прачыстая, каб мая воля здзяйснялася, бо нягодная яна, а няхай будзе воля Сына Твайго і Бога майго; няхай Ён мя-

нé спасé і настáвіць на рóзум, і дасць благадáць Святóга Дýха, каб ад гэ́тага чáсу я пакíнуў ліхíя справы і далéй жыў па зáпаведзях Сы́на Твайгó, Якóму налéжыць уся́кая слáва, пашáна і ўлáда з Беспачáтным Ягó Айцóм, і Прасвяты́м, і Дóбрым, і Жыватвóрчым Ягó Дýхам цяпéр, і заўсёды, і на вéкі вякóў. Амíнь.

Малітва 10-я, да Прасвятой Багародзіцы

Дóбрага Царá Дóбрая Máці, Прачы́стая і Благаславéнная Багарóдзіца Мары́я, мíласць Сы́на Твайгó і Бóга нáшага пашлí на пакýтную маю́ душý і Твaíмі малíтвамі скірýй мянé на дóбрыя справы, каб астáтні час жыцця́ майгó я пражы́ў беззагáнна і з Тваёю дапамóгаю знайшóў рай, Багарóдзіца Дзéва, адзíная Чы́стая і Благаславéнная.

Малітва 11-я, да святога Ангела ахоўніка

А́нгеле Хрыстóў, ахóўнік мой святы́ і апякýн душы́ і цéла майгó, усё мне прабáч, чым я саграшы́ў у гэ́ты дзень, і ад уся́кае хítрасці вóрага, які́ сýпраць мянé ідзé, збаў мянé, каб нія́кім грахóм не ўгнявíў я Бóга майгó; малíся ж за мянé, грэ́шнага і недастóйнага рабá, каб зрабíць мянé дастóйным дóбрасці і мíласці Усесвятóе Трóіцы, і Máці Гóспада майгó Ісýса Хрыстá, і ўсíх святы́х. Амíнь.

Кандак Багародзіцы

Табе́, найвышэ́йшай Ваяво́дзе, у го́нар перамо́гі мы, зба́ўленыя ад бед рабы́ Тваё, Багаро́дзіца, падзя́ку ўзно́сім; Ты ж, ма́ючы моц непераможную, ад уся́кіх нас бед вызваля́й, каб мы ўскліка́лі да Цябе́: ра́дуйся, Няве́ста, Яка́я засталася Дзе́ваю.

Найслаўне́йшая Вечнадзе́ва, Ма́ці Хрыста́ Бо́га, прынясі́ на́шу малі́тву Сы́ну Твайму́ і Бо́гу на́шаму, каб Ён спас праз Цябе́ ду́шы на́шы.

Усё спадзява́нне маё на Цябе́ ўскладаю, Ма́ці Бо́жая, захава́й мяне́ пад по́крывам Тваі́м.

Багаро́дзіца Дзе́ва, не пагарджа́й мно́ю грэ́шным, які́ патрабу́е Тваёй дапамо́гі і Твайго́ засту́пніцтва, бо на Цябе́ спадзяе́цца душа́ мая́, і памі́луй мяне́.

Малітва святога Іаанікія

Спадзява́нне маё — Айцо́ц, прыста́нішча маё — Сын, по́крыва маё — Дух Святы́; Тро́іца Свята́я, сла́ва Табе́.

Дасто́йна ёсць сапраўды́ ўблажа́ць Цябе́, Багаро́дзіцу, заўжды́ Блажэ́нную і Найчысце́йшую, і Ма́ці Бо́га на́шага. Пачэ́снейшую за Херувімаў і непараўна́льна слаўне́йшую за Серафімаў, што непару́шаную нарадзі́ла Бо́га Сло́ва, І́сную Багаро́дзіцу, Цябе́ велічаем.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Го́спадзі, памі́луй. *(Тройчы).*

Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, Сы́не Бо́жы, дзе́ля малі́тваў Прачы́стае Тваі́ Ма́ці, прападо́бных і багано́сных айцо́ў на́шых і ўсіх святы́х, памі́луй нас. Амі́нь.

Малітва святога Іаана Дамаскіна

Уладару́ Чалавекалю́бны, ці не цяпе́р ужо́ ло́жа гэ́тае мне бу́дзе труно́ю? Ці няшча́сную маю́ душу́ Ты асвятлі́ш яшчэ́ святло́м дня? Вось, труна́ перада мно́ю стаі́ць, вось, смерць чака́е мяне́. Суда́ Твайго́, Го́спадзі, я баю́ся, і му́кі бяскро́нцай, але́ зла рабі́ць не перастаю́: Цябе́, Го́спада Бо́га майго́, я заўжды́ гняўлю́, і Прачы́стую Тваю́ Ма́ці, і ўсе Нябе́сныя сі́лы, і свято́га А́нгела ахо́ўніка майго́. Ве́даю, Го́спадзі, што нява́рты я чалавекалю́бства Твайго́, а ва́рты ўсяля́кага асуджэ́ння і му́кі. Але, Го́спадзі, хачу́ я ці не хачу́ — спасі́ мяне́. Бо калі пра́ведніка Ты спасе́ш, нямá тут нічо́га вялі́кага, і калі чы́стага памі́луеш, нямá нічо́га дзі́ўнага, бо яны́ ва́ртыя мі́ласці Тваёй. А вось на мне, грэ́шным, праяві́ дзі́ўную мі́ласць Тваю́, у гэ́тым пакажы́ чалавекалю́бства Тваё, і няха́й мая́ зага́ннасць не перавы́сіць Тваёй невымо́ўнай до́брасці і міласэ́рнасці, і як Ты хо́чаш, так упара́дкуй жыццё маё.

Потым, кланяючыся да зямлі, кажы:

Кля́няюся Табе́, Прасвята́я Тро́іца, Адзінасу́тная, Жыватво́рчая і Нераздзе́льная, О́йча, і Сы́не, і Святы́ Ду́ху: ве́рую ў Цябе́ і, вызнаючы́, сла́ўлю, дзя́кую,

шану́ю, высо́ка ўзно́шу Цябе́ і малю́: памі́луй мяне́, нягóднага раба́ Твайго́. *(Тройчы. Тры паклоны).*

Кля́няюся Табе́, Прасвята́я Багаро́дзіца; Наро́джаным Табо́ю Ты паказа́ла нам святло́ і́сціннае, Цары́ца не́ба і зямлі́, Надзе́я безнадзе́йных, Памо́чніца нядзу́жым і Хада́йніца за ўсіх грэ́шных. Ты мяне́ ахава́й і абарані́ ад усі́х бед і няста́ч душэ́ўных і цяле́сных, і будзь мне, малю́ся, засту́пніцай усясі́льнымі Тваі́мі малі́твамі. *(Паклон).*

Прасвята́я Улады́чыца Багаро́дзіца, прымі́ гэ́тае мало́е мале́нне і прынясі́ яго́ Сы́ну Твайму́ і Бо́гу на́шаму, каб Ён спас і прасвятлі́ў дзе́ля Цябе́ ду́шы на́шы. *(Паклон).*

Усе нябе́сныя чыны́ — Серафі́мы, Херуві́мы, Праста́лы, Гаспо́дствы, Сі́лы, Ула́ды, Нача́льствы, Архáнгелы і Áнгелы — малі́цеся Бо́гу за мяне́, грэ́шнага; я малю́ся і ўмаля́ю вас. *(Паклон).*

Святы́ вялі́кі Іаа́не, Праро́к, Прадце́ча і Хрысці́целю Гаспо́дні, які́ паку́таваў дзе́ля Хрыста́ і набы́ў адва́гу да Уладара́, памаліся за мяне́, грэ́шнага, каб я спа́сся Тваі́мі малі́твамі. *(Паклон).*

Святы́я Бо́жыя апо́сталы, праро́кі, му́чанікі, свяці́целі, по́снікі, прападо́бныя, пра́ведныя, пустэ́льнікі, чарнары́зцы, патрыя́рхі і ўсе святы́я, які́я паку́тавалі дзе́ля Хрыста́ і набылі́ адва́гу да Уладара́, малі́цеся за мяне́, грэ́шнага, каб я спа́сся ва́шымі малі́твамі. *(Паклон).*

Святы́ Іаа́не Залатаву́сты з Васі́ліем Вялі́кім, Грыго́рыем Багасло́вам і Цудатво́рцам Мікала́ем, і з усімі святы́мі іера́рхамі, памажы́це і памі́луйце мяне́ малі́твамі і засту́пніцтвам ва́шым перад Бо́гам. *(Паклон).*

Святы́я свяці́целі ру́скія Міхаі́ле, Пётра, Аляксі́е, Іо́на, Філі́пе і Ермаге́не са святы́мі цудатво́рцамі і паку́тнікамі, ру́скімі князя́мі Рама́нам і Даві́дам, і са святы́м роўнаапо́стальным кня́зем Уладзі́мірам, малі́це Бо́га за мяне́, грэ́шнага. *(Паклон).*

Свяці́целю Кіры́ле, епі́скапе Ту́раўскі, свяці́целю Гео́ргіе, архіепі́скапе Магілёўскі, прападо́бны Ляо́нціе, архімандры́це Ві́ленскі, прападобнаму́чаніча Афана́сіе, ігу́мене Берасце́йскі, прападо́бная Еўфрасі́ння, ігу́мення По́лацкая, свята́я пра́ведная Юлія-ні́я, князёўна Альша́нская, свята́я пра́ведная Сафі́я, княгі́ня Слу́цкая, святы́ пра́ведны о́йча Іаа́не, прасві́тар Кармя́нскі, святы́ прападобнаму́чаніча Серафі́ме, архімандры́це Жыро́віцкі, і ўсе святы́я зямлі́ Белару́скае, малі́це Бо́га за мяне́, грэ́шнага. *(Паклон).*

Прападо́бныя і багано́сныя айцы́ на́шы Анто́ніе і Феадо́сіе, Яўфі́міе, Феакці́сце, Са́ва, Ану́фрые, Варсано́фіе, Паі́сіе, Па́ўле Про́сты, Марк і ўсе прападо́бныя, малі́це Бо́га за мяне́, грэ́шнага. *(Паклон).*

Усе́ святы́я жанчы́ны — міра но́сіцы, му́чаніцы, прападо́бныя і дзе́вы, які́я Хрысту́ дасто́йна паслужы́лі, са свято́ю вялікаму́чаніцаю Варва́раю, малі́це Бо́га за мяне́, грэ́шнага. *(Паклон).*

Неперамо́жная і Бажэ́ственная сі́ла Пачэ́снага і Жыватво́рнага Крыжа́ Гаспо́дняга, не паки́нь мяне́, грэ́шнага, а сі́лаю тваёю ахава́й мяне́ ад уся́кае спакýсы, душэ́ўнае і цяле́снае. *(Паклон).*

Прачы́стая Улады́чыца Багаро́дзіца, спадзява́нне ўсіх хрысці́ян, пако́лькі і́ншага спадзява́ння і надзе́і нема́ ў мяне́, акрамя́ Цябе́, Найчысце́йшая Улады́чыца мая́ Спада́рыня Багаро́дзіца, Ма́ці Хрыста́, Бо́га майго́: тамý памі́луй і збаў мяне́ ад усі́х бед маі́х і ўмалі́ мі́ласцівага Сы́на Твайго́ і Бо́га майго́, каб Ён памі́лаваў акая́нную душý маю́ і зба́віў мяне́ ад ве́чных мук, і спадо́біў мяне́ Ца́рства Свайго́. *(Паклон).*

Святы́ А́нгеле, ахо́ўнік мой, ахіні́ мяне́ кры́ламі тваёй до́брасці і адгані́ ад мяне́ ўся́кае ліхо́е дэ́манскае ўздзе́янне, і малі́ Бо́га за мяне́, грэ́шнага. *(Паклон).*

Прасвятлі́ во́чы маé, Хрысцé Бо́жа, каб я нікóлі не заснýў смяро́тным сном, каб нікóлі не сказа́ў во́раг мой: я перасі́ліў яго́.

Сла́ва Айцý, і Сы́ну, і Свято́му Дýху.

Застýпнікам душы́ маёй будзь, Бо́жа, бо я хаджý пасяро́д па́стак мно́гіх; вы́звалі мяне́ з іх і спасí мяне́, До́бры, бо Ты Чалавекалю́бны.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вякóў. Амі́нь.

Найслаўне́йшую Бо́жую Маці і свяце́йшую за святы́х А́нгелаў бýдзем нязмóўкла апява́ць сэ́рцам

і вуснамі, вызнаючы Яе Багародзіцай, бо Яна сапраўды нарадзіла нам Бога ўцялесненага і моліцца безупынна за душы нашы.

Перахрысціся і гавары малітву Пачэснаму Крыжу:

Няхай уваскрэсне Бог і рассеюцца ворагі Яго, і няхай бягуць ад аблічча Яго тыя, хто ненавідзіць Яго. Як знікае дым, так няхай знікнуць; як растае воск ад агню, так няхай згінуць дэманы перад абліччам тых, хто любіць Бога і асяняе сябе знамённем Крыжа і радасна прамаўляе: радуйся, Найпачэснейшы і Жыватворны Крыж Гасподні, ты праганяеш дэманаў сілаю на табе распятага Госпада нашага Ісуса Хрыста, Які сышоў у пекла і знішчыў сілу дыявала, і даў нам цябе, Крыж Свой Пачэсны, для прагнання ўсякага супастата. О, Найпачэснейшы і Жыватворны Крыж Гасподні! Дапамагай мне са Святою Спадарыняю Дзеваю Багародзіцаю і з усімі святымі навекі. Амінь.

Або кароткa:

Засцеражы мяне, Госпадзі, сілаю Пачэснага і Жыватворнага Твайго Крыжа і захавай мяне ад усякага зла.

Малітва

Аслаб, адпусці, прабач, Божа, правіны нашы, вольныя і міжвольныя, зробленыя ў словах і ўчынках, свядома і несвядома, удзень і ўначы, розумам і думкаю, — усё нам прабач, як Добры і Чалавекалюбны.

Малітва

Ненавíснікам і крыўдзíцелям на́шым праба́ч, Го́спадзі Чалавекалю́бны. Дабрачы́нцам добро́ ўчыні́. Брата́м і сваяка́м на́шым задаво́ль іх прашэ́нні, яки́я вяду́ць да спасе́ння, і дай ім жыццё ве́чнае. Няду́жых наве́дай і ацале́нне ім дай. Ты́мі, што на мо́ры, кіру́й. Падаро́жным спадаро́жнічай. Праваслáўным хрысція́нам дапамажы́ ў бараць бе́. Тым, хто слу́жыць нам і мíлуе нас, граху́ адпушчэ́нне дай. Тых, што запаве́далі нам, недасто́йным, малíцца за іх, памíлуй па вялíкай Тваёй мíласці. Памяні́, Го́спадзі, ране́й спачы́лых айцо́ў і брато́ў на́шых і ўпако́й іх там, дзе ззя́е святло́ аблíчча Твайго́. Памяні́, Го́спадзі, брато́ў на́шых паланёных і вы́звалі іх ад уся́кае бяды́. Памяні́, Го́спадзі, ахвярада́ўцаў і дабрачы́нцаў у святы́х Тваíх цэ́рквах, задаво́ль іх прашэ́нні, яки́я вяду́ць да спасе́ння, і дай ім жыццё ве́чнае. Памяні́, Го́спадзі, і нас, прыгне́чаных, і грэ́шных, і недасто́йных рабо́ў Тваíх, і прасвятлí наш ро́зум святло́м пазна́ння Цябе́, і скіру́й нас на шлях за́паведзяў Тваíх па малíтвах Прачы́стае Улады́чыцы на́шае Багаро́дзіцы і Вечнадзе́вы Мары́і і ўсíх Тваíх святы́х, бо Ты благаславёны на ве́кі вяко́ў. Амíнь.

Спавяданне грахоў штодзённае

Спавяда́ю Табе́, Го́споду Бо́гу майму́ і Тварцу́, у Свято́й Тро́іцы Адзíнаму, сла́вімаму і пакланя́емаму Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, усе́ маé грахí, якія

зрабíў я ва ўсе дні жыцця́ майго́, і ў ко́жную гадзí-ну, і ў цяпе́рашні час, і ў міну́лыя дні і но́чы, учы́нкам, сло́вам, ду́мкаю, аб'ядзе́ннем, п'я́нствам, тайнаядзе́ннем, пустаслó́ўем, марко́таю, ляно́таю, пярэ́чаннем, непаслухмя́насцю, паклёпамі, асуджэ́ннем, нядба́йнасцю, самалю́бствам, сква́пнасцю, крадзяжа́мі, падма́нам, атрыма́ннем нячы́стых прыбы́ткаў, ха́барніцтвам, хці́васцю, за́йздрасцю, гне́вам, злапа́мятнасцю, няна́вісцю, карысталю́бствам і ўсі́мі маі́мі пачу́ццямі: зро́кам, слы́хам, ню́хам, сма́кам, до́тыкам і і́ншымі маі́мі граха́мі, як душэ́ўнымі, так і цяле́снымі, які́мі я Цябе́, Бо́га майго́ і Тварца́, угнявíў і бліжняга майго́ пакры́ўдзіў; шкаду́ючы аб гэ́тым, я прызнаю́ сябе́ вінава́тым пе́рад Табо́ю, Бо́гам маі́м, і ма́ю жада́нне пака́яцца; то́лькі, Го́спадзі Бо́жа мой, памажы́ мне, са слязьмí пако́рліва малю́ Цябе́; міну́лыя саграшэ́ннi маé міласэ́рнасцю Тваёю праба́ч мне і вы́звалі ад усíх іх, што я вы́казаў пе́рад Табо́ю, бо Ты До́бры і Чалавекалю́бны.

Калі адыходзіш да сну, гавары:

У ру́кі Тваé, Го́спадзі Ісу́се Хрысцé, Бо́жа мой, аддаю́ дух мой. Ты ж мя́нé благаслáві, Ты мянé памíлуй і жыццё вéчнае дай мне. Амíнь.

ПАСХАЛЬНЫЯ ГАДЗІНЫ

Свяшчэннік: Благаславёны Бог наш, заўжды́, цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Або (міранін): Па малі́твах святы́х айцо́ў на́шых, Го́споддзі Ісу́се Хрысце́, Бо́жа наш, памі́луй нас.

Пеўчыя: Амі́нь.

Хрысто́с уваскрэ́с з мёртвых,/ сме́рцю смерць растапта́ў,/ і тым, што ў магі́лах, жыццё дарава́ў. *(Тройчы).*

Уваскрасенне Хрыстова, глас 6

Уваскрасе́нне Хрысто́ва ба́чыўшы,/ паклоні́мся Свято́му Го́споду Ісу́су,/ адзі́наму бязгрэ́шнаму./ Крыжу́ Твайму́ пакланя́емся, Хрысце́,/ і свято́е Уваскрасе́нне Тваё апява́ем і сла́вім./ Бо Ты Бог наш,/ і́ншага акрамя́ Цябе́ не зна́ем,/ імя́ Тваё прызыва́ем./ Прыйдзі́це, усе́ ве́рныя,/ паклоні́мся свято́му Хрысто́ву Уваскрасе́нню,/ бо вось праз Крыж прыйшла́ ра́дасць усяму́ све́ту./ Заўжды́ благаслаўля́ючы Го́спада,/ мы апява́ем Уваскрасе́нне Яго́,/ бо, перацярпе́ўшы распя́цце,/ Ён сме́рцю зні́шчыў смерць. *(Тройчы).*

Іпакаі, глас 4

Прыйшо́ўшы да світа́ння і знайшо́ўшы ка́мень адва́леным ад магі́лы, ты́я, што былі́ з Мары́яй, пачу́лі ад А́нгела: чаму́ вы шука́еце сяро́д мёртвых, як чалаве́ка, Таго́, Хто ў святле́ ве́чным жыве́? Паглядзі́це на пахава́льныя пало́тны; ідзі́це і све́ту абвясці́це, што паўста́ў Госпо́дзь, умярцві́ўшы смерць, бо ён — Сын Бо́га, Які́ спаса́е род чалаве́чы.

Кандак, глас 8

Хоць і ў магі́лу сышо́ў Ты, Бессмяро́тны, але́ пяке́льную зні́шчыў сі́лу і ўваскрэ́с як перамо́жца, Хрысце́ Бо́жа, жанчы́нам-мірано́сіцам сказа́ўшы: “Ра́дуйцеся!”, і Тваі́м апо́сталам мір дару́ючы, а па́ўшым даючы́ ўваскрасе́нне.

Трапар, глас 8

У гро́бе пло́ццю, у пе́кле ж з душо́ю як Бог, у ра́і ж з разбо́йнікам і на прасто́ле быў Ты, Хрысце́, з Айцо́м і Ду́хам, усё напаўня́ючы, Неапіса́льны.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Як жыванó́сны, як прыгажэ́йшы за рай, сапраўды́ і за ўся́кі хо́рам ца́рскі святле́йшым яві́ўся нам, Хрысце́, гроб Твой, крыні́ца на́шага ўваскрасе́ння.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Ра́дуйся, асвячо́нае Бажэ́ственнае насе́лішча Усявы́шняга, бо праз Цябе́, Багаро́дзіца, да́дзена

ра́дасць тым, што ўскліка́юць: благаславе́ная Ты сярод жанчы́н, Усебеззага́нная Улады́чыца.

Го́спадзі, памі́луй. *(40 разоў).*

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Пачэ́снейшую за Херувімаў і непараўна́льна слаўне́йшую за Серафімаў, што непару́шанаю нарадзі́ла Бо́га Сло́ва, І́сную Багаро́дзіцу Цябе́ велічаем.

І́менем Госпо́днім благаславі́, о́йча.

Свяшчэннік: Па малі́твах святы́х айцо́ў на́шых, Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, Бо́жа наш, памі́луй нас.

Пеўчыя: Амі́нь. Хрысто́с уваскрэ́с з мёртвых, сме́рцю смерць растапта́ў, і тым, што ў магі́лах, жыццё дараваў. *(Тройчы).*

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Го́спадзі, памі́луй. *(Тройчы).* Благаславі́.

Свяшчэннік: Уваскрэ́слы з мёртвых Хрысто́с, і́сцінны Бог наш, па малі́твах Прачы́стае Сваі́ Ма́ці, прападо́бных і багано́сных айцо́ў на́шых, і ўсіх святы́х, няха́й памі́луе і спасе́ нас, бо Ён до́бры і чалавекалю́бны.

Пеўчыя: Амі́нь.

ПАСХАЛЬНЫ КАНОН

Глас 1

Песня 1

Ірмос: Уваскрасе́ння дзень! Прасвятлі́мся, лю́дзі! Па́сха! Гаспо́дняя Па́сха! Бо ад сме́рці да жыццця́ і ад зямлі́ да не́ба ХрыстО́с Бог перавёў нас, якія пе́сню перамо́гі спява́юць.

ХрыстО́с уваскрэ́с з мёртвых.

Ачы́сцім пачу́цці — і мы ўба́чым Хрыста́, Які́ ззя́е непрыступ́ным святло́м уваскрасе́ння, пачу́ем жа я́сна ад Яго́ “Ра́дуйцеся!”, пе́сню перамо́гі спява́ючы.

ХрыстО́с уваскрэ́с з мёртвых.

Нябёсы дастО́йна няха́й весяля́цца, і зямля́ няха́й ра́дуецца, і няха́й святку́е ўвесь свет, ба́чны і нябе́сны, бо паўста́ў ХрыстО́с — ра́дасць ве́чная.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і СвятО́му Ду́ху.

Сме́рці зако́н зрама́ла Ты, Дзе́ва найбеззага́нейшая, нарадзі́ўшы ве́чнае жыццё — Хрыста́, Які́ з магі́лы сёння заззя́ў і свет прасвятлі́ў.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Уба́чыўшы ўваскрэ́слым Сы́на Твайго́ і Бо́га, ра́дуйся з апо́сталамі, Богаблагада́тная Чы́стая, Ты і пе́ршая пачу́ла “Ра́дуйся!”, як віно́ўніца ра́дасці для ўсіх, Багама́ці найбеззага́ннейшая.

Песня 3

Ірмос: Прыйдзі́це, бу́дзем піць пітво́ но́вае, не з бясплодна́га ка́меню цудо́ўна я́ўленае, а бяссме́рця крыні́цу, вы́ведзеную з магі́лы Хрысто́м, у Які́м мы ўмацо́ўваемся.

Хрысто́с уваскрэ́с з мёртвых.

Цяпе́р усё напо́ўнілася святло́м — і не́ба, і зямля́, і прадо́нне, няха́й жа ўсё ство́ранае святку́е паўста́нне Хрыста́, у Які́м яно́ ўмацо́ўваецца.

Хрысто́с уваскрэ́с з мёртвых.

Учо́ра быў я пахава́ны з Табо́ю, Хрысце́, — сёння паўстаю́ з Табо́ю ўваскрэ́слым. Распя́ты быў я з Табо́ю ўчо́ра — праслаў жа мяне́ з Табо́ю Ты Сам, Спасі́целю, у Ца́рстве Тваі́м.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Да несмяро́тнага жыцця́ я прыхо́джу сёння па до́брасці наро́джанага Табо́ю, Чы́стая, Які́ ўсе канцы́ святло́м азары́ў.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Бо́га, Яко́га Ты нарадзі́ла па пло́ці, Чы́стая, уба́чыўшы ўваскрэ́слым — як Ён і каза́ў — з мёртвых, весялі́ся і Яго́ як Бо́га, Прачы́стая, узвялі́чвай.

Ірмас, глас 4

Прыйшо́ўшы да світа́ння і знайшо́ўшы ка́мень адва́леным ад магі́лы, ты́я, што былі́ з Мары́яй, пачу́лі ад А́нгела: чаму́ вы шука́еце сяро́д мёртвых, як чалаве́ка, Таго́, Хто ў святле́ ве́чным жыве́? Паглядзі́це на пахава́льныя пало́тны; ідзі́це і све́ту абвясці́це, што паўста́ў Гаспо́дзь, умярцві́ўшы смерць, бо Ён — Сын Бо́га, Які́ спаса́е род чалаве́чы.

Песня 4

Ірмос: На Бажэ́ственнай ва́рце боганатхнёны Аўвакум няха́й ста́не з на́мі і пака́жа светлано́снага А́нгела, які́ го́ласна[1] ка́жа: “Сёння спасе́нне для све́ту, бо ўваскрэ́с Хрысто́с як усемагу́тны”.

Хрысто́с уваскрэ́с з мёртвых.

Як першаро́днае Дзіця́ мужчы́нскага по́лу, наро́джанае ад Дзе́вы, з’явіўся Хрысто́с; бу́дучы ядо́мым[2], Ён называ́ецца А́гнцам; Ён беззага́нны, бо во́льны ад нечыстаты́, на́ша Па́сха; а як Бог і́сцінны — даскана́лым называ́ецца.

Хрысто́с уваскрэ́с з мёртвых.

Благаславе́нны наш вяне́ц — Хрысто́с, як адна-гадо́вы А́гнец, дабрабо́льна за ўсіх быў прыне́сены

---

[1] Грэчаскае слова “διαπροσίως” царкоўнаславянскі тэкст перакладае “ясно”, але яно значыць “голасна”, “пранізліва” *(заўвага перакладчыка)*.

[2] Царкоўнаславянскі тэкст “яко человек же” недакладны, бо ў грэчаскім тэксце не “βροτός” — “чалавек”, а “βρωτός” — “ядомы” *(заўвага перакладчыка)*.

ў ахвя́ру, Па́сха ачышча́льная, і зноў з магі́лы нам заззя́ў Ён, прыго́жае Со́нца пра́ўды.

Хрысто́с уваскрэ́с з мёртвых.

Богаайце́ц Давід пе́рад правобразным каўчэ́гам скака́ў ра́дуючыся; а мы, святы́ наро́д Бо́жы, здзяйсне́нне правобразаў ба́чачы, дава́йце весяліцца боганатхнёна, бо ўваскрэ́с Хрысто́с як усемагу́тны.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Той, Хто стварыў Ада́ма, Твайго́ праайца́, Чы́стая, утвара́ецца ад Цябе́, і Ён сёння Сваёю сме́рцю разбурыў жыллё сме́рці, і азарыў усё Бажэ́ственным святло́м уваскрасе́ння.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Наро́джанага Табо́ю Хрыста́, Які́ цудо́ўна заззя́ў з мёртвых, Чы́стая, сёння для спасе́ння ўсіх, до́брая і беззага́нная сяро́д жанчы́н, і прыго́жая, ба́чачы, праслаўля́й Яго́, ра́дуючыся з апо́сталамі.

Песня 5

Ірмос: Уста́ньма ра́на на світа́нні і заме́ст мі́ра пе́сню прынясе́м Уладару́. І мы ўба́чым Хрыста́ — Со́нца пра́ўды, Яко́е ўсім жыццё выпраме́ньвае.

Хрысто́с уваскрэ́с з мёртвых.

Звя́заныя кайдана́мі пяке́льнымі, ба́чачы Тваю́ бязме́рную міласэ́рнасць, Хрысце́, да святла́ ру́шылі ра́даснымі нага́мі, усхваля́ючы Па́сху ве́чную.

Хрыстóс уваскрэ́с з мёртвых.

Са свяцíльнямі ў рукáх пóйдзем насýстрач Хрыстýю, Якí выхóдзіць з магíлы, пóйдзем нíбы насýстрач жаніхýі і рáзам з рáдаснымі чынáмі Áнгелаў святкýймa Пáсху Бóжую спасíцельную.

Слáва Айцý, і Сы́ну, і Святóму Дýху.

Прасвятля́ецца Бажэ́ственнымі і жыванóснымі прóмнямі ўваскрасéння Сы́на Свайгó Багамáці Прачы́стая, і рáдасцю напаўня́ецца сход набóжных.

І цяпéр, і заўсёды, і на вéкі вякóў. Амíнь.

Не расчынíў Ты дзвярэ́й дзявóцтва пры ўцялéсненні, не парýшыў пячáцяў магíлы, Царý стварэ́ння; адтýль уваскрэ́слым Цябé бáчачы, Máці рáдавалася.

Песня 6

Ірмос: Ты сышóў у прадóнне зямлí і знíшчыў запóры вéчныя, што трымáлі вя́зняў, Хрысцé, а на трэ́ці дзень, як з кітá Іóна, Ты ўваскрэ́с з магíлы.

Хрыстóс уваскрэ́с з мёртвых.

Ты, Хрысцé, Якí не пашкóдзіў ключóў Дзéвы[1] пры нараджэ́ннí Тваíм, уваскрэ́с з магíлы, захавáўшы цэ́лымі яé пячáці, і адчынíў нам рáйскія дзвéры.

Хрыстóс уваскрэ́с з мёртвых.

---

[1] Ключы Дзевы — вобразны выраз, які азначае “замкнёнае” ўлонне Прасвятой Дзевы, дзявоцкасць *(заўвага перакладчыка).*

Спасíцелю мой, жывáя і неўмірýчая Ахвя́ра! Прынёсшы Сябé як Бог дабравóльна ў ахвя́ру Айцý, Ты ўваскрасíў з Сабóю ўсеагýльнага роданача́льніка Адáма, уваскрэ́сшы з магíлы.

Слáва Айцý, і Сы́ну, і Святóму Дýху.

Тóе, што ранéй былó ва ўлáдзе смéрці і тлéння, узвéдзена Уцялéсненым з Твайгó найчысцéйшага ўлóння да нятлéннага і вéчнага жыцця́, Багарóдзіца Дзéва.

І цяпéр, і заўсёды, і на вéкі вякóў. Амíнь.

Той, хто сышóў быў ва ўлóнне Тваё, Чы́стая, і ўсялíўся, і ўцялéснíўся недастýпна для рóзуму, цяпéр сышóў у прадóнне зямлí і падня́ў з Сабóю Адáма, уваскрэ́сшы з магíлы.

Кандак, глас 8

Хоць і ў магíлу сышóў Ты, Бессмяротны, алé пякéльную знíшчыў сілу, і ўваскрэ́с як перамóжца, Хрысцé Бóжа, жанчы́нам-міранóсіцам сказáўшы: “Рáдуйцеся!”, і Тваíм апóсталам мір дарýючы, а пáўшым даючы́ ўваскрасéнне.

Ікас

Міранóсіцы дзéвы яшчэ́ да наступлéння рáніцы шукáлі, як дзённае святлó, Тóе Сóнца, што існавáла раней за Сóнца і зайшлó аднóйчы ў магíлу, і яны́ адна́ да аднóй казáлі: “Сяброýкі, пóйдзем памáжам

духмя́насцямі це́ла жывано́снае і пахава́нае — ту́ю плоць, яка́я падыма́е па́ўшага Ада́ма і яка́я ляжы́ць у магі́ле. По́йдзем, паспяша́емся, як мудрацы́, пакло́німся і прынясе́м мі́ра як дары́ не пялёнкамі, а плашчані́цаю Абві́таму; бу́дзем пла́каць і ўскліка́ць: паўста́нь, Уладару́, Ты, Які́ па́ўшым дае́ш уваскрасе́нне".

Песня 7

Ірмос: Той, хто дзяце́й вы́зваліў з пе́чы, ста́ўшы чалаве́кам, паку́туе, як смяро́тны, і паку́тамі апрана́е смяро́тнае ў хараство́ нятле́ння — Адзі́ны Бог айцо́ў, благаславёны і найбо́льш прасла́ўлены.

Хрысто́с уваскрэ́с з мёртвых.

Багаму́дрыя жанчы́ны ўслед Табе́ імкну́ліся з духмя́насцямі. Але Каго́ яны́ шука́лі са слязьмі́ як мёртвага, Таму́ пакланіліся з ра́дасцю як Жыво́му Бо́гу і Па́сху таямні́чую Тваі́м, Хрысце́, ву́чням абвясці́лі.

Хрысто́с уваскрэ́с з мёртвых.

Сме́рці святку́ем мы ўмярцве́нне, пе́кла разбурэ́нне, пача́так і́ншага — ве́чнага жыцця́, і ў захапле́нні апява́ем Віно́ўніка — Адзі́нага Бо́га айцо́ў, благаславёнага і найбо́льш прасла́ўленага.

Хрысто́с уваскрэ́с з мёртвых.

Сапраўды́ свяшчэ́нная і са́мая ўрачы́стая гэ́тая спасі́цельная і прамяні́стая ноч, светлано́снага дня

ўваскрасе́ння прадве́сніца, бо ў ёй ве́чнае Святло́ ў пло́ці для ўсіх заззя́ла з магі́лы.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Сёння Сын Твой смерць умярцві́ў, Усебеззага́нная, і ўсім смяро́тным дарава́ў жыццё, яко́е до́ўжыцца на ве́кі вяко́ў. Ён, Адзі́ны Бог айцо́ў, благаславё-ны і найбо́льш праслаўле́ны.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вякоў. Амі́нь.

Цар усяго́ стварэ́ння, ста́ўшы чалаве́кам, усялі́ўся ў Тваё, Богаблагада́тная, уло́нне, і, зве́даўшы распя́цце і смерць, уваскрэ́с, як уласці́ва Бо́гу, узня́ўшы з Сабо́ю нас як усемагу́тны.

Песня 8

Ірмос: Гэ́ты выда́тны і святы́ дзень, пе́ршы пасля́ суббо́ты, ве́лічны і галло́ўны[1], — свя́та над свя́тамі і ўрачы́стасць над урачы́стасцямі, у гэ́ты дзень мы благаслаўля́ем Хрыста́ наве́кі.

Хрысто́с уваскрэ́с з мёртвых.

Прыйдзі́це ў сла́ўны дзень уваскрасе́ння паспыта́ем но́вага вінагра́днага пло́ду і ста́нем удзе́льнікамі Бажэ́ственнай ра́дасці ў Ца́рстве Хрыста́, апява́ючы Яго́ як Бо́га наве́кі.

---

[1] У царкоўнаславянскім тэксце гэтага ірмоса словы “царь и господь” адносяцца не да Спасіцеля, а да дня, што выразна бачна ў тэксце арыгіналу, дзе яны стаяць у жаночым родзе — “ἡ βατῆτιλὶς καὶκυρία”, паколькі слова “дзень” у грэчаскай мове жаночага роду — “ἡ ἡμέρα” *(заўвага перакладчыка).*

Хрыстóс уваскрэ́с з мёртвых.

Агляні́ся навóкал, Сіёне, і пабáч: вось прыйшлí да цябé, нíбы запáленыя Бóгам зóркі, з зáхаду, і з пóўначы, і з мóра, і з усхóду дзéці твае́, якíя благаслаўля́юць у табé Хрыстá навéкі.

Прасвятáя Трóіца, Бóжа наш, слáва Табé.

Óйча Уседзяржы́целю, і Слóва, і Дýху, Адзí-ная Сýтнасць у трох Асóбах, Найвышэ́йшая і Най-бажэ́ственнейшая! У Цябé мы ахрысці́ліся і Цябé благаслаўля́ем на ўсе вякí.

Слáва Айцý, і Сы́ну, і Святóму Дýху.

Праз Цябé прыйшóў у свет Гаспóдзь, Дзéва Бага-рóдзіца; Ён, разарвáўшы нéтры пякéльныя, нам, смяро́тным, даў уваскрасéнне, тамý мы благаслаўля́ем Ягó навéкі.

І цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў. Амíнь.

Твой Сын, Дзéва, звéргнуўшы Сваім уваскрасéннем усю́ ўлáду смéрці, як Бог мóцны, узнёс з Сабóю і нас і абагавíў, тамý мы апявáем Ягó навéкі.

Песня 9

Велічáе душá мая́ ўваскрэ́слага на трэ́ці дзень з магíлы Хрыстá Жыццядáцеля.

Велічáе душá мая́ Тагó, Хто дабравóльна пакýтаваў, і быў пахавáны, і ўваскрэ́с на трэ́ці дзень з магíлы.

Ірмос: Свяці́ся, свяці́ся, но́вы Іерусалі́ме, бо сла́ва Госпо́дняя азары́ла цябе́! Святку́й цяпе́р і весялі́ся, Сіёне! А Ты, Чы́стая Багаро́дзіца, ра́дуйся ўваскрасе́нню Наро́джанага Табо́ю.

Хрысто́с — но́вая Па́сха, Ахвя́ра жыва́я, А́гнец Бо́жы, Які́ бярэ́ на Сябе́ грахі́ све́ту.

А́нгел усклі́ка́ў да Благада́тнай: "Чы́стая Дзе́ва, ра́дуйся!" І я паўтару́: ра́дуйся! Твой Сын уваскрэ́с на трэ́ці дзень з магі́лы і мёртвых уваскрасі́ў. Лю́дзі, весялі́цеся!

Засну́ўшы, Ты абудзі́ў па-ца́рску магу́тным го́ласам, як леў, нашча́дак Іу́ды, памёрлых адве́ку.

Яко́е цудо́ўнае, яко́е дарагое́, яко́е сало́дкае сло́ва Тваё! Ты цвёрда абяца́ў з на́мі быць да сканчэ́ння ве́ку, Хрысце́. Ма́ючы гэ́та падста́ваю надзе́і, мы, ве́рныя, ра́дуемся.

Мары́я Магдалі́на прыбе́гла да магі́лы і, уба́чыўшы Хрыста́, ста́ла пыта́ць Яго́, прыня́ўшы за садо́ўніка.

Зіхатлі́вы А́нгел усклі́ка́ў да жанчы́н: перастане́ньце пла́каць, бо Хрысто́с уваскрэ́с.

Хрысто́с уваскрэ́с, растапта́ўшы смерць і падня́ўшы мёртвых. Лю́дзі, весялі́цеся.

Сёння ўсё стварэ́нне весялі́цца і ра́дуецца, бо Хрысто́с уваскрэ́с і пе́кла перамо́жана.

Сёння Улада́р палані́ў пе́кла, вы́звалі́ўшы вя́зняў, які́я адве́ку там бязлі́тасна ўтры́мліваліся.

О, Па́сха вялі́кая і найсвяшчэ́ннейшая — Хрысце́! О, Му́драсць, і Сло́ва Бо́жае, і Сі́ла! Дай нам цяснёй злуча́цца з Табо́ю ў ве́чна све́тлы дзень Ца́рства Твайго́.

Велічáе душá мая́ ў трох Асóбах нераздзе́льнага Бажаствá сíлу.

Мы, ве́рныя, Цябе́, Дзе́ва, аднаду́шна ўблажа́ем: ра́дуйся, Дзве́ры Госпо́днія; ра́дуйся, Го́радзе адушаўлёны; ра́дуйся, Та́я, дзе́ля Яко́й нам заззя́ла святло́ ўваскрасе́ння з мёртвых Наро́джанага Табо́ю.

Ра́дуйся, Дзе́ва, ра́дуйся; ра́дуйся, Благаславе́нная, ра́дуйся, Найслаўне́йшая, бо Твой Сын уваскрэ́с на трэці дзень з магíлы.

Весялíся і ра́дуйся, Ты — Бажэ́ственныя Дзве́ры Святла́, бо Ісу́с, Які́ сышо́ў у магíлу, узня́ўся і заззя́ў ярчэ́й за со́нца і ўсіх ве́рных азары́ў, Бо́гам абра́даваная Улады́чыца.

Эксапасціла́рый

Пло́ццю засну́ўшы, як мёртвы, Ты, Цару́ і Го́спадзі, на трэ́ці дзень уваскрэ́с, узня́ўшы з тле́ння Ада́ма і зні́шчыўшы смерць. Па́сха нятле́ння, све́ту спасе́нне. *(Тройчы).*

Пра падрыхтоўку да Прычашчэння Святых Тайн Хрыстовых

Найвышэйшай мэтай зямного жыцця хрысціяніна з'яўляецца спасенне, гэта значыць вызваленне з-пад улады граху, духоўнае абнаўленне і вечнае блажэнства. Спасенне дасягаецца толькі праз наша цеснае яднанне з Хрыстом у створанай Ім Царкве. Сам Гасподзь навучае пра гэта так: "Як галіна не можа прыносіць плоду сама па сабе, калі не будзе на лазе, так і вы, калі ўва Мне не будзеце. Я — вінаградная Лаза, вы — галіны; хто знаходзіцца ўва Мне, а Я ў ім, той прыносіць многа плоду, бо без Мяне не можаце рабіць нічога" (Ін. 15, 4–5).

Самым дасканалым спосабам злучэння з Хрыстом з'яўляецца Таінства Прычашчэння.

Таінства Прычашчэння, або Еўхарыстыю (з грэч. — падзяка), устанавіў Сам Гасподзь наш Ісус Хрыстос напярэдадні Сваіх пакут на крыжы ў час апошняй вячэры са Сваімі вучнямі, таму і вячэра гэтая ў царкоўнай традыцыі называецца Тайнай Вячэрай.

Гасподзь Ісус узяў хлеб, благаславіў яго, пераламіў і, раздаючы вучням, сказаў: "Прыміце, ежце: гэта Цела Маё". І, узяўшы чашу з віном, узнёс падзяку, потым

падаў ім і сказаў: “Піце з яе ўсе, бо гэта Кроў Мая новага запавету, якая за многіх праліваецца дзеля адпушчэння грахоў” (Мф. 26, 26–28). “Рабіце гэта на ўспамін пра Мяне” (Лк. 22, 19).

Таінства Прычашчэння запальвае ў нас Хрыстову любоў, узносіць да Бога сэрца, нараджае ў ім дабрадзейнасці, стрымлівае напады на нас дэманаў, дае нам сілы супрацьстаяць спакусам, ацаляе душу і цела. Прычашчаючыся Святых Хрыстовых Тайн, мы прымаем у сябе Бажэственнае жыццё, становімся супольнікамі Бажэственнай прыроды (2 Пят. 1, 4). Ніякім іншым спосабам так цесна злучыцца з Хрыстом немагчыма, таму Прычашчэнне Цела і Крыві Хрыстовых — адна з неабходных умоў нашага спасення. “Калі не будзеце есці Плоці Сына Чалавечага і піць Крыві Яго, то жыцця не будзеце мець у сабе, — папярэджвае нас Гасподзь. — Хто есць Маю Плоць і п’е Маю Кроў, той мае жыццё вечнае, і Я ўваскрашу яго ў апошні дзень… Хто есць Маю Плоць і п’е Маю Кроў, той ува Мне застаецца і Я ў ім” (Ін. 6, 53–54, 56).

Усведамляючы вялікае спасіцельнае значэнне Таінства Прычашчэння, кожнаму праваслаўнаму хрысціяніну трэба імкнуцца як мага часцей прыступаць да яго. Тым хрысціянам, якія не прапускаюць царкоўных богаслужэнняў у суботу ўвечары і ў нядзелю раніцай і выконваюць усе ўстаноўленыя Святою Царквою пасты, рэкамендуецца прычашчацца не радзей аднаго разу ў месяц, астатнім — ва ўсе чатыры пасты: Вялікі, Пятроў, Успенскі і Раждэственскі. Прычашчаюцца таксама ў дзень Ангела (на імяніны) і ў дзень нараджэння. Частату прычашчэння Святых

Тайн веруючыя ўдакладняюць са сваім духаўніком і робяць гэта па яго благаславенню.

Каб прыступіць да Святога Прычашчэння, трэба найперш вераваць, што Ісус Хрыстос — гэта сапраўды Сын Божы, другая Асоба Прасвятой Троіцы, і што Ён прыйшоў на зямлю, каб спасці грэшнікаў, у тым ліку і кожнага з нас. Неабходна таксама вера ў тое, што ў Таінстве Еўхарыстыі мы прымаем пад выглядам хлеба ісціннае Цела Хрыстова, а пад выглядам віна — ісцінную Кроў Спасіцеля.

Да Святога Прычашчэння нельга прыступаць без падрыхтоўкі. Святы апостал Павел перасцерагае: “Хто будзе есці хлеб гэты або піць чашу Гасподнюю недастойна, вінаваты будзе перад Целам і Крывёй Гасподняй. Няхай жа выпрабоўвае сябе чалавек і тады няхай есць хлеб гэты і п’е з чашы гэтай. Бо хто есць і п’е недастойна, той есць і п’е ў асуджэнне сабе, не разважаючы пра Цела Гасподняе” (1 Кар. 11, 27–29).

Падрыхтоўка да Святога Прычашчэння (у царкоўнай практыцы яна называецца гавеннем) можа працягвацца ад аднаго дня да цэлага тыдня, у залежнасці ад стану здароўя, узросту, ступені царкоўнасці і малітвенага вопыту хрысціяніна. Усё гэта ўлічвае духаўнік і вызначае тэрмін гавення. У час гавення прадпісваецца ўстрыманне і пост. У дні посту не ўжываецца ежа жывёльнага паходжання — мяса, малако, яйкі, а калі пост строгі, то і рыба. Розум не павінен рассейвацца з-за дробязей і шукаць забаў. У дні гавення трэба наведваць богаслужэнні ў храме, калі дазваляюць абставіны, і больш старанна выконваць дамашняе малітвенае правіла.

Напярэдадні прычашчэння трэба абавязкова быць на вячэрнім богаслужэнні, а перад ім або пасля яго прачытаць Канон пакаянны да Госпада нашага Ісуса Хрыста, Канон малебны да Прасвятой Багародзіцы і Канон Ангелу ахоўніку. Акрамя вячэрніх і ранішніх малітваў абавязкова чытаецца Паследаванне да Святога Прычашчэння (увечары або раніцай). З наступленнем поўначы нічога нельга ні есці, ні піць (гэта таксама датычыць і курэння, якое само па сабе з'яўляецца грахом), бо належыць прыступаць да Святога Прычашчэння нашча. Напярэдадні прычашчэння не павінна быць інтымнай блізкасці.

Перад прычашчэннем неабходна споведзь. Калі ў храме праводзіцца споведзь увечары, напярэдадні Бажэственнай Літургіі, то лепш паспавядацца напярэдадні, але можна і раніцай, перад Бажэственнай Літургіяй.

Вельмі важна перад прычашчэннем Святых Тайн Хрыстовых прабачыць усім, хто нас пакрыўдзіў. У стане злосці або варожасці супраць каго-небудзь прычашчацца ні ў якім разе нельга.

Устаўшы раніцай, трэба ўмыцца і пачысціць зубы. Прыйсці ў храм трэба да пачатку чытання гадзін. Пры вынасе Святых Дароў усе вернікі робяць паклон. Ён паўтараецца, калі свяшчэннік закончыць чытаць малітву "Верую, Госпадзі, і вызнаю..." Падыходзіць да Святой Чашы прычаснікі павінны паступова, не штурхаючыся і не стараючыся апярэдзіць адзін аднаго. Падыходзячы да Святой Чашы, трэба скласці накрыж рукі на грудзях (правую на левую). Прыняўшы вуснамі з лжыцы (з лыжачкі, якою прычашчаюць) Святыя

Дары, прычаснік павінен пацалаваць ніжні край Святой Чашы, прыгадваючы сабе, як пасля распяцця Хрыста адзін з воінаў кап'ём працяў Яму бок, з якога выцекла кроў і вада. Адышоўшы ад Святой Чашы, трэба зрабіць паясны паклон і прайсці да століка з цеплатой, якой запіваецца Святое Прычасце, каб ніякая дробная часцінка не засталася ў роце.

Пасля Бажэственнай Літургіі ўсе прысутныя цалуюць Святы Крыж, якім свяшчэннік благаслаўляе вернікаў.

Паводле царкоўнага звычаю, праваслаўныя дзеці да сямігадовага ўзросту могуць прычашчацца вельмі часта, г.зн. на кожнай Літургіі, на якой яны прысутнічаюць, прытым без папярэдняй споведзі і посту. З самага ранняга ўзросту дзецям трэба расказваць пра Госпада Ісуса Хрыста і Яго любоў да людзей, вучыць дзяцей маліцца. Пачынаючы з 5–6 гадоў, а па магчымасці і раней, трэба прывучаць дзяцей прычашчацца нашча.

Прычашчэнне на Пасху і на пасхальным тыдні

Паводле 66 правіла VI Усяленскага сабора, праваслаўныя хрысціяне, пачынаючы "ад святога дня Уваскрасення Хрыста, Бога нашага", г.зн. з першага дня Пасхі, "да нядзелі новай", г.зн. да Фаміной нядзелі, "на працягу ўсяго тыдня… павінны ў святых цэрквах пастаянна практыкавацца ў псалмах, і спевах, і песнях духоўных, радуючыся і святкуючы ў Хрысце, і чытанне Бажэственных Пісанняў уважліва слухаючы, і ад Святых Тайн атрымліваючы асалоду".

Такім чынам, гэты царкоўны канон прадпісвае нам на працягу ўсяго пасхальнага тыдня прымаць удзел у царкоўных богаслужэннях і прычашчацца Святых Хрыстовых Тайн.

На пасхальным тыдні посту няма, але гэта не значыць, што падрыхтоўка да Прычашчэння адмяняецца. Прычашчацца на Пасху і на пасхальным тыдні могуць толькі тыя праваслаўныя хрысціяне, якія пасцілі ў Вялікі пост, таму што 69-е апостальскае правіла пагражае адлучэннем ад Царквы тым хрысціянам, якія не посцяць у Вялікі пост, а таксама ў сераду і пятніцу.

Рыхтуючыся да Прычашчэння ў пасхальную ноч, трэба наведваць богаслужэнні Страснога тыдня, у Вялікую Пятніцу або ў Вялікую Суботу паспавядацца і прачытаць напярэдадні пасхальнай ночы ўказаныя вышэй тры каноны (Пакаянны, Малебны, Ангелу ахоўніку) і Паследаванне да Святога Прычашчэння. У храме трэба быць перад пачаткам пасхальнай паўночніцы.

Рыхтуючыся да Прычашчэння ў адзін з дзён Светлага (пасхальнага) тыдня, напярэдадні трэба быць на вячэрнім богаслужэнні. Замест указаных вышэй трох канонаў чытаецца толькі адзін канон — Пасхальны. Замест вячэрніх і ранішніх малітваў на Светлым тыдні чытаюцца пасхальныя гадзіны. Паследаванне да Святога Прычашчэння пачынаем чытаць з пасхальнага трапара (тройчы) і потым чытаем адразу канон, апускаючы трысвятое і псалмы, а пасля канона — адразу: “Калі хочаш, чалавек, есці Цела Уладара…” і ўсе малітвы да канца.

КАНОН ПАКАЯННЫ
ДА ГОСПАДА НАШАГА ІІСУСА ХРЫСТА

Глас 6

Песня 1

Ірмос: Ні́бы па су́шы прайшо́ўшы па бе́здані нага́мі і ба́чачы, як то́не ганіцель-фарао́н, Ізра́іль усклі́ка́ў: запяе́м Бо́гу пе́сню перамо́гі.

Памі́луй мяне́, Бо́жа, памі́луй мяне́.

Цяпе́р прыступі́ў я, грэ́шны і абцяжа́раны, да Цябе́, Уладара́ і Бо́га майго́; але́ не сме́ю глядзе́ць на не́ба, то́лькі малю́ся, ка́жучы: дай мне, Го́спадзі, ро́зум, каб учы́нкі свае́ я апла́каў го́рка.

Памі́луй мяне́, Бо́жа, памі́луй мяне́.

О, го́ра мне, грэ́шнаму! Бо́льш за ўсіх людзе́й акая́нны я, пакая́ння ня́ма ўва мне; дай мне, Го́спадзі, слёзы, каб учы́нкі свае́ я апла́каў го́рка.

Сла́ва Айцу, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Неразу́мны, акая́нны чалаве́к, у ляно́це ты час марну́еш; паду́май пра жыццё тваё, і звярні́ся да Госпада Бо́га, і апла́квай учы́нкі свае́ го́рка.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Маці Бо́жая Прачы́стая, глянь на мяне́, грэ́шнага, і ад па́сткі дыя́вала збаў мяне́, і на шлях пакая́ння скіру́й мяне́, каб учы́нкі сваé я апла́каў го́рка!

Песня 3

Ірмос: Го́спадзі, нямá такóга святóга, як Ты, Бо́жа мой, Які́ ўзвы́сіў го́днасць ве́руючых у Цябе́, До́бры, і ўмацава́ў нас на ка́мені запаве́ту Твайго́.

Памі́луй мяне́, Бо́жа, памі́луй мяне́.

Калі́ паста́ўлены бу́дуць прасто́лы на Стра́шным Судзе́, тады́ ўчы́нкі ўсіх людзе́й адкры́юцца; го́ра там бу́дзе грэ́шным, на му́ку адпра́ўленым; і ве́даючы гэ́та, душа́ мая́, пака́йся ў злых учы́нках тваіх.

Памі́луй мяне́, Бо́жа, памі́луй мяне́.

Пра́веднікі ўзра́дуюцца, а грэ́шнікі бу́дуць пла́каць, тады́ ніхто́ не змо́жа дапамагчы́ нам, а ўчы́нкі на́шы асу́дзяць нас; таму́, паку́ль яшчэ́ не канé́ц, пака́йся ў злых учы́нках тваіх.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Го́ра мне, мнагагрэ́шнаму, апага́ненаму ўчы́нкамі і ду́мкамі, ні кро́плі слёз не ма́ю я, бессардэ́чны; цяпе́р падыміся з зямлі́, душа́ мая́, і пака́йся ў злых учы́нках тваіх.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Вось звярта́ецца, Спада́рыня, Сын Твой, і настаўля́е нас на до́брае, а я, грэ́шны, ад дабра́

заўжды́ ўцяка́ю; але Ты, Мі́ласцівая, памі́луй мяне́, каб я пака́яўся ў злых учы́нках маіх.

Сядальны, глас 6

Разважа́ю пра дзень стра́шны і апла́кваю маé злыя ўчы́нкі: які́ адка́з дам я пе́рад Бессмяро́тным Царо́м і як адва́жуся глядзе́ць на Суддзю́ я, блу́дны? Міласэ́рны О́йча, Сы́не Адзінаро́дны і Дух Святы́, памі́луй мяне́.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Звя́заны цяпе́р мно́гімі ако́вамі граху́ і апанава́ны лю́тымі страсця́мі і бе́дамі, да Цябе́ звярта́юся, майго́ ратун́ку, і ўскліка́ю: дапамажы́ мне, Дзе́ва, Ма́ці Бо́жая.

Песня 4

Ірмос: "Хрысто́с — мая́ сі́ла, Бог і Гаспо́дзь", — свята́я Ца́рква богадасто́йна спява́е, усклі́ка́ючы, ад чы́стага сэ́рца ў го́нар Го́спада святкуючы.

Памі́луй мяне́, Бо́жа, памі́луй мяне́.

Шыро́кая тут даро́га і прыда́тная, каб раско́шна жыць, але го́рка бу́дзе ў апо́шні дзень, калі́ душа́ з це́лам разлуча́цца бу́дзе; сцераж ы́ся гэ́тага, чалаве́к, дзе́ля Ца́рства Бо́жага.

Памі́луй мяне́, Бо́жа, памі́луй мяне́.

Чаму́ бе́днага ты кры́ўдзіш, пла́ту на́йміту затры́мліваеш, бра́та свайго́ не лю́біш, імкне́шся да распу́сты і го́нару? Пакі́нь гэ́та, душа́ мая́, і пака́йся дзе́ля Ца́рства Бо́жага.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свя́тому Ду́ху.

О, неразу́мны чалаве́ча, даку́ль ты бу́дзеш вя́знуць, як пчала́, збіра́ючы бага́цце сваё? Яно́ ж ско́ра згі́не, як пыл і по́пел; таму́ лепш імкні́ся да Ца́рства Бо́жага.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Спада́рыня Багаро́дзіца, памі́луй мяне́, грэ́шнага, і ў дабрадзе́йнасці ўмацу́й, і ахава́й мяне́, каб раптоўная смерць не забра́ла мяне́ негато́вым, і давядзі́ мяне́, Дзе́ва, да Ца́рства Бо́жага.

Песня 5

Ірмос: Бажэ́ственным святло́м Тваі́м, До́бры, азары́, малю́ся, ду́шы тых, што звярта́юцца да Цябе́ зра́нку з любо́ўю, каб спазна́лі яны́ Цябе́, Сло́ва Бо́жае, і́сціннага Бо́га, Які́ з це́мры грахо́ўнай да *Ся́бе* кліча.

Памі́луй мяне́, Бо́жа, памі́луй мяне́.

Успо́мні, акая́нны чалаве́ча, як з-за грахо́ў ты стаў рабо́м хлусні́, паклёпу, разбо́ю, хваро́б — лю́тых звяро́ў; душа́ мая́ грэ́шная, ці гэ́тага захаце́ла ты?

Памі́луй мяне́, Бо́жа, памі́луй мяне́.

Трымця́ць маé члéны, бо ўсі́мі я правіні́ўся: калі́ глядзéў вачы́ма, калі́ слу́хаў вушáмі, калі́ языкóм гавары́ў злóе, я ўсягó сябé геéне аддáў; душá мая́ грэ́шная, ці гэ́тага захацéла ты?

Слáва Айцу́, і Сы́ну, і Святóму Ду́ху.

Блудніка́ і разбóйніка пакая́нне Ты прыня́ў, Спасі́целю; тóлькі я адзі́н лянóтаю грахóўнаю абцяжáраны і злы́мі ўчы́нкамі занявóлены; душá мая́ грэ́шная, ці гэ́тага захацéла ты?

І цяпéр, і заўсёды, і на вéкі вякóў. Амі́нь.

Дзі́ўная і скóрая памóчніца ўсім лю́дзям, Мáці Бóжая, памажы́ мне, недастóйнаму, бо душá мая́ грэ́шная гэ́тага захацела.

Песня 6

Ірмос: Жыццёвае мóра, усхваляванáнае бу́раю напáсцей, бáчачы і да ці́хай пры́стані Тваёй прыплы́ўшы, я клі́чу да Цябé: вы́ратуй ад гі́белі жыццё маё, Мнагамі́ласцівы.

Памі́луй мянé, Бóжа, памі́луй мянé.

Жыццё на зямлі́ я блу́дна пражы́ў і душу́ ў цéмру аддáў; цяпéр жа малю́ Цябé, Мі́ласцівы Уладару́: вы́звалі мянé з гэ́тага рáбства вóрага і дай мне рóзум выкóнваць вóлю Тваю́.

Памі́луй мянé, Бóжа, памі́луй мянé.

Хто ро́біць тако́е, як я? Бо як свіння́ ляжы́ць у гра́зі, так і я граху́ служу́. Але́ Ты, Го́спадзі, вы́цягні мяне́ з бру́ду гэ́тага і схілі́ маё сэ́рца выко́нваць за́паведзі Тваі́.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Павярні́ся, акая́нны чалаве́ча, да Бо́га, успо́мніўшы сваі́ саграшэ́нні, прыпада́ючы да Твара́ца са слязьмі́ і е́нкам; і Ён, бу́дучы міласэ́рным, дасць табе́ ро́зум для пазна́ння во́лі Яго́.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Багаро́дзіца Дзе́ва, ад ба́чнага і няба́чнага зла захава́й мяне́, Прачы́стая, і прымі́ малі́твы маі́, і прынясі́ іх Сы́ну Твайму́, каб Ён даў мне ро́зум для выкана́ння во́лі Яго́.

Кандак

Душа́ мая́, наво́шта ты граха́мі багацце́еш, наво́шта во́лю дыя́вала выко́нваеш, на што надзе́ю ўскладае́ш? Перастань рабі́ць гэ́та і звярні́ся да Бо́га з пла́чам, усклі́ка́ючы: міласэ́рны Го́спадзі, памі́луй мяне́, грэ́шнага.

Ікас

Паду́май, душа́ мая́, пра го́ркую гадзі́ну сме́рці і Стра́шны Суд Твара́ца твайго́ і Бо́га: бо А́нгелы гро́зныя во́зьмуць цябе́, душа́, і ў ве́чны аго́нь увяду́ць; таму́, паку́ль не прыйшла́ смерць, пака́йся, усклі́ка́ючы: Го́спадзі, памі́луй мяне́, грэ́шнага.

Песня 7

Ірмос: Расада́йнаю зрабіў А́нгел печ святы́м юнака́м, а нака́з Бо́жы, які халдзе́яў апалі́ў, пераканá ў мучы́целя ўскліка́нуць: благаслáвёны Ты, Бо́жа айцо́ў на́шых.

Памі́луй мяне́, Бо́жа, памі́луй мяне́.

Не спадзява́йся, душа́ мая́, на тле́ннае бага́цце і на здабы́так няпра́ведны, бо не ве́даеш ты, каму́ паклнеш усё гэ́та, таму́ ўскліка́ні: памі́луй мяне́, Хрысце́ Бо́жа, недасто́йнага.

Памі́луй мяне́, Бо́жа, памі́луй мяне́.

Не разліка́вай, душа́ мая́, на цяле́снае здаро́ўе і на прыгажо́сць, яка́я ху́тка зніка́е, ты ж ба́чыш, што ду́жыя і малады́я паміра́юць, таму́ ўскліка́ні: памі́луй мяне́, Хрысце́ Бо́жа, недасто́йнага.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Успо́мні, душа́ мая́, пра ве́чнае жыццё — пра Ца́рства Нябе́снае, прыгатава́нае святы́м, і пра це́мру зне́шнюю і гнеў Бо́жы — злым, і ўскліка́ні: памі́луй мяне́, Хрысце́ Бо́жа, недасто́йнага.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Прыпадзі́, душа́ мая́, да Бо́жай Ма́ці і памаліся Ёй, бо Яна́ — ско́рая памо́чніца тым, хто ка́ецца, Яна́ ўмо́ліць Сы́на Хрыста́ Бо́га, і Ён памі́луе мяне́, недасто́йнага.

Песня 8

Ірмос: З по́лымя расу́ для святы́х утвары́ў Ты і ахвя́ру пра́веднага вадо́ю спалі́ў: бо Ты ўсё ро́біш, Хрысце́, як то́лькі захо́чаш. Цябе́ мы праслаўля́ем на ўсе вякі́.

Памі́луй мяне́, Бо́жа, памі́луй мяне́.

Як магу́ не пла́каць я, калі паду́маю пра смерць? Я ж ба́чыў, як у труне́ ляжа́ў брат мой, бяссла́ўны і бры́дкі. Чаго́ я чака́ю і на што спадзяю́ся? То́лькі дай мне, Го́спадзі, паку́ль яшчэ́ не кане́ц, пакая́нне. *(Двойчы)*

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Я ве́ру, што Ты пры́йдзеш судзі́ць жывы́х і мёртвых і ўсе ў сваі́м чы́не ста́нуць, стары́я і малады́я, уладары́ і князі́, дзе́вы і свяшчэ́ннікі; дзе апыну́ся я? Таму́ я ўскліка́ю: дай мне, Го́спадзі, паку́ль яшчэ́ не кане́ц, пакая́нне.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Прачы́стая Багаро́дзіца, прымі́ недасто́йную малі́тву маю́, і захава́й мяне́ ад раптоўнай сме́рці, і пада́й мне, паку́ль яшчэ́ не кане́ц, пакая́нне.

Песня 9

Ірмос: Бога лю́дзям немагчы́ма ба́чыць, бо на Яго і чыны́ а́нгельскія глядзе́ць не сме́юць; але́ праз Цябе́, Усячы́стая, ба́чным ста́ла для смяро́тных[1] Сло́ва ўцяле́сненае; Яго́ велічаючы, мы з нябе́снымі во́інствамі Цябе́ ўблажа́ем.

---

[1] Так у грэчаскім тэксце: “ὡράθη βροτοῖς” — “стала бачна смяротным” *(заўвага перакладчыка).*

Памі́луй мяне́, Бо́жа, памі́луй мяне́.

Цяпе́р да вас я звярта́юся, А́нгелы, Арха́нгелы і ўсе нябе́сныя сі́лы, які́я каля́ прасто́ла Бо́жага стаіце́: малі́цеся да Тварца́ свайго́, каб Ён зба́віў душу́ маю́ ад му́кі ве́чнае.

Памі́луй мяне́, Бо́жа, памі́луй мяне́.

Цяпе́р з пла́чам я звярта́юся да вас, святы́я патрыя́рхі, цары́ і праро́кі, апо́сталы і свяці́целі, і ўсе выбра́ннікі Хрысто́вы: дапамажы́це мне на Судзе́, каб Ён спас душу́ маю́ ад сі́лы варо́жай.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Цяпе́р да вас я ўзніма́ю ру́кі, святы́я му́чанікі, пустэ́льнікі, няві́ннікі, пра́веднікі і ўсе святы́я, што мо́ліцеся да Го́спада за ўвесь свет: няха́й памі́луе Ён мяне́ ў гадзі́ну сме́рці маёй.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Ма́ці Бо́жая, дапамажы́ мне, я ве́льмі спадзяю́ся на Цябе́, умалі́ Сы́на Свайго́, каб Ён паста́віў мяне́, недасто́йнага, спра́ва ад Сябе́, калі ся́дзе і бу́дзе судзі́ць жывы́х і мёртвых. Амі́нь.

Малітва

Уладару́ Хрысце́ Бо́жа, Ты паку́тамі Тваі́мі мяне́ ад паку́т пазба́віў і ра́намі Тваі́мі мае́ ра́ны загаі́ў, пада́й мне, які́ мно́га пе́рад Табо́ю награшы́ў, слёзы жа́лю; раствары́ ў маі́м це́ле пах Жыватво́рчага Це́ла Твайго́, і дай асало́ду душы́ маёй Тваёю Кашто́ўнаю

Крывёю замéст той гóрычы, якóю працíўнік мянé напаíў; рóзум мой, да долу панíклы, узвы́сь да Сябé і адвядзí ад прóрвы пагíбельнай, бо нямá ў мянé пакаáння, нямá жáлю, нямá слязы́ суцяшáльнай, якáя прывóдзіць дзяцéй да íхняй спáдчыны. Я азмрóчыў свóй рóзум жыцéйскімі страсцямі, не магý скіравáць на Цябé свой пóгляд у час хварóбы, не магý сагрэцца слязáмі любóві да Цябé. Алé Ты, Уладарý Гóспадзі Ісýсе Хрысцé, Скáрбніца дабрá, падáй мне пакаáнне ўсяцэ́лае і сэ́рца руплівае, каб шукáць Цябé; падáй мне благадáць Тваю́ і аднавí ўва мне ры́сы Твайгó вóбраза. Я пакíнуў Цябé, алé Ты не пакíнь мянé; вы́йдзі на пóшукі мянé; прывядзí на пáшу Тваю́ і далучы́ мянé да авéчак вы́бранага Твайгó стáда; узгадýй мянé з íмі, жы́вячы Бажэ́ственнымі Тваíмі Таíнствамі, па малíтвах Прачы́стай Тваёй Máці і ўсíх святы́х Тваíх. Амíнь.

КАНОН МАЛЕБНЫ ДА ПРАСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ

Спяваецца пры ўсякім смутку душэўным і няшчасці.
Твор манаха Феасцірыкта

Глас 8

Песня 1

Ірмос: Ваду́ прайшо́ўшы ні́бы су́шу і егі́пецкага лі́ха пазбе́гнуўшы, ізраільця́нін усклі́ка́ў: Збавіцелю і Бо́гу на́шаму спява́йма.

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас.

Мно́гімі апанава́ны выпрабава́ннямі, да Цябе́ я звярта́юся ў по́шуках спасе́ння: О, Ма́ці Сло́ва і Дзе́ва, ад ця́жкіх бе́дстваў спасі́ мяне́.

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас.

Турбу́юць мяне́ напа́ды страсце́й, які́я напаўня́юць душу́ маю́ вялі́каю марко́таю; супако́й яе́ мі́рам Сы́на і Бо́га Твайго́, Дзе́ва Усебеззага́нная.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Цябе́, што нарадзі́ла Спасі́целя і Бо́га, малю́ я, Дзе́ва, пра збаўле́нне мяне́ ад бе́дстваў; да Цябе́ цяпе́р звярта́ючыся, я скіро́ўваю і душу́, і ро́зум.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Хво́рага це́лам і душо́ю, наве́двання Бо́жага і кло́пату ад Цябе́ спадо́бі, адзі́ная Багама́ці, бо Ты до́брая і До́брага нарадзі́ла.

Песня 3

Ірмос: Нябе́снага ку́пала Верхатво́рца Го́спадзі і Царквы́ Стварыцель, умацу́й мяне́ ў любо́ві да Цябе́, Ты, мэ́та маі́х імкне́нняў, апо́ра ве́рных, адзі́ны Чалавекалю́бец.

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас.

Абаро́наю і по́крывам жыцця́ майго́ лічу́ я Цябе́, Богарадзі́целька Дзе́ва: Ты мяне́ скіру́й да пры́стані Тваёй, Віно́ўніца дабро́т, апо́ра ве́рных, адзі́ная Усяпе́тая[1].

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас.

Малю́ Цябе́, Дзе́ва: душэ́ўную збянтэ́жанасць і бу́ру сму́тку майго́ разгані́, бо Ты, Боганяве́ста, крыні́цу спако́ю — Хрыста́ нарадзі́ла, адзі́ная Прачы́стая.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Ты нарадзі́ла Дабрадзе́я, дабра́ Віно́ўніка, а таму́ бага́ццем дабрадзе́йства ўсіх адары́, бо Ты ўсё мо́жаш, пако́лькі мо́цнага сі́лаю Хрыста́ нарадзі́ла Ты, Богаблажэ́нная.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь

---

[1] Усяпетая — у найвышэйшай меры праслаўленая (апетая) у песнях.

Дзе́ва, Ты дапамажы́ мне, зму́чанаму лю́тымі не́мачамі і балю́чымі страсця́мі, бо я зна́ю Цябе́, Найбеззага́ннейшая, як ска́рбніцу ацале́нняў бага́тую і невычарпа́льную.

Захава́й ад бед рабо́ў Тваі́х, Багаро́дзіца, бо мы ўсе пасля Бо́га да Цябе́ звярта́емся, як да несакруша́льнай сцяны́ і абаро́ны.

Спагля́нь з міласэ́рнасцю, усяпе́тая Багаро́дзіца, на мае́ лю́тыя цяле́сныя паку́ты і ацалі́ не́мач душы́ маёй[1].

Сядальны, глас 2

Гара́чая малі́тва і сцяна́ непрысту́пная, мі́ласці крыні́ца, све́ту прыста́нішча, мы шчы́ра ўсклі́каем да Цябе́: Багаро́дзіца Улады́чыца, паспяшы́ і збаў нас ад бед, адзі́ная ско́рая абаро́нніца.

Песня 4

Ірмос: Пачу́ў я, Го́спадзі, пра таі́нства заду́мы Тваёй, уразуме́ў спра́вы Тваé і прасла́віў Тваё Бажаство́.

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас.

Страсце́й маі́х узбурэ́нне і бу́ру маі́х саграшэ́нняў уціхамі́р, Боганяве́ста, Яка́я нарадзі́ла Стырнаво́га — Го́спада.

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас.

---

[1] Гэтыя два малебныя прыпевы ўжываюцца толькі пры служэнні малебна пасля 3-й і 6-й песень канона.

Падáй мне Тваю́ бязмéжную міласэ́рнасць у адкáз на мой зáклік да Цябé, Якáя нарадзíла Міласэ́рнага і Спасíцеля ўсíх, хто апявáе Цябé.

Прасвятáя Багарóдзіца, спасí нас.

Мáючы асалóду ад Тваíх дарóў, Прачы́стая, мы спявáем удзя́чную пéсню, прызнаючы́ Цябé за Багамáці.

Слáва Айцу́, і Сы́ну, і Святóму Дýху.

На лóжы ў хварóбе сваёй і нéмачы ляжу́ я, тамý дапамажы́ мне як Добралюбíвая[1], адзíная Вечнадзéва.

І цяпéр, і заўсёды, і на вéкі вякóў. Амíнь.

Надзéю і апóру, і непахíсную сцяну́ спасéння мáючы ў Табé, Усяпéтая, мы ад уся́кай ця́жкасці збаўля́емся.

Песня 5

Ірмос: Прасвятлí нас накáзамі Тваíмі, Гóспадзі, і сíлаю[2] Тваёю высóкаю Твóй мір падáй нам, Чалавекалю́бец.

---

[1] У гэтым трапары канона маецца розначытанне: у адных выданнях царкоўнаславянскага тэксту (гл., напрыклад, “Часослов”) ужыта слова “Благолюбива”, у другіх (гл., напрыклад, “Каноник”) — “Боголюбива”; у грэчаскім тэксце канона гэты трапар адсутнічае; пры перакладзе мы выбралі варыянт паводле тэксту “Часослова”: “Благолюбива” — “Добралюбівая” *(заўвага перакладчыка).*

[2] Сілаю — літаральна “рукою”; грэчаскае “βραχιων” абазначае руку ва ўсю яе даўжыню, пачынаючы ад пляча, і сімвалізуе магутнасць, сілу *(заўвага перакладчыка).*

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасí нас.

Напо́ўні, Чы́стая, весялó́сцю сэ́рца маё, Тваю́ чы́стую[1] даючы́ ра́дасць, бо Віно́ўніка весялóсці нарадзíла Ты.

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасí нас.

Збаў нас ад бед, Багаро́дзіца Чы́стая, што нарадзíла ве́чнае Збаўле́нне і мір, які́ перавыша́е ўся́кае разуме́нне.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Рассе́й імглу́ саграшэ́нняў маíх, Боганявé́ста, праме́ннем Твайго́ ззя́ння, Ты, што нарадзíла Святло́ Бажэ́ственнае і спрадве́чнае.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амíнь.

Ацалí, Чы́стая, душы́[2] маёй не́мач, спадо́біўшы мяне́ Тваёй апе́кі, і здаро́ўе малíтвамі Тваíмі пада́й мне.

Песня 6

Ірмос: Малíтву я пралію́ да Го́спада і Ямý адкры́ю бе́ды маé, тамý што́ злом душа́ мая́ напо́ўнена і жыццё маё да пе́кла набліжана. І малю́ся я, як Іо́на: ад згу́бы, Бо́жа, вы́баў мяне́.

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасí нас.

---

[1] Грэчаскае “ἀκήρατος” абазначае “нязмешаны”, “непашкоджаны”, “некрануты”, “цэльны”.

[2] У грэчаскім тэксце: “τῶν παθῶνμου τὴν ἀσθενειαν” — “страсцей маіх немач”.

Як Сам Той, Хто аддáў Сябé на смерць, спас ад смéрці і згýбы маю́ істóту, ахóпленую згýбаю і смéрцю, так Ты, Дзéва, малí Гóспада і Сы́на Твайгó збáвіць мянé ад ліхадзéйства вóрагаў.

Прасвятáя Багарóдзіца, спасí нас.

Як абарóнніцу жыцця́ Цябé знáю і захавáльніцу надзéйную, Дзéва, Якáя спыня́е мнóства спакýс[1] і адвóдзіць злóбу дэ́манаў; і малю́ся заўжды́: ад згýбы страсцéй маíх збаў мянé.

Слáва Айцý, і Сы́ну, і Святóму Дýху.

Мы мáем, Цябé, Дзéва, як сцянý абарóнную, як уседасканáлае спасéнне душ і ўцéху ў нягóдах, і святлý Тваймý заўжды́ рáдуемся. О, Улады́чыца, і цяпéр нас ад страсцéй і бед уратýй.

І цяпéр, і заўсёды, і на вéкі вякóў. Амíнь.

У пасцéлі цяпéр я хвóры ляжý, і нямá ацалéння плóці маёй, алé да Цябé я малю́ся, Дóбрай, Якáя нарадзíла Бóга і Спасíцеля свéту, і Збавíцеля ад нéмачаў: ад згýбы нéмачаў падымí мянé.

Кандак, глас 6

Абарóна хрысція́н надзéйная, Хадáйніца да Тварцá нязмéнная, не пагарджáй малітвамі грэ́шнікаў, а паспéй як Дóбрая на дапамóгу нам, што з вéраю ўскліка́ем да Цябé: паспяшáйся на застýпніцтва

---

[1] Літаральна з грэчаскай — “натоўп спакус”; царкоўнаславянскі выраз “напастей молвы” недакладны.

і ху́тка прыйдзі́ на хада́йніцтва, абараняю́чы заўжды́, Багаро́дзіца, тых, хто шану́е Цябе́.

Другі кандак, глас той жа

Нямá ў нас íншае дапамóгі, нямá íншае надзéі, акрамя́ Цябе́, Прачы́стая Дзéва. Ты нам дапамажы́, на Цябе́ спадзяéмся мы і Табóю хвáлімся, бо Твае́ мы рабы́, няхáй жа не пасарóмеемся.

Сціхіра, глас той жа

Не даручáй мяне́ чалавéчай абарóне, Прасвятáя Улады́чыца, а прымí малéнне рабá Твайгó; бо нягóды агарнýлі мяне́, я не магу́ цярпéць дэ́манскіх стрэ́л, прытýлку не мáю і нідзе́ не знахóджу прыстáнішча, няшчасны я, адусюль нападаюць на мяне, і уцехі не мáю, акрамя́ Цябе́, Улады́чыца свéту, надзéя і абарóна вéрных, не пагарджáй малíтвай маёй і зрабí тóе, што кары́сна мне.

Песня 7

Ірмос: Юнакí, якíя з Іудзéі прыйшлí, нéкалі ў Вавілóне вéраю ў Трóіцу пóлымя ў пéчы перамаглí, спявáючы: Бóжа айцóў, благаслáвёны Ты.

Прасвятáя Багаро́дзіца, спасí нас.

Жадáючы нáша спасéнне здзéйсніць, Спасíцелю, Ты ўсялíўся ва ўлóнне Дзéвы, Якýю ўчынíў Ты Застýпніцай свéту; айцóў нáшых Бóжа, благаславёны Ты.

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас.

Прыхі́льніка мі́ласці, Яко́га нарадзі́ла Ты, Ма́ці Чы́стая, умалі́, каб пазба́віліся ад саграшэ́нняў і душэ́ўнага бру́ду ты́я, што з ве́раю ўскліка́юць: айцо́ў на́шых Бо́жа, благаславёны Ты.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Як ска́рбніцу спасе́ння, і крыні́цу нятле́ння, і надзе́йную цвярды́ню, і дзве́ры пакая́ння Ты паказа́ў Ту́ю, Яка́я нарадзі́ла Цябе́, тым, што ўскліка́юць: айцо́ў на́шых Бо́жа, благаславёны Ты.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Цяле́сныя сла́басці і душэ́ўныя не́мачы тых, што з любо́ю прыхо́дзяць, Богарадзі́целька, пад по́крыва Тваё, спадо́бі ацалі́ць, Дзе́ва, Яка́я Спасі́целя Хрыста́ нам нарадзі́ла.

Песня 8

Ірмос: Цара́ Нябе́снага, Яко́га апява́юць[1] во́інствы А́нгелаў, апява́йце і ўслаўля́йце і высо́ка ўзно́сьце ва ўсе вякі́.

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас.

Не пагарджа́й, Дзе́ва, ты́мі, хто про́сіць Тваёй дапамо́гі, апява́ючы і высо́ка ўзно́сячы Цябе́ наве́кі.

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас.

---

[1] У арыгінале слова "ὑμνέω" абазначае "спяваць гімн", "апяваць".

[1]Не́мачы душы́ маёй і цялёсныя хваро́бы Ты ацаля́еш, Дзе́ва, каб я праслаўля́ў Цябе́, Чы́стая, наве́кі[2].

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Ацале́нняў мно́ства Ты выліва́еш на тых, хто апява́е Цябе́, Дзе́ва, і высо́ка ўзно́сіць невымо́ўна Наро́джанага Табо́ю.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

На́ціскі спаку́с і напа́ды страсце́й адганя́еш Ты, Дзе́ва, таму́ мы апява́ем Цябе́ ва ўсе вякі́.

Песня 9

Ірмос: Справядлі́ва Багаро́дзіцай мы вызнае́м Цябе́, праз Цябе́ спасёныя, Дзе́ва Чы́стая, з хара́мі бясплО́тных сіл Цябе́ вялічА́ючы.

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас.

Не пагарджа́й пато́кам слёз маіх, Дзе́ва, што нарадзі́ла Хрыста, Які́ выціра́е з ко́жнага тва́ру ко́жную слязу́.

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас.

Ра́дасцю маё сэ́рца напо́ўні, Дзе́ва, Яка́я атрыма́ла паўнату́ ра́дасці і зні́шчыла боль граху́.

Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас.

---

[1] У грэчаскім тэксце канона гэты трапар стаіць на трэцім месцы, а тут стаіць наступны трапар.

[2] У грэчаскім тэксце гэты трапар мае іншае заканчэнне: “каб я праслаўляў Цябе, Благадатную”.

Прыста́нішчам і абаро́наю будзь, Дзе́ва, тым, хто звярта́ецца да Цябе́, сцяно́ю несакруша́льнаю, прыту́лкам, і по́крывам, і ра́дасцю.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Святла́ Твайго́ праме́ннем разганя́ючы це́мру няве́дання, асвятлі́, Дзе́ва, тых, хто з паша́наю вызнае́ Цябе́ Багаро́дзіцаю.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

На ме́сцы паку́т ад не́мачы ацалі́ таго́, хто ўпаў ду́хам, Дзе́ва, з хво́рага зрабі́ўшы здаро́вым.

Сціхіры, глас 2

Вышэ́йшую за нябёсы і чысце́йшую за святло́ со́нечнае, Ту́ю, што зба́віла нас ад праклёну, Улады́чыцу све́ту спе́вамі ўшану́ем.

Ад мно́гіх маіх граху́ў хварэ́е це́ла, хварэ́е і душа́ мая́; да Цябе́ я звярта́юся, Благада́тнай: Надзе́я безнадзе́йных, Ты мне дапамажы́.

Улады́чыца і Ма́ці Збавіцеля, прымі́ малі́тву недасто́йных рабо́ў Тваіх, каб хада́йнічаць пе́рад Наро́джаным ад Цябе́. О, Улады́чыца све́ту, будзь хада́йніцаю!

Стара́нна і ра́дасна мы спява́ем цяпе́р пе́сню Табе́, усі́мі апе́тай Багаро́дзіцы: з Прадце́чаю і ўсі́мі святы́мі малі́, Багаро́дзіца, *Бо́га* быць мі́ласцівым да нас.

Усе́ во́інствы А́нгелаў, Прадце́ча Гаспо́дні, дванаццаць Апо́сталаў, усе́ святы́я з Багаро́дзіцаю, учыні́це малі́тву, каб спасліся мы.

Малітва 1
да Прасвятой Багародзіцы

Цары́ца маю́ найдабрэ́йшая, надзе́я маю́, Багаро́дзіца, прыту́лак для сіро́т і абаро́нніца падаро́жных, гаро́тных ра́дасць, пакры́ўджаных атулі́целька! Ты ба́чыш маю бяду́, Ты ба́чыш маё го́ра; дапамажы мне як немачнаму, скіруй мяне на шлях як падаро́жнага. Кры́ўду маю Ты ве́даеш, вы́звалі з яе́, як жада́еш, бо нямá ў мяне́ і́ншае дапамо́гі, апро́ч Цябе́, ні і́ншае абаро́нніцы, ні до́брае суцяша́льніцы, акрамя́ Цябе́, о, Багама́ці, бо Ты захава́еш мяне́ і ату́ліш на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва 2

Каго́ бу́ду кліка́ць, Улады́чыца? Да каго́ звярну́ся ў журбе́ маёй, калі́ не да Цябе́, Цары́ца Нябе́сная? Хто плач мой і ўздыха́нне маё пры́ме, калі́ не Ты, Найбеззага́ннейшая, надзе́я хрысція́н і прыста́нішча нам, грэ́шным? Хто лепш за Цябе́ ў напа́сцях абаро́ніць? Пачу́й жа стогн мой і схілі́ ву́ха Тваё да мяне́, Улады́чыца, Ма́ці Бо́га майго́, і не пагарджа́й мно́ю, які́ патрабу́е Тваёй дапамо́гі, і не адкі́нь мяне́, грэ́шнага. Наста́ў на ро́зум і навучы́ мяне́, Цары́ца Нябе́сная; не адступі́ ад мяне́, раба́ Твайго́, за нараканне маё, а бу́дзь мне Ма́ці і Засту́пніцай. Уруча́ю сябе́ мі́ласцівай апе́цы Тваёй: прывядзі́ мяне́, грэ́шнага, да ці́хага і спако́йнага жыцця́, каб я аплáкваў грахі́ сваé. Бо да каго́ звярну́ся я, вінава́ты, калі́ не да Цябе́, надзе́і і прыста́нішча для

грэ́шных, акрыля́емы спадзява́ннем на невымо́ўную мі́ласць Тваю́ і шчо́драсці Тваé? О, Улады́чыца, Цары́ца Нябе́сная! Ты мне надзе́я і прыста́нішча, прыту́лак, і засту́пніцтва, і дапамо́га. Цары́ца мая́ найдабрэ́йшая і ско́рая Засту́пніца! Пакры́й Тваі́м хада́йніцтвам маé саграшэ́нні, абарані́ мяне́ ад во́рагаў ба́чных і нябачных; змякчы́ сэ́рцы злых людзе́й, што паўстаю́ць на мяне́. О, Ма́ці Го́спада майго́, Тварца́! Ты — ко́рань дзяво́цтва і неўвяда́льная кве́тка чысці́ні. О, Багаро́дзіца! Ты пада́й дапамо́гу мне, не́мачнаму ад пло́цкіх страсце́й і нядзю́жаму сэ́рцам, бо то́лькі Тваё і з Табо́ю Твайго́ Сы́на і Бо́га на́шага ма́ю засту́пніцтва; і Тваі́м найцудо́ўнейшым засту́пніцтвам няха́й зба́ўлюся я ад уся́кае бяды́ і напа́сці, о, найбеззага́ннейшая і найслаўне́йшая Бо́жая Ма́ці Марыя. Таму́ я з надзе́яй гавару́ і ўскліка́ю: ра́дуйся, Благада́тная, раду́йся, Абра́даваная; ра́дуйся, Найблагаславе́ннейшая, Гаспо́дзь з Табо́ю.

Малітва 3

О, Прасвята́я Спада́рыня Улады́чыца Багаро́дзіца! Ты вышэ́йшая за ўсіх А́нгелаў і Архáнгелаў і пачэ́снейшая за ўсё стварэ́нне, Ты — памо́чніца пакры́ўджаных, безнадзе́йных надзе́я, убо́гіх засту́пніца, засму́чаных суцяшэ́нне, гало́дных кармі́целька, го́лых адзе́нне, хво́рых ацале́нне, грэ́шных спасе́нне, хрысція́н усі́х дапамо́га і засту́пніцтва. О, усямі́ласцівая Спада́рыня, Дзе́ва

Багаро́дзіца Улады́чыца, мі́ласцю Тваёю спасі́ і памі́луй Вялі́кага Спадара́ і Айца́ на́шага Кіры́ла, Свяце́йшага патрыя́рха Маскоўскага і ўсяе́ Русі і ўсіх Свяце́йшых патрыя́рхаў праваслаўных і Спадара́ на́шага Высокапраасвяшчэ́ннейшага Філарэ́та, мітрапалі́та Мінскага і Слу́цкага, Патрыя́р-шага Экза́рха ўсяе́ Беларусі, праасвяшчэ́нных мітрапалі́таў, архіепіскапаў і епіскапаў і ўвесь свяшчэ́нніцкі і мана́скі чын, і ўсіх праваслаўных хрысціян ры́заю Тваёю пачэ́снаю ахава́й; і ўмалі́, Спада́рыня, Таго́, Хто без се́мені ўцяле́сніўся ад Цябе́ — Хрыста, Бо́га на́шага, каб Ён падпераза́ў нас сі́лаю Сваёю вышэ́йшаю на няба́чных і ба́чных во́рагаў на́шых. О, усямі́ласцівая Спада́рыня Улады́чыца Багаро́дзіца, уздымі́ нас з глыбіні́ граху́ і збаў нас ад го́ладу, згу́бы, ад землетрасе́ння і пато́пу, ад агню́ і мяча́, ад нашэ́сця іншапляме́ннікаў і міжусо́бнае вайны́, і ад раптоўнае сме́рці, і ад напа́ду во́рагаў, і ад згу́бных вятро́ў, і ад смертано́снае зара́зы, і ад уся́кага зла. Пада́й, Спада́рыня, мір і здаро́ўе раба́м Тваі́м, усі́м праваслаўным хрысціянам, і асвятлі́ ім ро́зум і во́чы сэ́рца для спасе́ння; і спадо́бі нас, грэ́шных рабо́ў Тваіх, Ца́рства Сы́на Твайго́, Хрыста́, Бо́га на́шага, бо ўлада́рства Яго́ благаславёнае і найпраслаўленае з Беспача́тным Яго́ Айцо́м, і з Прасвяты́м, і До́брым, і Жыватво́рчым Яго́ Ду́хам, цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

КАНОН АНГЕЛУ АХОЎНІКУ

Глас 8

Песня 1

Ірмос: Спява́йма Го́споду, Які́ правёў наро́д праз Чырво́нае мо́ра, бо Ён адзі́н сла́ўна праслáвіўся.

Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, Бо́жа мой, памі́луй мяне́.

Спадо́бі, Спасі́целю, Твайго́ раба́ дасто́йна пе́сню заспява́ць і ўсхвалі́ць бясплó́тнага А́нгела, наста́ўніка і ахо́ўніка майго́.

Святы́ А́нгеле Бо́жы, ахо́ўніку мой, малі́ Бо́га за мяне́.

Адзі́н я ў неразу́мнасці і ў ляно́це цяпе́р ляжу́, наста́ўніку мой і ахо́ўніку, не пакі́нь мяне́ на пагі́бель.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Ро́зум мой тваёю малі́тваю скіру́й, каб выко́нваць мне Бо́жыя нака́зы, каб атрыма́ў я ад Бо́га адпушчэ́нне граху́, і ненаві́дзець зло наста́ў мяне́, малю́ся табе́.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амінь.

Малі́ся, Дзе́ва, за мяне́, раба́ Твайго́, да Пада́целя добра́ з ахо́ўнікам маі́м А́нгелам і наста́ў мяне́ выко́нваць за́паведзі Сы́на Твайго́ і Твару́а майго́.

Песня 3

Ірмос: Ты — умацава́нне тых, хто прыхо́дзіць да Цябе́, Го́спадзі, Ты — святло́ азмро́чаных, і апява́е Цябе́ дух мой.

Святы́ А́нгеле Бо́жы, ахо́ўніку мой, малі́ Бо́га за мяне́.

Усе ду́мкі маé і душу́ маю́ да цябе́ я скірава́ў, ахо́ўніку мой; ты ад уся́кае варо́жае спаку́сы збаў мяне́.

Святы́ А́нгеле Бо́жы, ахо́ўніку мой, малі́ Бо́га за мяне́.

Во́раг то́пча мяне́ і зло мне чы́ніць, і навуча́е заўжды́ выко́нваць сваé жада́нні; але́ ты, наста́ўніку мой, не пакі́нь мяне́ на пагі́бель.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Дай мне спява́ць пе́сню з удзя́чнасцю і шчы́расцю Тварцу́ і Бо́гу, і табе́, до́браму А́нгелу, ахо́ўніку маймý: збавіцелю мой, забяры́ мяне́ ад во́рагаў, які́я чы́няць мне зло.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амінь.

Ацалі́, Прачы́стая, маé збале́лыя гно́йныя ра́ны душы́, прагані́ во́рагаў, які́я заўсёды змага́юцца са мно́ю.

Сядальны, глас 2

Ад любо́ві душэ́ўнай усклі́ка́ю да цябе́, ахо́ўніка маёй душы́, усесвяты́ мой А́нгеле: атулі́ мяне́ і захава́й ад хі́трых падко́паў.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амінь.

Багародзічны: Багаро́дзіца бясшлю́бная Прачы́стая, Яка́я без се́мені нарадзі́ла Уладара́ ўсіх, Яго́ з А́нгелам, ахо́ўнікам маі́м, малі́, каб я пазба́віўся ад уся́кае збянтэ́жанасці і каб Ён даў замілава́нне і святло́ душы́ маёй, і саграшэ́нняў ачышчэ́нне, бо Ты — адзі́ная ско́рая Засту́пніца.

Песня 4

Ірмос: Пачу́ў я, Го́спадзі, пра та́інства заду́мы Тваёй, уразуме́ў спра́вы Тваé і праслáвіў Тваё Бажаство́.

Святы́ А́нгеле Бо́жы, ахо́ўніку мой, малі́ Бо́га за мяне́.

Малі́ Чалавекалю́бца Бо́га ты, ахо́ўніку мой, і не паки́нь мяне́, але́ заўсёды ў мі́ры захо́ўвай жыццё маё і пада́й мне спасе́нне неадо́льнае.

Святы́ А́нгеле Бо́жы, ахо́ўніку мой, малі́ Бо́га за мяне́.

Як засту́пніка і ахо́ўніка жыцця́ майго́ атрыма́ўшы цябе́ ад Бо́га, А́нгеле, малю́ цябе́, святы́: ад уся́кіх бед мяне́ вы́звалі.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Маю́ нечыстату́ тваёю свя́тасцю ачы́сці, ахо́ўніку мой, і ад лёсу тых, хто зле́ва[1], няха́й адасо́блены я бу́ду праз малі́твы тваé, і ўдзе́льнікам сла́вы ста́ну.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амінь.

---

[1] Гл.: Мф. 25, 31–46.

Збянтэ́жанасць прыйшла́ да мяне́ ад лі́ха, яко́е абступі́ла мяне́, Прачы́стая, але́ збаў мяне́ ху́тка ад яго́: бо да Цябе́ адзі́най я звярну́ўся.

Песня 5

Ірмос: Зра́нку ўскліка́ем Табе́: Го́спадзі, спасі́ нас, бо Ты — Бог наш, апрача́ Цябе́ і́ншага не зна́ем.

Святы́ А́нгеле Бо́жы, ахо́ўніку мой, малі́ Бо́га за мяне́.

Ма́ючы адва́гу пе́рад Бо́гам, умалі́ яго́, ахо́ўніку мой святы́, пазба́віць мяне́ ад уся́кага лі́ха, яко́е прыгнята́е мяне́.

Святы́ А́нгеле Бо́жы, ахо́ўніку мой, малі́ Бо́га за мяне́.

Свято́ све́тлае, све́тла асвятлі́ душу́ маю́, наста́ўніку мой і ахо́ўніку, Бо́гам да́дзены мне А́нгеле.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Мяне́, ахо́пленага сном цяжа́ру граха́ўнага, захава́й у нядрэ́мнасці, А́нгеле Бо́жы, і ўздымі́ мяне́ на славаслаўле́ньне малі́тваю тваёю.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амінь.

Мары́я, Спада́рыня Багаро́дзіца бясшлю́бная, надзе́я ве́рных, варо́жую пы́ху перамажы́, а тых, што апява́юць Цябе́, узвесялі́.

Песня 6

Ірмос: Ры́зу мне пада́й све́тлую Ты, што апрана́ешся ў святло́, ні́бы ў ры́зу, мнагамі́ласцівы Хрысце́ Бо́жа наш.

Святы́ А́нгеле Бо́жы, ахо́ўніку мой, малі́ Бо́га за мяне́.

Ухілі́ сэ́рца маё ад цяпе́рашняга абурэ́ння і ўмацу́й мяне́ ў пі́льным імкне́нні да дабра́, ахо́ўніку мой, і скіру́й мяне́ цудо́ўна да спако́ю жыццяда́йнага.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амінь.

Сло́ва Бо́жае ў Цябе́ ўсялі́лася, Багаро́дзіца, Яно́ лю́дзям паказа́ла Цябе́ як нябе́сную ле́свіцу; бо праз Цябе́ Вы́шні сышо́ў да нас.

Кандак, глас 4

Будзь міласэ́рным да мяне́, святы́ А́нгеле Гаспо́дні, ахо́ўніку мой, і не адступа́й ад мяне́, пага́нага, а прасвятлі́ мяне́ святло́м недакрана́льным і зрабі́ мяне́ дасто́йным Ца́рства Нябе́снага.

Ікас

Душу́ маю́, прыгне́чаную мно́гімі спаку́самі, ты, святы́ засту́пніку, невымо́ўнае сла́вы нябе́снае спадо́бі і з пе́ўчымі хара́мі бясплотных Сіл Бо́жых памі́луй мяне́ і захава́й, і ду́мкамі до́брымі душу́ маю́ прасвятлі́, каб тваёю сла́ваю, А́нгеле мой, я ўзбагаціўся, і перамажы маіх ворагау-зламыснікау, і зрабі́ мяне́ досто́йным Ца́рства Нябе́снага.

Песня 7

Ірмос: Юнакі́, якія з Іудзе́і прыйшлі́, не́калі ў Вавіло́не ве́раю ў Тро́іцу по́лымя ў пе́чы перамаглі́, спява́ючы: Бо́жа айцо́ў, благаславе́ны Ты.

Святы́ А́нгеле Бо́жы, ахо́ўніку мой, малі́ Бо́га за мяне́.

Міласцівы будзь да мяне́ і ўмалі́ Бо́га, Госпо́дні А́нгеле, бо ты мой засту́пнік ва ўсім жыцці́ маім, наста́ўнік і ахо́ўнік, Бо́гам да́дзены мне наве́кі.

Святы́ А́нгеле Бо́жы, ахо́ўніку мой, малі́ Бо́га за мяне́.

Не дазво́ль разбо́йнікам забіць душу́ маю́ акая́нную ў час падаро́жжа, святы́ А́нгеле, бо яна́ Бо́гам была́ перада́дзена табе́ беззага́ннаю; наста́ў жа яе́ на шлях пакая́ння.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Усю́ асаро́мленую душу́ маю́ прыво́джу ад ліхі́х маіх ду́мак і спраў: паспяша́йся ж, наста́ўніку мой, і ацале́нне пада́й мне праз до́брыя ду́мкі, каб я заўжды́ схіля́ўся на пра́вільныя шляхі́.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амінь.

Прамýдрасцю напóўні і мóцаю Бажэ́ственнай, Іпастáсная Прамýдрасць Вы́шняга, дзéля Багарó-дзіцы, усіх, хто з вéраю ўскліка́е: айцóў на́шых Бóжа, благаславёны Ты.

Песня 8

Ірмос: Царá Нябéснага, Якóга апява́юць вóінствы Áнгелаў, апява́йце і высóка ўзнóсьце ва ўсе вякí.

Святы́ Áнгеле Бóжы, ахóўніку мой, малí Бóга за мянé.

Бóгам пасла́ны Найдабрэ́йшы Áнгеле, умацýй жыццё маё, рабá твайгó, і не пакíнь мянé давéку.

Святы́ Áнгеле Бóжы, ахóўніку мой, малí Бóга за мянé.

Цябé, дóбрага Áнгела, душы́ маёй настáўніка і ахóўніка, найблажэ́ннейшы, апява́ю навéкі.

Слáва Айцý, і Сы́ну, і Святóму Дýху.

Будзь мне пóкрывам і агарóджаю ў дзень выпрабава́ння ўсіх людзéй, калі агнём правяра́цца бýдуць спра́вы дóбрыя і ліхíя.

І цяпéр, і заўсёды, і на вéкі вякóў. Амінь.

Будзь памóчніцай і супакóем, Багарóдзіца Вечнадзéва, мне, рабý Тваймý, і не пакíнь мянé пазбáўленым быць Твайгó ўладáрання.

Песня 9

Ірмос: Справядлíва Багарóдзіцай мы вызнаéм Цябé, праз Цябé спасёныя, Дзéва Чы́стая, з харáмі бясплóтных сіл Цябé велічáючы.

Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, Бо́жа мой, памі́луй мяне́.

Памі́луй мяне́, адзі́ны Спасі́целю мой, бо Ты мі́ласцівы і мілас*э́*рны, і харо́ў пра́веднікаў зрабі́ мяне́ ўдзе́льнікам.

Святы́ А́нгеле Бо́жы, ахо́ўніку мой, малі́ Бо́га за мяне́.

Дай мне заўжды́ ду́маць і рабі́ць до́брае і кары́снае, Гаспо́дні А́нгеле, і ў не́мачы пакажы́ мяне́ мо́цным і беззага́нным.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Ма́ючы спадзява́нне на Цара́ Нябе́снага, малі́ Яго́ з і́ншымі бяспло́тнымі памі́лаваць мяне́, акая́ннага.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амінь.

Вялі́кае спадзява́нне ма́ючы, Дзе́ва, на Таго́, Хто ўцяле́сніўся ад Цябе́, збаў мяне́ ад кайдано́ў і вызвале́нне мне пада́й і спасе́нне праз малі́твы Тваё.

Малітва Ангелу ахоўніку

А́нгеле Хрысто́ў святы́, пе́рад табо́ю схіля́ючыся, малю́ся, ахо́ўніку мой святы́, да́дзены мне пры Святы́м Хрышчэ́нні на захава́нне душы́ і це́ла майго́ грэшнага; я ж сваёю ляно́таю і сваім злым нора́вам прагне́ваў тваю́ найчысце́йшую све́тласць і адагна́ў цябе́ ад сябе́ ўсі́мі гане́бнымі ўчы́нкамі: хлуснёю, паклёпам, за́йздрасцю, асуджэ́ннем, пага́рдаю, непако́рнасцю, братаненавісна́сцю і злапа́мятнасцю, срэбралю́бствам, пралюбадзе́йствам, раздра-

жне́ннем, ску́пасцю, ненасы́тным аб'ядзе́ннем і апі́ўствам, мнагаслó́ўем, ду́мкамі злы́мі і хі́трымі, го́рдым но́равам і блу́дным утрапе́ннем, ма́ючы самаво́льнае імкне́нне да ўся́кай пло́цкай асало́ды. О, злы́я маé жада́нні, які́х не ма́е на́ват неразу́мная скаці́на! Як жа ты змо́жаш гля́нуць на мяне́ або́ набліз́іцца да мяне́ — як да саба́кі смярдзю́чага? Яки́мі вачы́ма, А́нгеле Хрыстó́ў, ты бу́дзеш глядзе́ць на мяне́, мо́цна загра́злага ў бру́дных спра́вах? І як ужо я змагу́ прасіць прабачэ́ння го́ркіх і злых маіх, і хі́трых учы́нкаў, які́я раблю́ я ва ўсе дні і но́чы, і ко́жную гадзі́ну? Але́ малю́ся, схіля́ючыся пе́рад табо́ю, ахо́ўніку мой святы́, будзь міласэ́рным да мяне́, грэ́шнага і недасто́йнага раба́ твайго́ *(імя)*, будзь мне памо́чнікам і засту́пнікам ад зло́га майго́ працíўніка святы́мі тваімі малíтвамі, і Ца́рства Бо́жага ўдзе́льнікам мяне́ зрабí з усімі святы́мі за́ўжды, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амінь.

ПАСЛЕДАВАННЕ ДА СВЯТОГА ПРЫЧАШЧЭННЯ БАЖЭСТВЕННАЙ ТАЙНЫ ЦЕЛА І КРЫВІ ХРЫСТОВЫХ

Свяшчэннік пачынае так:

Благаславёны Бог наш заўжды́, цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вякóў. Амíнь.

А міранін пачынае так:

Па малíтвах святы́х айцóў на́шых, Го́споддзі Ісу́се Хрысце́, Бо́жа наш, памíлуй нас. Амíнь.

Сла́ва Табе́, Бо́жа наш, сла́ва Табе́.

Цару́ Нябе́сны, Уцяшы́целю, Ду́ху і́сціны, Ты ўсю́ды прысу́тны і ўсё напаўня́еш, Ска́рбніца дабра́ і жыцця́ Пада́целю, прыйдзí і ўсялíся ў нас, і ачы́сці нас ад уся́кае нечыстаты́ і спасí, До́бры, ду́шы на́шы.

Святы́ Бо́жа, Святы́ Мо́цны, Святы́ Несмяро́тны, памíлуй нас. *(Тройчы).*

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вякóў. Амíнь.

Прасвята́я Тро́іца, памі́луй нас; Го́спадзі, ачы́сці грахі́ на́шы; Уладару́, праба́ч беззако́нні на́шы; Святы́, наве́дай і ацалі́ не́мачы на́шы дзе́ля імя́ Твайго́.

Го́спадзі, памі́луй. *(Тройчы).*

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

О́йча наш, Які́ ёсць на нябёсах! Няха́й свяці́цца імя́ Тваё, няхай пры́йдзе Ца́рства Тваё, няха́й бу́дзе во́ля Твая́ як на не́бе, так і на зямлі́. Хлеб наш надзённы дай нам сёння; і дару́й нам даўгі́ на́шы, як і мы дару́ем даўжніка́м на́шым; і не ўвядзі́ нас у спаку́су, але збаў нас ад зло́га.

Свяшчэннік: Бо Тваё ёсць Ца́рства, і сі́ла, і сла́ва — Айца́, і Сы́на, і Свято́га Ду́ха — цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Го́спадзі, памі́луй. *(12 разоў).*

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Прыйдзі́це, паклано́мся Цару́ на́шаму — Бо́гу. *(Паклон).*

Прыйдзі́це, паклано́мся і прыпадзе́м да Хрыста́, Цара́ на́шага, Бо́га. *(Паклон).*

Прыйдзі́це, паклано́мся і прыпадзе́м да Само́га Хрыста́, Цара́ і Бо́га на́шага. *(Паклон).*

Псалом 22

Госпо́дзь — Па́стыр мой; я ні ў чым не бу́ду мець няста́чы: Ён па́свіць мяне́ на зялёных ні́вах, на ці́хія во́ды во́дзіць мяне́, падмацо́ўвае душу́ маю́, накіро́ўвае мяне́ на сце́жкі пра́ўды дзе́ля імя́ Свайго́. Калі́ я пайду́ на́ват дали́наю смяро́тнага це́ню, не збаю́ся зла, бо Ты са мно́ю; Тваё жазло́ і Твой по́сах — яны́ суцяша́юць мяне́. Ты прыгатава́ў для мяне́ трапе́зу на вача́х во́рагаў маі́х; нама́сціў але́ем галаву́ маю́; ча́ша мая́ перапо́ўнена. Так, до́брасць і ми́ласць *[Твая]* няха́й спадаро́жнічаюць мне ва ўсе дні жыцця́ майго́, і я бу́ду жыць у до́ме Госпо́днім мно́гія дні.

Псалом 23

Го́спаду але́жыць зямля́ і ўсё, што напаўня́е яе́, сусве́т і ўсе жыхары́ яго́, бо Ён заснава́ў яго́ на мо́рах і на рэ́ках усталява́ў яго́. Хто ўзы́дзе на гару́ Госпо́днюю, або́ хто ста́не на святы́м ме́сцы Яго́? Той, у каго́ ру́кі бязві́нныя і сэ́рца чы́стае, хто не кля́ўся душо́ю сваёю ма́рна і не бажы́ўся лжы́ва *[бліжняму свайму]*, — той атрыма́е благаслове́нне ад Го́спада і ми́ласць ад Бо́га, Спасі́целя свайго́. Такі́ род тых, якія шука́юць Яго, шука́юць абліччa Твайго́, Бо́жа Іа́кавaў! Падыміце, бра́мы, вярхі́ свае́, і падыміцеся, дзве́ры ве́чныя, і ўво́йдзе Цар сла́вы! Хто́ гэ́ты Цар сла́вы? — Госпо́дзь, мо́цны і ду́жы, Госпо́дзь, ду́жы ў бі́тве. Падыміце, бра́мы, вярхі́ свае́, і падыміцеся, дзве́ры ве́чныя, і ўво́йдзе Цар сла́вы! Хто гэ́ты Цар сла́вы? — Госпо́дзь сіл, Ён — Цар сла́вы.

Псалом 115

Я ве́раваў і таму́ каза́ў: я мо́цна прыгне́чаны. Я сказа́ў неабду́мана: уся́кі чалаве́к ілжы́вы. Чым я аддзя́кую Го́спаду за ўсе Яго́ дабрадзе́йствы мне? Ча́шу спасе́ння прыму́ і імя́ Гаспо́дняе прызаву́. Абяца́нні сваé Го́спаду я вы́канаю пе́рад усі́м наро́дам Яго́. Дарага́я ў вача́х Гаспо́дніх смерць святы́х Яго́! О, Го́спадзі! я раб Твой, я раб Твой і сын рабы́ Тваёй; Ты разарва́ў кайданы́ маé. Табе́ прынясу́ ахвя́ру хвалы́, і імя́ Гаспо́дняе прызаву́. Абяца́нні сваé Го́спаду я вы́канаю пе́рад усі́м наро́дам Яго́, у двара́х до́ма Гаспо́дняга, пасяро́д цябе́, Іерусалі́ме.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Алілуія, алілуія, алілуія, Сла́ва Табе́, Бо́жа. *(Тройчы, з паклонамі).*

Трапары, глас 8

На беззако́нні маé не зважа́й, Го́спадзі, Ты, што ад Дзе́вы нарадзі́ўся, і сэ́рца маё ачы́сці, тво́рачы яго хра́мам Прачы́стага Твайго́ Це́ла і Крыві́, і не адкі́нь мяне́ ад Твайго́ абліччa, ма́ючы бязме́жна вялі́кую мі́ласць.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Прычасці́цца Святы́нь Тваіх як адва́жуся я, недасто́йны? Калі́ асме́люся да Цябе́ прыступі́ць з да-

стóйнымі, то адзéнне вы́дасць мянé, бо янó не для Вячэ́ры, і я заслужу́ асуджэ́нне мнагагрэ́шнай душы́ маёй. Ачы́сці, Гóспадзі, ад бру́ду душу́ маю́ і спасí мянé, як Чалавекалю́бец.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вякóў. Амíнь.

Вялíкае мнóства сваíх саграшэ́ннямаючы, я звярта́юся да Цябе́, Багарóдзіца Чы́стая, шука́ючы спасе́ння: наве́дай хво́рую маю́ душу́ і малí Сы́на Твайго́ і Бо́га на́шага даць мне прабачэ́нне жахлí-вых маíх учы́нкаў, Адзíная Благаславе́нная.

А ў Святую і Вялíкую Чатырохдзесятніцу прамаўляй:

Калí сла́ўныя ву́чні пры ўмаве́нні на Вячэ́ры прасвятля́ліся, тады́ Іу́да пага́ны, срэбралю́бствам апанта́ны, азмро́чваўся, і беззако́нным су́ддзям ён Цябе́, пра́веднага Суддзю́, выдае́. Паглядзí, збіра́льнік бага́ццяў, на таго́, хто з-за іх паве́сіўся; пазбяга́й хцívасці, яка́я Наста́ўніку тако́е зрабíць асме́лілася. Да ўсіх до́бры Го́спадзі, сла́ва Табе́.

Псалом 50

Памíлуй мянé, Бо́жа, па вялíкай мíласці Тваёй і па мно́ству шчо́драсцяў Тваíх ачы́сці беззако́нні маé. Зусíм абмы́й мянé ад беззако́ння майго́ і ад граху́ майго́ ачы́сці мянé. Бо беззако́нне маё я зна́ю, і грэ́х мой пе́рада мно́ю заўжды́. Пе́рад Табо́й адзíным я саграшы́ў і зло́е пе́рад Табо́ю ўчынíў, так што Ты справядлíвы ў сло́вах Тваíх і беззага́нны ў судзе́

Тваім. Бо вось у беззако́ннях зача́ты я, і ў граха́х нарадзі́ла мяне́ ма́ці маю́. Бо вось і́сціну ўзлюбі́ў Ты, невядо́мае і та́йнае з прамудрасці Тваёй адкры́ў Ты мне. Акрапі́ш мяне́ исо́пам — і бу́ду чы́сты, абмы́еш мяне́ — і бу́ду за снег бялне́йшы. Дасі́ мне пачу́ць ра́дасць і вясяло́сць — і ўзра́дуюцца ко́сці пако́раныя. Адвярні́ аблі́чча Тваё ад граху́ў маіх і ўсе беззако́ні маé ачы́сці. Сэ́рца чы́стае ствары́ ўва мне, Бо́жа, і дух пра́ўды аднові́ ўнутры́ мяне́. Не адкі́нь мяне́ ад аблі́чча Твайго́ і Ду́ха Твайго́ Свято́га не адымі́ ад мяне́. Вярні́ мне ра́дасць спасе́ння Твайго́ і Ду́хам улада́рным умацу́й мяне́. Я навучу́ беззако́нных шляха́м Тваім, і грэ́шныя да Цябе́ зве́рнуцца. Ураты́й мяне́ ад крыві́[1], Бо́жа, Бо́жа спасе́ння майго́, і ўзра́дуецца язы́к мой пра́ўдзе Тваёй. Го́спадзі, ву́сны маé адкры́еш, і ву́сны маé абвясця́ць хвалу́ Тваю́. Бо калі́ б Ты захаце́ў ахвя́ры, то я даў бы, але ўсеспале́нне не мі́лае Табе́. Ахвя́ра Бо́гу — дух скру́шаны; сэ́рцам скру́шаным і пако́рлівым Бог не пагарджа́е. Ашчасліў, Го́спадзі, з ла́скі Тваé Сіён, і няха́й збуду́юцца сце́ны Іерусалі́ма. Тады́ мі́лай Табе́ бу́дзе ахвя́ра пра́ўды, прынашэ́нне і ўсеспале́нне; тады́ пакладу́ць на ахвя́рнік Твой цяльцо́ў.

---

[1] Гл.: Малітвы ранішнія. С. 10.

Канон

глас 2

Песня 1

Ірмос: Прыхо́дзьце, лю́дзі, заспява́ем пе́сню Хрысту́ Бо́гу, Які раздзялі́ў мо́ра і правёў наро́д, вы́звалены Ім з ра́бства егі́пецкага, бо Ён праслáвіўся.

Сэ́рца чы́стае ствары́ ўва мне́, Бо́жа, і дух пра́ўды аднаві́ ўнутры́ мяне́.

Хле́бам для жыцця́ ве́чнага і ацале́ннем ад усяля́кіх хваро́б няха́й бу́дуць мне Це́ла Тваё Свято́е, міласэ́рны Го́спадзі, і Пачэ́сная Кроў Твая́.

Не адкі́нь мяне́ ад аблі́чча Твайго́ і Ду́ха Твайго́ Свято́га не адымі́ ад мяне́.

Апага́нены спра́вамі непрысто́йнымі, я, няшча́сны, недасто́йны прычашчэ́ння Твайго́ Прачы́стага Це́ла і Бажэ́ственнай Крыві́, Хрысце́, але спадо́бі мяне́ яго́.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

(*Або:* **Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас**).

Багародзічны: Благаславе́нная Боганяве́ста, зямля́ ўрадлі́вая, што ўзрасці́ла для све́ту няўро́блены і спасі́цельны Ко́лас. Спадо́бі мяне́, спажыва́ючы Яго́, спасці́ся.

Песня 3

Ірмос: На ка́мені ве́ры ўмацава́ўшы мяне́, Ты адкры́ў ву́сны маé на во́рагаў маіх, бо ўзра́даваўся дух

мой, спява́ючы: нямá такóга святóга, як Бог наш, і нямá прáведнага, акрамя́ Цябé, Гóспадзі.

Сэ́рца чы́стае ствары́ ў́ва мне, Бо́жа, і дух пра́ў́ды адна́ві́ ў́нутры́ мяне́.

Дай мне, Хрысце́, кро́плі слёз для ачышчэ́ння ад бру́ду майго́ сэ́рца, каб, добрасумле́нна ачы́шчаны, я з ве́раю прыступі́ў і са стра́хам да прычашчэ́ння Бажэ́ственных, Уладару́, Даро́ў Тваіх.

Не адкі́нь мяне́ ад абліччá Твайго́ і Ду́ха Твайго́ Свято́га не адымі́ ад мяне́.

Няха́й бу́дуць мне, Чалавекалю́бец, Прачы́стае Це́ла Тваё і Бажэ́ственная Кроў для адпушчэ́ння саграшэ́нняў, для супо́льнасці са Свяцы́м Ду́хам, для жыцця́ ве́чнага, для вызвале́ння ад паку́т і бед.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

(*Або:* **Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас**).

Прасвята́я Трапе́за Хле́ба жыцця́, Які́ з не́ба па мі́ласці сышо́ў і све́ту но́вае жыццё дае́, спадо́бі цяпе́р і мяне́ недасто́йнага са стра́хам спажы́ць Яго́ і быць жывы́м.

Песня 4

Ірмос: Прыйшо́ў не пасла́ннік, не Ангел, а Сам Гаспо́дзь, Які́ ўцяле́сніўся ад Дзе́вы і спас усяго́ мяне́, чалаве́ка. Таму ўскліка́ю да Цябе́: сла́ва сі́ле Тваёй, Го́спадзі.

Сэ́рца чы́стае ствары́ ўва мне, Бо́жа, і дух пра́ўды адна́ві ў́нутры́ мяне́.

Дзе́ля нас уцяле́сніўшыся, Мнагамі́ласцівы, Ты пажада́ў быць зако́латым, як аве́чка, за грахі́ людскі́я, таму́ малю́ Цябе́: і маі́ ачы́сці саграшэ́нні.

Не адкі́нь мяне́ ад аблі́чча Твайго́ і Ду́ха Твайго́ Свято́га не адымі́ ад мяне́.

Ацалі́ ра́ны душы́ маёй, Го́спадзі, і ўсяго́ асвяці́, і спадо́бі, Уладару́, мяне́, няшча́снага, прычасці́цца Та́йнай Тваёй Бажэ́ственнай Вячэ́ры.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

(Або: **Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас***).*

Умі́ласцію́ і да мяне́, Улады́чыца, Наро́джана-га Табо́ю, і захава́й мяне́, раба́ Твайго́, чы́стым і беззага́нным, каб, прыма́ючы духо́ўны жэ́мчуг, я асвяці́ўся.

Песня 5

Ірмос: Святла́ Пада́целю і вяко́ў Тво́рца, Го́спадзі, у святле́ Тваі́х за́паведзяў наста́ў нас, бо апрача́ Цябе́ і́ншага бо́га мы не зна́ем.

Сэ́рца чы́стае ствары́ ўва мне, Бо́жа, і дух пра́ўды адна́ві ў́нутры́ мяне́.

Як сказа́ў Ты, Хрысце́, так няха́й і бу́дзе нікчэ́мнаму рабу́ Твайму́: будзь ува́ мне, як абяца́ў Ты, бо я ем Тваё Це́ла Бажэ́ственнае і п'ю Кроў Тваю́.

Не адкі́нь мяне́ ад аблі́чча Твайго́ і Ду́ха Твайго́ Свято́га не адымі́ ад мяне́.

Сло́ва Бо́жае і Бо́жа, жар Це́ла Твайго́ няха́й бу́дзе мне, азмро́чанаму, для прасвятле́ння і Кроў Твая́ — для ачышчэ́ння апага́ненай душы́ маёй.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

(Або: **Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас***).*

Мары́я, Ма́ці Бо́жая, духмя́насці свяшчэ́нная ся-лі́ба, Тваі́мі малі́твамі зрабі́ мяне́ вы́браным сасу́дам, каб мне прычасці́цца Святы́нь Сы́на Твайго́.

Песня 6

Ірмос: У бе́здані грахо́ў патана́ючы, я кліч не-спасці́жную бе́здань Тваёй міласэ́рнасці: ад пагі́бе-лі, Бо́жа, ураты́й мяне́.

Сэ́рца чы́стае ствары́ ў́ва мне, Бо́жа, і дух пра́ўды адна́ві ў́нутры́ мяне́.

Ро́зум, душу́ і сэ́рца, а таксама́ і це́ла маё асвяці́, Спасі́цель, і спадо́бі, Уладару́, прыступі́ць да стра́ш-ных Тайн неасу́джана[1].

Не адкі́нь мяне́ ад аблі́чча Твайго́ і Ду́ха Твайго́ Свято́га не адымі́ ад мяне́.

Няха́й аддалю́ся я ад страсце́й і атрыма́ю памна-жэ́нне Тваёй благада́ці і ў́мацава́нне жыцця́ праз прычашчэ́нне Святы́х Тваі́х Тайн, Хрысце́.

---

[1] Не наклікаючы на сябе асуджэння.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

(Або: **Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас***).*

Бо́жа, Свято́е Сло́ва Бо́жае, асвяці́ ўсяго́ мяне́, які́ прыступа́е цяпе́р да Бажэ́ственных Тваіх Тайн па малі́твах Свято́й Ма́ці Тваёй.

Кандак, глас 2

Не пазба́ў мяне́, Хрысце́, магчы́масці прыня́ць цяпе́р Хлеб — Це́ла Тваё і Бажэ́ственную Тваю́ Кроў; няха́й не бу́дзе мне, няшча́снаму, на асуджэ́нне прычашчэ́нне Прачы́стых і Стра́шных Тваіх Тайн, Уладару́, а няха́й бу́дзе мне на жыццё ве́чнае і бессмяро́тнае.

Песня 7

Ірмос: Залато́й ста́туі прамудрыя дзе́ці не паклані́ліся, а са́мі пайшлі́ ў аго́нь і баго́ў іхніх абсмія́лі; пасяро́д по́лымя яны́ спява́лі, і арасі́ў іх А́нгел. Пачу́та ўжо малі́тва ву́снаў ва́шых.

Сэ́рца чы́стае ствары́ ўва мне, Бо́жа, і дух пра́ўды аднові́ ўнутры́ мяне́.

Прычашчэ́нне Тваіх бессмяро́тных Тайн, Хрысце́, няха́й бу́дзе мне цяпе́р крыні́цаю добро́т: святла́, жыцця́, душэ́ўнага спако́ю, спо́сабам дасягне́ння вышэ́йшай Бажэ́ственнай дабрадзе́йнасці і прымнажэ́ння яе́, каб я праслаўля́ў Цябе́, адзі́ны До́бры.

Не адкі́нь мяне́ ад абліччa Твайго́ і Ду́ха Твайго́ Свято́га не адымі́ ад мяне́.

Няха́й вы́звалюся я ад страсце́й і ад во́рагаў, ад нягóд і ўся́кай бяды́, прыступа́ючы цяпе́р з трымце́ннем, любо́ўю і благагаве́ннем да Тваі́х, Чалавеколю́бец, бессмяро́тных і Бажэ́ственных Тайн; і спадо́бі спява́ць Табе́: благаслáвёны Ты, Го́спадзі, Бо́жа айцо́ў на́шых.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

(Або: **Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас***).*

Спасі́целя Хрыста́ Ты неспасці́жна ро́зуму нараджі́ла, ад Бо́га благада́ццю адо́раная; малю́ Цябе́ цяпе́р я, раб Твой, Чы́стую нячы́сты: мяне́, які́ ма́е цяпе́р прыступі́ць да Прачы́стых Тайн, ачы́сці ўсяго́ ад нечысты́ плóці і ду́ху.

Песня 8

Ірмос: Бо́га, Які́ сышо́ў у печ во́гненную да яўрэ́йскіх дзяце́й і по́лымя ператвары́ў у расу́, апява́йце, стварэ́нні, як Го́спада, і ўзно́сьце на ўсе вякі́.

Сэ́рца чы́стае стваpы́ ўва мне, Бо́жа, і дух пра́ўды аднаві́ ўнутры́ мяне́.

Нябе́сных і стра́шных і свяpты́х Тваі́х Тайн, Хрысце́, і Бажэ́ственнай Тваёй і Та́йнай Вячэ́ры цяпе́р удзе́льнікам быць і мяне́ спадо́бі, адча́йнага, Бо́жа, Спасі́целю мой.

Не адкі́нь мяне́ ад аблі́чча Твайго́ і Ду́ха Твайго́ Свято́га не адымі́ ад мяне́.

Звярну́ўшыся да Тваёй міласэ́рнасці, До́бры, я са стра́хам усклі́ка́ю да Цябе́: ува мне будзь, Спасі́целю, а я ў Табе́, як сказа́ў Ты, бо, вось, спадзеючы́ся на мі́ласць Тваю́, я ем Це́ла Тваё і п'ю Кроў Тваю́.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

(Або: **Прасвята́я Тро́іца, Бо́жа наш, сла́ва Табе́***).*

Я трымчу́, прыма́ючы аго́нь: як бы мне не згарэ́ць, як воск і як трава́. О, стра́шная та́йна! О, міласэ́рнасць Бо́жая! Як я, прах, прычашча́юся Бажэ́ственнага Це́ла і Крыві́ і станаўлю́ся нятле́нным?

Песня 9

Ірмос: Сын беспача́тнага Ба́цькі, Бог і Гаспо́дзь, уцяле́сніўшыся ад Дзе́вы, яві́ўся нам, каб прасвятлі́ць азмро́чаных і сабра́ць расе́яных. Таму́ ўсі́мі апява́емую Багаро́дзіцу мы велічаем.

Сэ́рца чы́стае ствары́ ў ва мне, Бо́жа, і дух пра́ўды аднові́ ў ну́тры́ мяне́.

Вось Хрысто́с, спажыва́йце і глядзі́це: Гаспо́дзь, ста́ўшы не́калі такі́м, як мы, і дзе́ля нас адно́йчы Сябе́ прынёсшы ў ахвя́ру Айцу́ Свайму́, пастаянна ко́лваецца, асвяча́ючы прыча́снікаў.

Не адкі́нь мяне́ ад аблі́чча Твайго́ і Ду́ха Твайго́ Свято́га не адымі́ ад мяне́.

Прычашчэ́ннем Свяшчэ́нных Тайн няха́й асвячу́ся я, Уладару́, душо́ю і це́лам, няха́й прасвятлю́ся, няха́й спасу́ся, няха́й ста́ну до́мам Тваі́м, ма́ючы Цябе́, Дабрадзе́ю Мнагамі́ласцівы, пасе́леным ува мне з Айцо́м і Ду́хам.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

(Або: **Вярні́ мне ра́дасць спасе́ння Твайго́ і Ду́хам ула-да́рным умацу́й мяне́***).*

Няха́й бу́дуць мне, Спасі́целю мой, Це́ла Тваё і Найпачэ́снейшая Кроў як аго́нь, што вынішча́е лес граху́ і спа́львае це́рні страсце́й, і як святло́, што ўсяго́ мяне́ прасвятля́е, каб я пакланя́ўся Бажаству́ Твайму́.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяку́ў. Амі́нь.

(Або: **Прасвята́я Багаро́дзіца, спасі́ нас***).*

Бог уцяле́сніўся ад чы́стай крыві́ Тваёй. Таму́ ко́жнае пакале́нне апява́е Цябе́, Улады́чыца, і мно́ства ду́хаў сла́вяць, бо праз Цябе́ яны́ я́сна ўба́чылі Таго́, Хто ўлада́рыць над усі́мі, у чалаве́чай прыро́дзе.

Дасто́йна ёсць сапраўды́ ўблажа́ць Цябе́, Багаро́дзіцу, заўжды́ блажэ́нную і найчысце́йшую і Ма́ці Бо́га на́шага. Пачэ́снейшую за Херувімаў і непараўна́льна слаўне́йшую за Серафі́маў, што непару́шаную нарадзі́ла Бо́га Сло́ва, І́сную Багаро́дзіцу, Цябе́ велічаем.

Святы́ Бо́жа, Святы́ Мо́цны, Святы́ Несмяро́тны, памі́луй нас. *(Тройчы).*

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Прасвята́я Тро́іца, памі́луй нас; Го́спадзі, ачы́сці грахі́ на́шы; Уладару́, праба́ч беззако́нні на́шы; Святы́, наве́дай і ацалі́ не́мачы на́шы дзе́ля імя́ Твайго́.

Го́спадзі, памі́луй. (*Тройчы*).

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

О́йча наш, Які́ ёсць на нябёсах! Няха́й свяці́цца імя́ Тваё, няха́й пры́йдзе Ца́рства Тваё, няха́й бу́дзе во́ля Твая́ як на не́бе, так і на зямлі́. Хлеб наш надзённы дай нам сёння; і дару́й нам даўгі́ на́шы, як і мы дару́ем даўжніка́м на́шым; і не ўвядзі́ нас у спаку́су, але збаў нас ад зло́га.

Свяшчэннік: Бо Тваё ёсць Ца́рства, і сі́ла, і сла́ва — Айца́, і Сы́на, і Свято́га Ду́ха — цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Трапар дня або свята

Калі нядзеля, то трапар нядзельны адпаведнага гласу. Калі не, то наступныя трапары, глас 6-ты:

Памі́луй нас, Го́спадзі, памі́луй нас; бо, ніякага апраўда́ння не знахо́дзячы, гэ́тую малі́тву Табе́ як Уладару́ мы, грэ́шныя, прыно́сім: памі́луй нас.

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху.

Го́спадзі, памі́луй нас, бо мы на Цябе́ спадзя-

е́мся[1]; не загне́вайся на нас ве́льмі і не ўспамінáй беззако́нняў на́шых, а паглядзí і цяпе́р, як міласэ́рны, і збаў нас ад во́рагаў на́шых; бо Ты Бог наш і мы лю́дзі Тваé, усе — стварэ́нне рук Тваíх і імя́ Тваё прызыва́ем.

І цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амíнь.

Міласэ́рнасці дзве́ры адчынí нам, благаславе́нная Багаро́дзіца, каб мы, ма́ючы надзе́ю на Цябе́, не загíнулі, а каб пазба́віліся праз Цябе́ ад бед, бо Ты — спасе́нне ро́ду хрысція́нскага.

Го́спадзі, памíлуй. (*40 разоў*).

І паклоны, колькі хочаш.

І вершы:

Калі хо́чаш, чалаве́к, е́сці Це́ла Уладара́,

Са стра́хам прыступí, каб не апячы́ся, бо гэ́та аго́нь.

Калі ж п'еш Бажэ́ственную Кроў, прычашча́ючыся,

Перш прыміры́ся з ты́мі, хто засмуцíў цябе́.

Пасля́ гэ́тага адва́жся Таéмную Е́жу е́сці.

Пе́рад прычашчэ́ннем стра́шнай ахвя́ры —

Жыватво́рнага Це́ла Уладара́ —

Такíм памаліся чы́нам з трымце́ннем:

---

[1] Царкоўнаславянскае "упова́хом" перакладаецца як "мы спадзяваліся", але дзеяслоў "πείθω", які стаіць тут у арыгінале ў форме перфекта "πέποιθα", мае значэнне цяперашняга часу (Вейсман А. Д. Греческо-русский словарь. СПб., 1899. С. 966).

Малітва святога Васілія Вялікага, 1-я

Уладару́, Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, Бо́жа наш, крыні́ца жыцця́ і бессмяро́тнасці, усяго́ ствары́ння ба́чнага і няба́чнага Твóрца, беспача́тнага Айца́ роўнаве́чны і такса́ма беспача́тны Сы́не, Ты па бязме́рнай до́брасці ў апо́шнія дні плоць успрыня́ў і быў распя́ты і пахава́ны за нас, няўдзя́чных і неразу́мных, і Сваёю Крывёю абнавíў знявéчаную грахóм прыро́ду нашу; Сам, Бессмяро́тны Цару́, прымí і ад мяне́, грэ́шнага, пакая́нне, і нахілí ву́ха Тваё да мяне́, і пачу́й сло́вы маé. Бо саграшы́ў я, Го́спадзі, саграшы́ў су́праць Не́ба і пе́рад Табо́ю, і недасто́йны я ўзвé́сці во́чы маé на вышыню́ сла́вы Тваёй; бо я ўгнявíў Тваю́ до́брасць, пару́шыўшы Твае́ за́паведзі і не паслу́хаўшы Тваíх нака́заў. Але Ты, Го́спадзі, незласлíвы, доўгацярплíвы і мнагамí-ласцівы, не даў мне загíнуць з беззако́ннямі маíмі, заўсёды чака́ючы майго́ навярта́ння. Бо Ты сказа́ў, Чалавекалю́бец, праз праро́ка Твайго́: Я не жада́ю сме́рці грэ́шніка, а жада́ю, каб ён навярну́ўся і быў жывы́. Не хо́чаш Ты, Уладару́, каб загíнула ствары́ннe рук Тваíх, і непрыхíльна ста́вішся да пагíбелі людзе́й, а жада́еш, каб усе́ спасліся і да пазна́ння íсціны прыйшлí. Таму́ і я, хоць і недасто́йны ні не́ба, ні зямлí, ні само́га гэ́тага мінýчага жыцця́, бо ўсяго́ сябе́ я пакары́ў граху́ і адда́ў у нявóлю пачуццёвым асало́дам і апага́ніў у сабе́ Твой во́браз, але, бу́дучы Тваíм ствары́ннем і вы́рабам, я, няшча́сны, не

адча́йваюся ў сваім спасе́нні і асме́льваюся прыступі́ць да Тваёй бязме́рнай міласэ́рнасці. Прымі́ ж і мяне́, Чалавекалю́бны Го́спадзі, як распу́сніцу, як разбо́йніка, як мы́тара і як блу́днага сы́на, і здымі́ з мяне́ цяжа́р граху́, бо Ты бярэ́ш на Сябе́ грэ́х све́ту і не́мачы людскі́я ацаля́еш, знясі́леных і прыгне́чаных да Сябе́ кліча́ш і заспако́йваеш, бо Ты прыйшо́ў заклі́каць да пакая́ння не пра́веднікаў, а грэ́шнікаў. І ачы́сці мяне́ ад уся́кай нечысты́ плоці і ду́ху і навучы́ мяне́ правадзіць свято́е жыццё ў стра́ху Тваім, каб я, прыма́ючы з чы́стым све́дчаннем сумле́ння свайго́ часці́нку Святы́нь Тваіх, злучы́ўся са Святы́м Це́лам Тваім і Крывёю і каб Ты жыў і прабыва́ў ува Мне з Айцо́м і Святы́м Тваім Ду́хам. Так, Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, Бо́жа мой, не на асуджэ́нне няха́й бу́дзе мне прычашчэ́нне Прачы́стых і Жыватво́рных Тайн Тваіх, і няха́й не зрабліўся я не́мачным душо́ю і це́лам ад недасто́йнага іх прычашчэ́ння, а дай мне да апо́шняга майго́ дыха́ння неасу́джана прыма́ць часці́нку Святы́нь Тваіх для супо́льнасці з Ду́хам Святы́м, для падтры́мкі ў жыцці́ ве́чным і для але́жнага адка́зу на Стра́шным Судзе́ Тваім, каб і я з усі́мі абра́ннікамі Тваімі стаў удзе́льнікам паўнаты́ Тваіх добро́т, прыгатава́ных Табо́ю тым, хто лю́біць Цябе́, Го́спадзі, у якіх Ты праслаўлены наве́кі. Амі́нь.

Малітва святога Іаана Залатавуста, 2-я

Го́спадзі Бо́жа мой, ве́даю, што недасто́йны я і нява́рты, каб Ты ўвайшо́ў пад дах до́ма душы́ маёй, бо ўвесь ён спусто́шаны і разва́лены, і не ма́еш Ты ўва мне прысто́йнага ме́сца, каб галаву́ прытулі́ць. Але́ як дзе́ля нас Ты прыні́зіў Сябе́, сышо́ўшы з вышыні́, так і цяпе́р зраўня́йся з маёй мізэ́рнасцю. І як Ты пажада́ў узле́гчы ў пячо́ры і ў я́слях для неразу́мных жывёл, так зрабі́ ла́ску ўвайсці́ ў я́слі неразу́мнае маі́ душы́ і ў апага́ненае маё це́ла. І як Ты не пагрэ́баваў увайсці́ і павячэ́раць з грэ́шнікамі ў до́ме Сі́мана пракажо́нага, так зрабі́ ла́ску ўвайсці́ і ў дом прыгне́чанай душы́ маёй, *чалаве́ка* пракажо́нага і грэ́шнага. І як Ты не адкі́нуў падо́бную на мяне́ распу́сніцу і грэ́шніцу, яка́я прыйшла́ і дакрану́лася да Цябе́, так змі́луйся і на́да мно́ю, грэ́шным, які́ прыхо́дзіць і дакрана́ецца да Цябе́. І як не пагрэ́баваў Ты пага́нымі яе́ і нячы́стымі ву́снамі, што цалава́лі Цябе́, так не пагрэ́буй і маі́мі ву́снамі, яшчэ́ больш пага́нымі і нячы́стымі, чым у яе́, і бры́дкім і нячы́стым ро́там маі́м, і грэ́шным і яшчэ́ больш нячы́стым языко́м маі́м. Але́ няха́й бу́дзе мне жар Прасвято́га Твайго́ Це́ла і Пачэ́снай Тваёй Кры́ві на асвячэ́нне і прасвятле́нне і здаро́ўе прыгне́чанай маёй душы́ і це́ла, на абляг-чэ́нне цяжа́ру мно́гіх маі́х саграшэ́нняў, на ахава́нне ад уся́кага дыя́вальскага ўздзе́яння, на выдале́нне і спыне́нне маі́х дрэ́нных і гане́бных звы́чак, на ўмярцве́нне страсце́й, на выкана́нне за́паведзяў

Тваíх, на прымнажэ́нне Бажэ́ственнай Тваёй благадáці і на здабыццё Цáрства Твайгó. Бо я прыхóджу да Цябé, Хрысцé Бóжа, не нядбáйна, а са спадзявáннем на невымóўную Тваю́ дóбрасць, і няхáй я, далёка аддáлены ад супóльнасці з Табóю, духóўным вóўкам злóўлены не бýду. Тамý малю́ся Табé: як Адзíны Святы́, асвяцí, Уладарý, маю́ душý і цéла, рóзум і сэ́рца, дýмкі і пачýццí[1], і ўсягó мянé абнавí, і ўкаранí страх Твой ва ўсíх чáстках цéла майгó, і асвячэ́нне Тваё непазбы́ўным зрабí ўва мне, і будзь мне памóчнікам і застýпнікам, накірóўваючы ў мíрнае рэ́чышча жыццё маё, каб спадóбіўся я стаць па прáвую рукý ад Цябé са святы́мі Тваíмі, па малíтвах і хадáйніцтвах Усепрачы́стай Тваёй Máці, бясплóтных Тваíх служы́целяў і прачы́стых сíл і ўсíх святы́х, якíя адвéку Табé дагадзíлі. Амíнь.

Малітва святога Сімяона Метафраста, 3-я

Адзíны чы́сты і цэ́льны Гóспадзі, Ты з невымóўнага жáлю і чалавекалю́бства ўспрыняў усю́ нáшу змéшаную прырóду ад чы́стай дзявóцкай крывí Той, Якáя надпрырóдна нарадзíла Цябé праз сашэ́сце Бажэ́ственнага Дýха і па вóлі Вéчнага Айцá. Хрысцé Ісýсе, Прамýдрасць Бóжая, мір і сíла! Ты ўспрыня́таю Табóю плóццю прыня́ў жыватвóрныя і спасíцельныя пакýты: крыж, цвікí, кап'ё, смерць; умярцвí маé

---

[1] Даслоўна ў грэчаскім арыгінале "τοὺσ νεφροὺς καὶ τὰ σπλάγχνα" — "ныркі і вантробы", але гэтыя словы маюць і пераносны сэнс, які тут, здаецца, больш да месца *(заўвага перакладчыка)*.

душа́згубныя стра́сці цялесныя. Пахава́ннем Сваім Ты спусто́шыў ца́рства пяке́льнае; пахава́й до́брымі разва́гамі маé злы́я заду́мы і злых ду́хаў паразганя́й. Жыва но́сным Сваім уваскрасе́ннем на трэ́ці дзень Ты ўзняў па́ўшага праайца́; узнімí і мяне́, што ўпаў у грэ́х, прапану́ючы мне шляхí пакая́ння. Сла́ўным Сваім узнясе́ннем Ты абагавíў успрыня́тую пло́ць і ўшанава́ў яе́, пасадзíўшы па пра́вую руку́ ад Айца; спадо́бі і мяне́ праз прычашчэ́нне Святы́х Тваíх Тайн стаць па пра́вы бок са спасёнымі. Сашэ́сцем Уцяшы́целя Ду́ха Ты зрабíў святы́х Сваíх ву́чняў пачэ́снымі сасу́дамі, учынí і мяне́ ёмішчам Яго́ прышэ́сця. Ты маéш зноў прыйсцí, каб судзíць свет пра́ведна, спадо́бі і мяне́ сустрэ́ць Цябе́ на аблоках, Суддзю́ і Ствары́целя майго́, з усíмі святы́мі Тваíмі, каб я бяскóнца славаслóвіў і апява́ў Цябе́ з Беспачáтным Тваím Айцóм і з Усесвяты́м, і До́брым, і Жыватво́рчым Тваím Ду́хам, цяпе́р і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амíнь.

Малітва яго ж, 4-я

Нíбы сто́ячы пе́рад Табо́ю на стра́шным і справядлíвым судзе́ Тваím, Хрысце́ Бо́жа, слу́хаючы абвінава́чанні і раска́зваючы пра зро́бленыя мно́ю злы́я ўчы́нкі, я сёння, паку́ль яшчэ́ не прыйшо́ў дзень суда́ нада мно́ю, каля́ свято́га Твайго́ ахвя́рніка сто́ячы пе́рад Табо́ю і пе́рад стра́шнымі і святы́мі Тваímі А́нгеламі, з абцяжа́раным сумле́ннем,

прыно́шу злы́я і беззако́нныя маé ўчы́нкі, аб'яўля́ю іх і выкрыва́ю. Паглядзí, Го́спадзі, на пако́ру маю́ і праба́ч усé грахí маé; паглядзí: беззако́нняў маíх ста́ла больш, чым валасо́ў на галавé маёй. Яко́га зла не ўчынíў я! Яко́га граху́ не зрабíў! Яко́га зла не заду́маў у душы́ маёй! Я і ва ўчы́нках праявíў распу́сту, пралюбадзе́йства, го́рдасць, пыхлívасць, дакара́нне, ганьбава́нне, пустаслó́ўе, непрысто́йны смех, п'я́нства, абжо́рства, аб'ядзе́нне, няна́вісць, за́йздрасць, срэбралю́бства, сква́пнасць, карыслівасць, самалю́бства, славалю́бства, крадзе́ж, ня-пра́ўду, атрыма́нне нячы́стых прыбы́ткаў, абурэ́нне, паклёп, беззако́нне. Ко́жнае маё пачу́цце, ко́жны о́рган я апага́ніў, разбэ́сціў, зрабíў нягóдным, бу́дучы заўжды́ прыла́даю дыя́вала. І ве́даю я, Го́спадзі, што беззако́нні маé перавы́сілі галаву́ маю́. Але бязме́рна вялíкая міласэ́рнасць Твая́, і невымо́ўная мíласць лагóднай до́брасці Тваёй, і нямá граху́, якí перамо́г бы чалавекалю́бства Тваё. Тамý, дзівóсны Цару́, лагóдны Го́спадзі, праявí і на мне, грэ́шным, дзíўныя мíласці Твае́, пакажы́ сíлу до́брасці Тваёй і явí моц спага́длівай міласэ́рнасці Тваёй і прымí мяне́, грэ́шнага, якí звярта́ецца да Цябе́. Прымí мяне́, як прыня́ў Ты блу́днага, разбо́йніка, распу́снíцу. Прымí мяне́, якí бязме́рна саграшы́ў пе́рад Табо́ю сло́вам і ўчы́нкамі, і непрысто́йнай пажа́длівасцю, і безразва́жнай ду́мкаю. І як прыня́ў Ты тых, што прыйшлí каля́ адзіна́ццатай гадзíны і не зрабíлі

нічо́га дасто́йнага, так прымі́ і мяне́, грэ́шнага, бо мно́га я саграшы́ў і апага́ніў сябе́, і засмуці́ў Ду́ха Твайго́ Свято́га, і зажуры́ў чалавекалю́бнае сэ́рца Тваё і ўчы́нкам, і сло́вам, і ду́мкаю, удзе́нь і ўначы́, я́ўна і та́йна, сваяво́льна і няво́льна. І ве́даю я, што Ты вы́ставіш грахі́ маé перада мно́ю такі́мі, які́мі яны́ зро́блены мно́ю, і запатрабу́еш адка́зу ў тым, у чым ро́зум мой не дасць апраўда́ння. Але́ не судзі́ мяне́, Го́спадзі, Го́спадзі, пра́ведным судо́м Тваім у лю́тасці Тваёй і не кара́й мяне́ ў гне́ве Тваім; памі́луй мяне́, Го́спадзі, не то́лькі таму́, што я не́мачны, але і таму́, што я — стварэ́нне Тваё. Ты, Го́спадзі, умацава́ў ува мне́ страх пе́рад Табо́ю, а я зло пе́рад Табо́ю ўчыні́ў. Пе́рад Табо́ю адзі́ным саграшы́ў я, але малю́ Цябе́: не пачына́й ця́жбы з рабо́м Тваім. Бо калі́ Ты, Го́спадзі, бу́дзеш заўважа́ць беззако́нні, то хто, Го́спадзі, устаіць? Я — бяздо́нне граху́, я недасто́йны і нява́рты ўзве́сці во́чы і паглядзе́ць на вышыню́ нябе́сную з-за мно́ства граго́ў маіх, які́м лі́ку нямá: бо ўся́кае злачы́нства, і кава́рства, і сатані́нская хі́трасць, і распу́ста, выцяка́нне, рукаблу́дства, нячы́стыя зно́сіны з дзе́цьмі, злапа́мятлівасць, пара́ды на грэ́х, казыта́нне і і́ншыя шматлі́кія стра́сці не паклі́нулі мяне́. Які́мі граха́мі я не разбэ́сціў сябе́! Які́мі ўчы́нкамі злы́мі не быў захо́плены! Уся́кі грэ́х я зрабі́ў, уся́кую нечыстату́ ўвабра́ў у душу́ маю́; нягóдным я стаў і пе́рад Табо́ю, Бо́гам маім, і пе́рад людзьмі́. Хто падыме́ мяне́, які́ ўпаў у такі́я злы́я і такі́я шмат-

лі́кія саграшэ́нні? Го́спадзі, Бо́жа мой! На Цябе́ спадзяю́ся я: калі ёсць мне надзе́я на спасе́нне, калі́ чалавекалю́бства Тваё перавыша́е мно́ства беззако́нняў маіх, то будзь маім Спасі́целем і па міласэ́рнасці Тваёй і мі́ласцях Тваіх аслаб, адпусці́, праба́ч мне ўсё, чым я саграшы́ў пе́рад Табо́ю; бо ўся́кім злом напо́ўнена душа́ мая́, і нямо́ ўва мне́ надзе́і на спасе́нне. Памі́луй мяне́, Бо́жа, па вялі́кай мі́ласці Тваёй і не кара́й мяне́ за спра́вы маé, і не асудзі́ мяне́ за ўчы́нкі маé, а засцераж ы́, абарані́, збаў душу́ маю́ ад зла, яко́е ўзраста́е ў ёй, і ад згу́бных ура́жанняў. Спасі́ мяне́ дзе́ля мі́ласці Тваёй; няха́й там, дзе памно́жыўся грэх, яшчэ́ бо́льшай будзе благада́ць Твая́, і я бу́ду хвалі́ць і праслаўля́ць Цябе́ заўжды́, ва ўсе дні жыцця́ майго́. Бо Ты Бог тых, што ка́юцца, і Спасі́цель тых, што граша́ць, і Табе́ мы сла́ву ўзно́сім з Беспача́тным Тваім Айцо́м і Прасвяты́м, і До́брым, і Жыватво́рчым Тваім Ду́хам, цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва святога Іаана Дамаскіна, 5-я

Уладару́ Го́спадзі, Ісу́се Хрысце́, Бо́жа наш, Ты адзі́ны ма́еш ула́ду дарава́ць лю́дзям грахі́. Як до́бры і Чалавекалю́бны праба́ч усе́ маé свядо́мыя і несвядо́мыя правіны і спадо́бі мяне́ неасу́джана[1] прычасці́цца Бажэ́ственных, сла́ўных, прачы́стых

[1] Не наклікаючы на сябе асуджэння.

і жыватво́рных Тваíх Тайн не на абцяжа́рванне[1], не на му́ку, не на памнажэ́нне грахо́ў, а на ачышчэ́нне, асвячэ́нне, у залóг бу́дучага жыцця́ і Ца́рства, на ахо́ву, дапамо́гу і на адагна́нне во́рагаў, на знішчэ́нне мно́гіх маíх саграшэ́нняў. Бо Ты — Бог мíласцівы, спага́длівы і чалавекалю́бны, і Табе́ мы сла́ву ўзно́сім з Айцо́м і Святы́м Ду́хам, цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амíнь.

Малітва святога Васíлія Вялíкага, 6-я

Ве́даю, Го́спадзі, што я недасто́йна прычашча́юся прачы́стага Твайго́ Це́ла і пачэ́снай Тваёй Крывí, вінава́ты я, і ў асуджэ́нне сабе́ ем і п'ю, не разважа́ючы пра Це́ла і Кроў Тваé, Хрыста́ і Бо́га майго́, але, спадзеючы́ся на мíласэ́рнасць Тваю́, прыхо́джу да Цябе́, бо Ты сказа́ў: хто есць Маю́ Плоць і п'е Маю́ Кроў, той ува Мне́ прабыва́е, і Я ў ім. Змíласціўся ж, Го́спадзі, і не выкрыва́й мяне́, грэ́шнага, а абыдзíся са мно́ю па мíласці Тваёй, і няха́й бу́дуць мне Святы́ні гэ́тыя на ацале́нне, і ачышчэ́нне, і прасвятле́нне, і ахава́нне, і спасе́нне, і на асвячэ́нне душы́ і це́ла; на адагна́нне ўся́кай мро́і, і гане́бнага ўчы́нку, і ўздзе́яння дыя́вальскага, яко́е праз ро́зум у чле́нах це́ла майго́ здзяйсня́ецца; на шчы́расць пе́рад Табо́ю і любо́ў да Цябе́; на выпраўле́нне жыцця́ і бяспе́ку, на ўзраста́нне ў дабрадзе́йнасці і даскана́ласці, на выкана́нне за́паведзяў, на супо́льнасць

[1] У грэчаскім арыгінале гэтага слова няма.

з Ду́хам Святы́м, на падтры́мку ў жыццí ве́чным, на адка́з нале́жны на Стра́шным Судзе́ Тваíм, а не на асуджэ́нне і пакара́нне.

Малітва святога Сімяона Новага, 7-я

Ад пага́ных ву́снаў, ад мярзо́тнага сэ́рца, ад нячы́стага языка́, ад душы́ апага́ненай прымí малíтву, Хрысце́ мой, і не адхілí ні слоў маíх, ні бессаро́мных учы́нкаў. Дай мне шчы́ра вы́казаць то́е, што я хачу́, Хрысце́ мой, а лепш навучы́ мяне́, што мне трэ́ба рабíць і каза́ць. Саграшы́ў я больш, чым распу́сніца, яка́я, даве́даўшыся, дзе Ты знахо́дзішся, і купíўшы мíра, адва́жылася падысцí пама́заць но́гі Тваé, Бо́га майго́, Уладара́ і Хрыста́ майго́[1]. Як не адкíнуў Ты яе́, што прыйшла́ ад *шчы́рага* сэ́рца, так не пагрэ́буй і мно́ю, Сло́ва, а дазво́ль мне Тваé но́гі і трыма́ць, і цалава́ць, і пато́камі слёз, нíбы шматкашто́ўным мíрам, адва́жыцца пама́заць іх. Абмы́й мяне́ слязьмí маíмі, ачы́сці мяне́ íмі, Сло́ва. Дару́й і правíны маé, і прабачэ́нне мне дай, Ты ве́даеш мно́ства злых *маíх* учы́нкаў, ве́даеш і ра́ны маé, ба́чыш і я́звы маé, але́ і ве́ру ве́даеш, і стара́ннасць ба́чыш, і сто́гны чу́еш. Не ўтаíцца ад Цябе́, Бо́жа мой, Тво́рца мой, Адкупíцелю мой, ані кро́пля слёз, ні на́ват часцíнка кро́плі той. Недако́нчанае мно́ю ба́чаць во́чы Тваé, а ў кнізе Тваёй запіса́на Табо́ю і то́е, што яшчэ́ не рабíлася. Паглядзí на пако́ру маю́, паглядзí, якí цяжа́р на

[1] У грэчаскім тэксце: “ногі Хрыста майго, Уладара і Бога майго”.

мне, і грахí ўсе дарýй мне, Бóжа ўсягó свéту, каб я з чы́стым сэ́рцам, трапятлíваю дýмкаю і скрýшанаю душóю прычасцíўся чы́стых Тваíх і Прасвяты́х Тайн, якíмі ажыўля́ецца і абагаўля́ецца кóжны, хто есць і п'е іх з чы́стым сэ́рцам. Бо Ты сказáў, Уладарý мой: кóжны, хто есць Маю Плоць і п'е Маю Кроў, той ува Мнé прабывáе, і Я ў ім. Праўдзíвае кóжнае слóва Уладарá і Бóга майгó, бо той, хто прычашчáецца Бажэ́ственных і Жыватвóрчых Дарóў, ужó не самóтны[1], а з Табóю, Хрысцé мой, Святлóм трохсóнечным, якóе асвя́тляе свет. Тамý, каб не застáцца мне самóтным, без Цябé, жыцця́ Падáцеля, дыхáння майгó, жыцця́ майгó, рáдасці маёй, спасéння свéту, я і прыступíў да Цябé, як Ты бáчыш, са слязьмí і душóю скрýшанаю; прашý даць мне прабачэ́нне маíх правíнаў і *спадóбіць* неасýджана прычасціцца Тваíх жыццядáйных і беззагáнных Тайн, каб Ты быў, як і казáў Ты, са мнóю, сáмым няшчáсным, і каб спакýснік, убáчыўшы мянé пазбáўленым Тваёй благадáці, не авалóдаў мнóю кавáрна і, збíўшы з дарóгі, не адвёў мянé ад багатвóрных Тваíх слоў. Таму я прыпадáю да Цябé і гóрача ўсклікáю Табé: як Ты прыняў блýднага і распýсніцу, што прыйшлá да Цябé, так прымí, Мíласцівы, і мянé, распýснага і блýднага, які з душóю скрýшанаю цяпéр прыхóдзіць да Цябé[2]. Вéдаю,

---

[1] Так у грэчаскім тэксце, а ў царкоўнаславянскім так: "бо прычашчаючыся Бажэственных і Жыватворчых Дароў, я ўжо не самотны".

[2] У большасці выданняў царкоўнаславянскі тэкст тут мае некаторыя разыходжанні. Мы пры перакладзе трымаліся грэчаскага арыгіналу, у перакладзе з якога царкоўнаславянскі тэкст выглядаў

Спасíцелю, што ніхтó так не саграшы́ў пе́рад Табóю, як я, і не зрабíў тагó, што я ўчынíў. Але ве́даю таксá-ма і тóе, што ні ця́жкасць правíн, ні мнóства грахóў не перавышáе вялíкага доўгацярпе́ння і надзвычáйна-га чалавекалю́бства Бóга майгó, а тых, што гóрача кáюцца, Ты алéем спагáды і ачышчáеш, і прасвят-ля́еш, і далучáеш да святлá, шчóдра даючы́ ім су-пóльнасць з Бажаствóм Тваíм, і на дзíва áнгелам і чалаве́чаму разуме́нню чáста з ímі размаўля́еш, як з сапрáўднымі сябрáмі Тваímі. Гэ́та даé мне адвá-гу, гэ́та акрыля́е мяне́, Хрысце́ мой. І, спадзеючы́ся на Твае́ шчóдрыя нам дабрадзе́йствы, я з рáдасцю і ў той жа час з трымце́ннем агóнь прымáю, бу́дучы травóю, і — дзíўны цуд — неспадзявáна пакрывá-юся расóю, як не́калі цярнóвы куст гарэ́ў і не згарáў. Тамý ўдзя́чнаю ду́мкаю, удзя́чным сэ́рцам, удзя́чны-мі часцíнкамі душы́ і це́ла майгó я пакланя́юся, велі-чáю і славаслóўлю Цябе́, Бóжа мой, як благаславё-нага цяпе́р і наве́кі.

бы так: “якоже блуднаго приял еси и блудницу пришедшую, тако приими мя, блуднаго и сквернаго, Щедре, душею сокрушенною ныне к Тебе приходяща. Вем, Спасе, яко иный…”.

З нашых царкоўнаславянскіх выданняў пераклад на белару-скую мову быў бы такі: “як Ты прыня́ў блуднага і распусніцу, што прыйшла да Цябе, так прымі, Міласцівы, і мяне, распуснага і блуд-нага. З душою скрушанаю цяпер да Цябе прыходзячы, я ведаю, Спасіцелю, што ніхто іншы…”.

Малітва святога Іаана Залатавуста, 8-я

Бо́жа, аслáб, адпусці́, прабáч мне саграшэ́ннi маé, якíмі я пе́рад Табо́ю саграшы́ў або́ сло́вам, або́ ўчы́нкам, або́ ду́мкаю, во́льна ці міжво́льна, свядо́ма ці несвядо́ма, усё мне прабáч, як До́бры і Чалавекалюбны, і па малíтвах Прачы́стай Тваёй Ма́цi, духо́ўных Тваíх служы́целяў і святы́х Сіл, і ўсіх святы́х, якíя адве́ку Табе́ дагадзíлі, паспрыя́й, каб я неасу́джана прыня́ў Свято́е і Прачы́стае Тваё Це́ла і Пачэ́сную Кроў для ацале́ння душы́ і це́ла і для ачышчэ́ння ад злых маíх ду́мак, бо Тваё ёсць Ца́рства, і сíла, і сла́ва — Айца́, і Сы́на, і Свято́га Ду́ха — цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амíнь.

Малітва яго ж, 9-я

Нява́рты я, Уладару́ Го́спадзі, каб Ты ўвайшо́ў пад дах душы́ маёй, але́ пако́лькі Ты, Чалавекалю́бец, хо́чаш жыць ува мне́, то я адва́жваюся прыступíць. Ты зага́дваеш, і я адчыню́ дзве́ры, якíя Ты адзін зрабíў, і ўво́йдзеш Ты чалавекалю́бна, як уласцíва Табе́, уво́йдзеш і прасвятлíш мой азмро́чаны ро́зум. Ве́рую, што зро́біш Ты гэ́та, бо Ты не адышо́ў ад распу́сніцы, яка́я са слязьмí прыйшла́ да Цябе́; і мы́тара, які́ пака́яўся, не адкíнуў; і разбо́йніка, які́ прызна́ў у Табе́ Цара́, не прагна́ў, і гані́целя, які́ пака́яўся, не пакíнуў такíм, як ён быў, а ўсіх, што прыйшлí да Цябе́ з пакая́ннем, Ты ўключы́ў у лік сяброў Сваíх, Адзíны Благаславе́нны заўжды́, цяпе́р і на бяскóнцыя вякí. Амíнь.

Малітва яго ж, 10-я

Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, Бо́жа мой! Асла́б, адпусці́, змі́луйся і праба́ч мне, грэ́шнаму, нягóднаму і недасто́йнаму рабу́ Твайму́, усе правіны, сагрэшэ́нні і грэхападзе́нні маé, якімі я сагрэшы́ў пе́рад Табо́ю з юна́цтва майго́ і да цяпе́рашняга дня і гадзі́ны: свядо́ма ці несвядо́ма, сло́вамі або́ ўчы́нкамі, наме́рамі, ду́мкамі і памкне́ннямі, і ўсі́мі маі́мі пачу́ццямі. І па малі́твах Той, Яка́я без се́мені нарадзі́ла Цябе́ — Прачы́стай Вечнадзе́вы Мары́і, Ма́ці Тваёй, адзі́най непахі́снай маёй надзе́і, ахо́вы і спасе́ння майго́, — спадо́бі мяне́ неасу́джана прычасці́цца прачы́стых, бессмяро́тных, жыватво́рчых і стра́шных Тваі́х Тайн для адпушчэ́ння грахо́ў і для жыцця́ ве́чнага, для асвячэ́ння і прасвятле́ння, для мо́цы, ацале́ння і здаро́ўя душы́ і це́ла, для згу́бы і по́ўнага вынішчэ́ння злых маі́х наме́раў, ду́мак і ўяўле́нняў, а такса́ма начны́х пры́відаў цёмных і злых ду́хаў. Бо Тваё ёсць Ца́рства, і сі́ла, і сла́ва, і паша́на, і пакланне́нне з Айцо́м і Святы́м Ду́хам цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва святога Іаана Дамаскіна, 11-я

Пе́рад дзвяры́ма хра́ма Твайго́ стаю́ я, а пага́ных ду́мак не пакіда́ю, але́ Ты, Хрысце́ Бо́жа, мы́тара апраўда́ў і хананея́нку памі́лаваў, і разбо́йніку адчыні́ў дзве́ры ра́ю, адчыні́ і мне чалавекалю́бнае сэ́рца Тваё і прымі́ мяне́, які́ прыхо́дзіць і дакрана́ецца

да Цябе́, як прыня́ў Ты распу́сніцу і кроватачы́вую, бо адна́, дакрану́ўшыся да кра́ю адзе́ння Твайго́, адра́зу атрыма́ла ацале́нне; друга́я, абня́ўшы Тваё прачы́стыя но́гі, пане́сла з сабо́ю прабачэ́нне грахо́ў. Я ж, няшча́сны, адва́жыўшыся ўсё Тваё Це́ла прыня́ць, няха́й не апяку́ся; а прымі́ мяне́, як прыня́ў Ты іх, і прасвятлі́ пачу́цці душы́ маёй, спа́льваючы маё грахо́ўныя правіны, па малі́твах Той, Яка́я без се́мені нарадзі́ла Цябе́, і нябе́сных Сіл, бо благаславёны Ты на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва святога Іаана Залатавуста

Ве́рую, Го́спадзі, і вызнаю́, што Ты сапраўды́ Хрыстос, Сын Бо́га Жыво́га, што Ты прыйшо́ў у свет грэ́шных спасці́, з якіх пе́ршы — я. Яшчэ́ ве́рую, што гэ́та — Само́ Прачы́стае Це́ла Тваё і гэ́та — Сама́ Пачэ́сная Кроў Твая́. Таму́ малю́ся Табе́: памі́луй мяне́ і праба́ч правіннасці маё, во́льныя і міжво́льныя, у сло́вах, у спра́вах, свядо́мыя і несвядо́мыя; і спадо́бі мяне́ неасу́джана прычасці́цца Прачы́стых Тваіх Тайн для адпушчэ́ння грахо́ў і для жыцця́ ве́чнага. Амі́нь.

Падыходзячы да Прычасця, прамаўляй у думках наступныя вершы святога Сімяона Метафраста:

Вось, я прыступа́ю да Бажэ́ственнага Прыча́сця.
Стварыцель! Не апячы́ мяне́ прычашчэ́ннем,
Бо Ты — аго́нь, які спа́львае недасто́йных.
Але ачы́сці мяне́ ад уся́кай нечыстаты́.

І затым:

Вячэ́ры Тваёй Та́йнай сёння, Сы́не Бо́жы, як удзе́льніка мяне́ прымі́, бо во́рагам Тваім я не вы́дам та́йны і не дам Табе́ пацалу́нка, як Іу́да, а, як разбо́йнік, вызнаю́ Цябе́: памяні́ мяне́, Го́спадзі, у Ца́рстве Тваім.

І вершы:

Бажэ́ственную Кроў ба́чачы, страшы́ся, чалаве́к!
Бо яна́ — аго́нь, які́ спа́львае недасто́йных.
Бо́жае Це́ла і абагаўля́е мяне́, і жы́віць:
Абагаўля́е дух, а ро́зум жы́віць дзі́ўна.

Потым трапары:

Ты прыва́біў мяне́ любо́ю, Хрысце́, і перамяні́ў мяне́ святы́м да Цябе́ імкне́ннем. Папалі́ ж агнём духо́ўным грахі́ маé і спадо́бі мяне́ спаўна́ атрыма́ць ад Цябе́ асало́ду, каб я ра́дасна праслаўля́ў, До́бры, два прышэ́сці Тваé.

У све́тлы збор святы́х Тваіх як увайду́ я, недасто́йны? Бо калі́ асме́люся я ўвайсці́ з імі ў хо́рам, то адзе́нне вы́дасць мяне́, бо яно́ не вясе́льнае, і я бу́ду звя́заны і вы́кінуты А́нгеламі. Ачы́сці, Го́спадзі, нечыстату́ душы́ маёй і спасі́ мяне́, як Чалавекалю́бец.

І малітву:

Уладару́ Чалавекалю́бны, Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, Бо́жа мой, няха́й не бу́дуць мне Святы́ні гэ́тыя ў асуджэ́нне за то́е, што я недасто́йны,

а бу́дуць няха́й на ачышчэ́нне і асвячэ́нне душы́ і це́ла і ў зало́г бу́дучага жыцця́ і Ца́рства, а для мяне́ дабро́ — злуча́цца з Бо́гам і ўсклада́ць на Го́спада надзе́ю на спасе́нне маё.

І зноў:

Вячэ́ры Тваёй Та́йнай сёння, Сы́не Бо́жы, як удзе́льніка мяне́ прымі́, бо во́рагам Тваім я не вы́дам та́йны і не дам Табе́ пацалу́нка, як Іу́да, а, як разбо́йнік, вызнаю́ Цябе́: памяні́ мяне́, Го́спадзі, у Ца́рстве Тваім.

МАЛІТВЫ ПАДЗЯКІ ПАСЛЯ СВЯТОГА ПРЫЧАШЧЭННЯ

Сла́ва Табе́, Бо́жа. Сла́ва Табе́, Бо́жа. Сла́ва Табе́, Бо́жа.

Малітва падзякі, 1-я

Дзя́кую Табе́, Го́спадзі Бо́жа мой, што Ты не адкі́нуў мяне́, грэ́шнага, а быць супо́льнікам Святы́нь Тваі́х спадо́біў мяне́. Дзя́кую Табе́, што мяне́, недасто́йнага, прычасці́цца Прачы́стых Тваі́х і Нябе́сных Даро́ў спадо́біў Ты. Але, Уладару́ Чалавекалю́бны, Які́ за нас памёр і ўваскрэ́с, і даў нам Стра́шныя гэ́тыя і Жыватво́рчыя Та́йны для до́брага ўздзе́яння і асвячэ́ння душ і цел на́шых, дай, каб яны́ былі́ і мне для ацале́ння душы́ і це́ла, для адгна́ння ўся́кага праці́ўніка, для прасвятле́ння вачэ́й сэ́рца майго́, для мі́ру душэ́ўных маі́х сіл, для ве́ры непахі́снай, для любо́ві некрывадушнай, для напаўне́ння прамудрасцю, для выкана́ння за́паведзяў Тваі́х, для памнажэ́ння Бажэ́ственнай Тваёй благада́ці і Твайго́ Ца́рства ўнасле́давання, каб у асвячэ́нні Тваім і́мі захава́ны, Тваю́ благада́ць я по́мніў заўжды́, і ўжо не

для сябе́ жыў, а для Цябе́, на́шага Уладара́ і Дабрадзе́я. І каб так адышо́ўшы з гэ́тага жыцця́ з надзе́яй на жыццё ве́чнае я дасягну́ў ве́чнага спако́ю, дзе святку́ючых го́лас несціха́ны і невымо́ўная асало́да сузіра́льнікаў невыка́знага хараства́ аблі́чча Твайго́. Бо Ты — сапра́ўдная мэ́та жада́ння і невымо́ўная ра́дасць для тых, хто лю́біць Цябе́, Хрысце́ Бо́жа наш, і Цябе́ апява́е ўсё стварэ́нне наве́кі.

Малітва святога Васілія Вялікага, 2-я

Уладару́ Хрысце́ Бо́жа, Цару́ вяко́ў і Ствары́целю ўсяго́! Дзя́кую Табе́ за ўсё до́брае, што Ты даў мне, і за прычашчэ́нне Прачы́стых і Жыватво́рчых Тваі́х Тайн. І малю́ Цябе́, До́бры і Чалавекалю́бны: заха-ва́й мяне́ пад по́крывам Тваі́м і ў за́сені кры́лаў Тваі́х; і дай мне з чы́стым сумле́ннем, да са́мага апо́шняга майго́ дыха́ння досто́йна прычашча́цца Свяцы́нь Тваі́х для адпушчэ́ння грахо́ў і для жыцця́ ве́чнага. Бо Ты — хлеб жыцця́, крыні́ца асвячэ́ння, пада́цель дабра́, і Табе́ мы сла́ву ўзно́сім з Айцо́м і Свяцы́м Ду́хам цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва святога Сімяона Метафраста, 3-я

Ты, Які́ дабравО́льна даў на пажы́так мне плоць Тваю́, бу́дучы агнём, што спа́львае недасто́йных, не спалі́ мяне́, Ствары́целю мой; а прайдзі́ ў чле́ны маё, ва ўсё́ суста́вы, ва ўну́транасці[1], у сэ́рца. Папа-

[1] Літаральна з грэчаскай: “у ныркі”.

лí цéрні ўсіх маíх саграшэ́нняў. Душу́ ачы́сці, асвяці́ ду́мкі. Умацу́й у калéнях нóгі маé[1]. Прасвятлí пяць звычáйных пачу́ццяў. Усягó мянé прыку́й да стрáху Твайгó. Заўжды́ абараня́й, ахóўвай і засцерагáй мянé ад усяля́кай справы і слóва душатлéннага. Ачы́сці, абмы́й, і ўпарáдкуй мянé, упрыгóж, навучы́ і прасвятлí мянé. Зрабí мянé пасéлішчам Твайгó Адзíнага Ду́ха, а ўжо не пасéлішчам граху́. Каб ад мянé, як ад Твайгó дóма, пасля́ прыня́цця Прычáсця ўцякáў, як ад агню́, уся́кі злóдзей, усяля́кая страсць. Як малíтвеннікаў за сябé я прывóджу Табé ўсіх святы́х, чынаначáллі бясплóтных, Прадцéчу Твайгó, прамýдрых апóсталаў, а яшчэ́ і Тваю́ Незагáнную Чы́стую Мáці. Іх мальбы́, прымí, міласэ́рны Хрысцé мой і сы́нам святлá зрабí Твайгó слугу́. Бо Ты, Дóбры, — адзíнае асвячэ́нне і святлó душ нáшых, і Табé налéжным чы́нам, як Бóгу і Уладару́, мы ўсé слáву ўзнóсім штодзéнь.

Малітва 4-я

Цéла Тваё Святóе, Гóспадзі Ісу́се Хрысцé Бóжа наш, няхáй бу́дзе мне для жыцця́ вéчнага, і Кроў Твая́ Пачэ́сная для адпушчэ́ння грахóў; няхáй бу́дзе мне Прычашчэ́нне гэ́тае на рáдасць, здарóўе і весялóсць; а ў час стрáшнага другóга прышэ́сця Твайгó спадóбі мянé, грэ́шнага, стаць правару́ч слáвы Твaёй, па малíтвах Прачы́стае Твае́ Máці і ўсіх святы́х.

---

[1] Літаральна з грэчаскай: “Падкаленныя чашкі ўмацуй з касцьмі разам” (г.зн., каб не падкошваліся ногі).

Малітва 5-я, да Прасвятой Багародзіцы

Прасвята́я Улады́чыца Багаро́дзіца, святло́ азмро́чанай маёй душы́, надзе́я, ахо́ва, прыту́лак, уце́ха, ра́дасць мая́! Дзя́кую Табе́, што Ты спадо́біла мяне́, недасто́йнага, прыча́снікам быць Прачы́стага Це́ла і Пачэ́снае Крыві́ Сы́на Твайго́. Ты, Яка́я нарадзі́ла Ісціннае Святло́, прасвятлі́ духо́ўныя во́чы майго́ сэ́рца; Ты, Яка́я Крыні́цу Несмяро́тнасці нарадзі́ла, ажыві́ мяне́, умярцвёнага граго́м; Ты, Мі́ласці-вага Бо́га Міласэ́рная Ма́ці, памі́луй мяне́ і дай мне замілава́нне, і скру́ху ў сэ́рцы маім, і пако́ру ў ду́мках маіх, і вярта́нне з пало́ну мро́яў маіх; і спадо́бі мяне́ да апо́шняга дыха́ння неасу́джана прыма́ць Святы́ню Прачы́стых Тайн для ацале́ння душы́ і це́ла. І дай мне слёзы пакая́ння і падзя́кі, каб я апява́ў і сла́віў Цябе́ ва ўсе дні жыцця́ майго́, бо Ты Благаславёная і Праслáўленая наве́кі. Амі́нь.

Цяпе́р адпуска́еш Ты раба́ Твайго́, Уладару́, паво́дле сло́ва Твайго́, з мі́рам, бо ўба́чылі во́чы маé спасе́нне Тваё, яко́е Ты прыгатава́ў пе́рад абліччам усіх наро́даў — святло́ для асве́ты язы́чнікаў і сла́ву наро́да Твайго́ Ізра́іля.

Святы́ Бо́жа, Святы́ Мо́цны, Святы́ Несмяро́тны, памі́луй нас. *(Тройчы).*

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Прасвята́я Тро́іца, памі́луй нас; Го́спадзі, ачы́сці грахі́ на́шы; Уладару́, праба́ч беззако́нні на́шы;

Святы́, наве́дай і ацалі́ не́мачы на́шы дзе́ля імя́ Твайго́.

Го́спадзі, памі́луй. *(Тройчы).*

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

О́йча наш, Які́ ёсць на нябёсах! Няха́й свяці́цца імя́ Тваё, няхай пры́йдзе Ца́рства Тваё, няха́й бу́дзе во́ля Твая́ як на не́бе, так і на зямлі́. Хлеб наш надзённы дай нам сёння; і дару́й нам даўгі́ на́шы, як і мы дару́ем даўжніка́м на́шым; і не ўвядзі́ нас у спако́ду, але збаў нас ад зло́га.

Свяшчэ́ннік: Бо Тваё ёсць Ца́рства, і сі́ла, і сла́ва — Айца́, і Сы́на, і Свято́га Ду́ха — цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Трапар святому Іаану Залатавусту, глас 8

Ву́снаў Тваі́х благада́ць, як святло́ агню́, заззя́ўшы, сусве́т асвятлі́ла; не срэ́бралю́бства скарб для све́ту набыла́ яна, а вышыню́ пакарамў́драсці нам паказа́ла, але́ Тваі́мі сло́вамі нас навуча́ючы, о́йча Іаа́не Залатаву́сце, малі́ Сло́ва Хрыста́ Бо́га, каб спасці́ся ду́шы на́шы.

Слава: Кандак, глас 6

З Нябёс прыня́ў ты Бажэ́ственную благада́ць, і сваі́мі ву́снамі ўсіх ву́чыш пакланя́цца ў Тро́іцы

Адзі́наму Бо́гу, Іаа́не Залатаву́сце ўсеблажэ́нны, прападо́бны, дасто́йна хва́лім цябе́, бо ты наста́ўнік, які́ бажэ́ственнае нам адкрыва́е.

І цяпер:

Абаро́на хрысціян надзе́йная, Хада́йніца да Твары́ца́ нязме́нная, не пагарджа́й малі́твамі грэ́шнікаў, а паспе́й, як До́брая, на дапамо́гу нам, што з ве́раю ўскліка́ем да Цябе́: паспяша́йся на засту́пніцтва і ху́тка прыйдзі́ на хада́йніцтва, абараняю́чы заўжды́, Багаро́дзіца, тых, хто шану́е Цябе́.

Альбо: Табе́, найвышэ́йшай Ваяво́дзе, у го́нар перамо́гі мы, зба́ўленыя ад бед рабы́ Тваё, Багаро́дзіца, падзя́ку ўзно́сім; Ты ж, ма́ючы моц непераможную, ад уся́кіх нас бед вызваля́й, каб мы ўскліка́лі да Цябе́: ра́дуйся, Няве́ста, Яка́я засталася́ Дзе́ваю.

Калі Літургія св. Васілія Вялікага:

Трапар святому Васілію Вялікаму, глас 1

Твой го́лас прагуча́ў па ўсёй зямлі́, дзе прыня́та было́ сло́ва тваё, праз яко́е бажэ́ственным і́сцінам дасто́йна навучы́ў ты, су́тнасць усяго́ растлума́чыў ты, чалаве́чыя зві́чаі пале́пшыў ты. Ца́рскае свяшчэ́нства, о́йча прападо́бны, малі́ Хрыста́ Бо́га за спасе́нне душ на́шых.

Слава: Кандак, глас 4

З‘явіўся ты непахі́снаю асно́ваю Царквы́, даючы́ ўсім лю́дзям невыкрада́льны скарб, запяча́таўшы

яго́ Тваім вучэ́ннем, сла́ўны да нябёс Васі́ліе пра-падо́бны.

І цяпер:

Абаро́на хрысці́ян надзе́йная...

Го́спадзі, памі́луй. *(12 разоў).*

Сла́ва Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, і цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Пачэ́снейшую за Херувімаў і непараўна́льна слаўне́йшую за Серафімаў, што непару́шанаю нарадзі́ла Бо́га Сло́ва, І́сную Багаро́дзіцу, Цябе́ велічаем.

І́менем Гаспо́днім благаславі́, о́йча.

Іерэ́й: Па малі́твах святы́х айцо́ў на́шых, Го́спадзі Ісу́се Хрысце́, Бо́жа наш, памі́луй нас.

Чытальнік: Амі́нь.

МАЛІТВЫ РОЗНЫЯ

Малітва падзякі святіцеля Амвросія Медыяланскага

Цябе́, Бо́га, хва́лім, Цябе́, Го́спада, вызнае́м, Цябе́, спрадве́чнага Айца́, уся́ зямля́ велічае́. Табе́ ўсе а́нгелы, Табе́ нябёсы і ўсе сі́лы, Табе́ Херувімы і Серафі́мы няспы́нна го́ласна ўскліка́юць: святы́, святы́, святы́, Гаспо́дзь Бог Савао́ф, напо́ўнены не́ба і зямля́ ве́ліччу сла́вы Тваёй.

Цябе́ найслаўне́йшы апо́стальскі сабо́р, Цябе́ хва́льнае мно́ства праро́каў, Цябе́ найсвятле́йшае во́інства му́чанікаў хва́ляць, Цябе́ па ўсі́м све́це вызнае́ свя́тая Царква́: Айца́ непрыступ́нага ве́ліч, пакланя́емага Твайго́ І́сціннага і Адзінаро́днага Сы́на і Свято́га Уцяшы́целя — Ду́ха.

Ты — Цар сла́вы, Хрысце́. Ты — Айца́ вечнаі́сны Сын. Ты дзе́ля збаўле́ння чалаве́ка не пагрэ́баваў дзяво́чым уло́ннем. Ты, адо́леўшы сме́рці джа́ла, адкры́ў ве́руючым Ца́рства Нябе́снае.

Ты правару́ч Бо́га сядзі́ш, у сла́ве Айца́, ве́руем, што як Суддзя́ Ты пры́йдзеш. Таму́ про́сім Цябе́: памажы́ рабам Тваі́м, яки́х Ты пачэ́снай Крывёю вы́купіў. Спадо́бі са святы́мі Тваі́мі ў ве́чнай сла́ве Тваёй

цараваць. Спасі людзей Тваіх, Госпадзі, і благаславі спадчыну Тваю, кіруй ёю і ўзвялічы навекі. Ва ўсе дні будзем благаслаўляць Цябе і ўсхваляць імя Тваё навек і ў век веку. Спадобі, Госпадзі, у гэты дзень без граху захавацца нам. Памілуй нас, Госпадзі, памілуй нас. Няхай будзе міласць Твая, Госпадзі, на нас, бо мы спадзяемся на Цябе. На Цябе, Госпадзі, спадзяемся, каб не быць нам пасарамленымі давеку. Амінь.

Малітва перад прыняццем ежы

Вочы ўсіх да Цябе, Госпадзі, звяртаюцца з надзеяй, і Ты даеш ім ежу своечасова, адкрываеш Ты шчодрую руку Сваю і насычаеш усё жывое спагадліва.

Малітва пасля прыняцця ежы

Дзякуем Табе, Хрысце Божа наш, што Ты насыціў нас зямнымі Тваімі дабротамі, не пазбаў нас і нябеснага Твайго Царства, але як Ты прыйшоў да вучняў Тваіх, Спасіцелю, мір даючы ім, так прыйдзі і да нас і спасі нас.

Малітва за тых, хто ў дарозе

Госпадзі, Ісусе Хрысце, Божа наш, ісцінны і жывы Шлях, Які пажадаў падарожнічаць у Егіпет з названым бацькам Тваім Іосіфам і Прачыстаю Дзевай, Маці Тваёю, і Які падарожнічаў у Эмаус з Лукою і Клеопам! І цяпер пакорна молім Цябе, Найсвяцейшы Уладару, спадарожнічай і гэтым рабам Тваім благадаццю Тваёю. І як рабу Твайму Тавію, пашлі Ангела, ахоўніка

і наста́ўніка, каб ён ахо́ўваў іх і пазбаўля́ў ад усяля́кай небяспе́кі, ад ба́чных і нябачных во́рагаў, каб настаўля́ў іх на выкана́нне за́паведзяў Тваіх, каб суправаджа́ў іх у мі́ры, ла́дзе і до́брым здаро́ўі і каб прывёў іх наза́д у цэ́ласці і спако́і. І дай ім уве́сь до́бры намер іх — дагадзі́ць Табе́ — паспяхова і ў сла́ву Тваю выканаць. Бо ў Тваёй ула́дзе мі́лаваць і спаса́ць нас, і мы ўзно́сім Табе́ сла́ву, з Беспача́тным Тваім Айцо́м і Прасвяты́м, і До́брым, і Жыватво́рчым Тваім Ду́хам, цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва за хворага

Улады́ка Уседзяржы́целю, Святы́ Цару́, Ты кара́еш, але́ не ўмярцвля́еш, падтры́мліваеш тых, хто па́дае, і тых, хто ўпаў, падыма́еш, цяле́сныя паку́ты чалаве́чыя ацаля́еш. Мо́лімся Табе́, Бо́жа наш, наве́дай Тваёю мі́ласцю раба́ Твайго́ *(імя)*, які́ паку́туе не́маччу, дару́й яму́ ўсяля́кае саграшэ́нне, во́льнае і міжво́льнае. Го́спадзі! Пашлі́ з нябёс ацаля́ючую сі́лу Тваю́, дакрані́ся да яго́ це́ла, пагасі́ ў ім гара́чку, спыні́ паку́ты і ацалі́ ўсяля́кую ў ім не́мач; будзь урачо́м раба́ Твайго́ *(імя)* і падымі́ яго́ з ло́жа хваро́бы, з ло́жа паку́ты цэ́лым і зусі́м здаро́вым; зрабі́ яго́ здо́льным дагаджа́ць Царкве́ Тваёй і выко́нваць во́лю Тваю́. Бо ў Тваёй ула́дзе мі́лаваць і спаса́ць нас, Бо́жа наш, і мы ўзно́сім Табе́ сла́ву — Айцу́, і Сы́ну, і Свято́му Ду́ху, цяпе́р, і заўсёды, і на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

Малітва да святога Ваніфація Міласцівага

Усесвяты́ Ваніфа́ціе, мі́ласцівы раб Міласэ́рнага Уладара́! Пачу́й тых, хто про́сіць цябе́, апанава́ных згу́бнай пра́гай алкаго́лю, і як у сваі́м зямны́м жыцці́ ты нікó́лі не адмаўля́ў у дапамо́зе тым, хто прасіў у цябе́, так і цяпе́р уратýй няшча́сных *(імёны)*. Не́калі, багаму́дры о́йча, град пабі́ў твой вінагра́днік, ты ж, узнёсшы падзя́ку Бо́гу, загада́ў нямно́гія з ацале́лых гро́нак пакласці ў тачы́ла і паклі́каць бе́дных. Затым, узя́ўшы маладо́е віно́, ты разлі́ў яго́ па кро́плі ва ўсе пасу́дзіны, які́я былі ў епіскапі́і, і Бог, Які выко́нвае малі́твы мі́ласцівых, стварыў вялі́кі цуд: віно́ ў тачы́ле памно́жылася, і бе́дныя напо́ўнілі пасу́дзіны сваé.

О, свяці́цель Бо́жы! Як па тваёй малі́тве памно́жылася віно́ для патрэ́б царквы́ і на карысць бе́дным і ўбо́гім, так ты, блажэ́нны, паме́ншы яго́ цяпе́р там, дзе яно́ прыно́сіць шко́ду, збаў ад неадо́льнай цягі́ тых, хто апанава́ны згу́бнай пра́гай да яго́ *(імёны)*, ацалі́ іх ад ця́жкай хваро́бы, вы́звалі ад дыя́вальскай спаку́сы, умацу́й іх, сла́бых, дай ім, нямо́глым, моц і сі́лу паспяхо́ва адо́лець гэ́тую спаку́су, вярні́ іх да здаро́вага і цвяро́зага жыцця́, накіру́й на шлях пра́цы, укладзі́ ў іх імкне́нне да цвяро́засці і духо́ўнай бадзёрасці. Памажы́ ім, уго́днік Бо́жы Ваніфа́ціе, калі́ пра́га віна́ бу́дзе пячы́ ім го́рла — зні́шчы іх згу́бнае жада́нне, асвяжы́ іх ву́сны нябе́снай прахало́даю, прасвятлі́ во́чы іх, паста́ў но́гі іх на ска-

лу́ ве́ры і надзе́і, каб, зба́віўшыся ад сваёй душэ́ўнай стра́сці, яка́я адлуча́е ад Ца́рства Нябе́снага, яны́ ўмацава́ліся ў набо́жнасці і ўдасто́іліся негане́бнага мі́рнага ско́ну і ў ве́чным святле́ бяскро́нцага Ца́рства Сла́вы го́дна праслаўля́лі Го́спада на́шага Ісу́са Хрыста́ з Беспача́тным Яго́ Айцо́м і з Прасвяты́м, і Жыватво́рчым Ду́хам на ве́кі вяко́ў. Амі́нь.

ЗМЕСТ

Пра малітву 3

Малітвы ранішнія 6

Малітвы вячэрнія 26

Пасхальныя гадзіны 46

Пасхальны канон 49

Пра падрыхтоўку да Прычашчэння
Святых Тайн Хрыстовых 60

Канон пакаянны
да Госпада нашага Ісуса Хрыста 66

Канон малебны да Прасвятой Багародзіцы 76

Канон Ангелу ахоўніку 89

Паследаванне да Святога Прычашчэння
Бажэственнай Тайны Цела і Крыві Хрыстовых 98

Малітвы падзякі пасля Святога Прычашчэння 131

Малітвы розныя 138

П68 **Праваслаўны малітваслоў** / уклад. протаіерэй Сергій Гардун., прадм. і пер. з царкоўнаслав. і грэч. протаіерэя Сергія Гардуна. 2-е выд., дап. — Мінск. Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора, 2012. — 144 с.

ISBN 978-985-6594-45-1

«Праваслаўны малітваслоў» мае раздзелы: Малітвы ранішнія, Малітвы вячэрнія, Паследаванне да Святога Прычашчэння, Малітвы падзякі, Малітвы розныя. 2-е выданне Малітваслова (1-е выйшла ў 2004 г.) дапоўнена трыма канонамі, неабходнымі пры падрыхтоўцы да прычашчэння, а таксама Пасхальным канонам. Пераклад з царкоўнаславянскай і грэчаскай моў на беларускую ажыццявіў кандыдат багаслоўя, прафесар Мінскіх духоўных школ протаіерэй Сергій Гардун.

УДК 271.22-534.3
ББК 86.372

Духоўна-асветніцкае выданне

ПРАВАСЛАЎНЫ МАЛІТВАСЛОЎ

Выданне 2-е, дапоўненае

Камп'ютарная вёрстка
Андрэй Дземчанка

Мастацкае афармленне
Антаніна Лапіцкая
Валерый Сенчанка

Падпісана ў друк 18.09.2012. Фармат 60×90 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 4,5. Ул.-выд. арк. 3,8.
Тыраж 1 000. Заказ № 725.2012.
«Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора ў г. Мінску»,
ЛВ № 02330/0494451 ад 08.04.2009.
Вул. Ракаўская, 4, 220004, г. Мінск.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка
ў друкарні «ORTHDRUK»
PL 15-399 Białystok, ul. Składowa, 9